

Яшчэ летась «Звязда» прапанавала прагноз экспертаў, якія лічылі, што да лістапада на другасным рынку жылля сталіцы цэны будуць трымацца на мінімальным узроўні. Прагноз спраўдзіўся толькі часткова... СТАР. 2



Сёння ў Іспаніі стартуе 23 чэмпіянат свету па гандболе сярод мужчын. Другі раз у гісторыі (і ўпершыню за апошнія 18 гадоў) на першынстве свету выступіць і зборная Беларусі. СТАР. 6



Не прайшло і месяца з дня роспуску старога саставу «ВІА Гры», як быў абвешчаны набор у новы гурт. Нядаўна прайшлі кастынгі ў Кіеве, Маскве і Алматы. Дадатковы беларускі кастынг пройдзе ў Мінску. СТАР. 8



Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

12 СТУДЗЕНЯ 2013 г. СУБОТА № 6 (27371) Кошт 1300 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА


# НЕ КОЛЬКАСЦЮ, А ЎМЕННЕМ

**Учора Прэзідэнт Беларусі правёў нараду па пытаннях аптымізацыі структуры, колькасці і функцый дзяржаўных органаў, перадае карэспандэнт БелТА.**

Аляксандр Лукашэнка лічыць, што ў краіне неабходна сфарміраваць кампактную і эфектыўную кіраўніцкую структуру, не раздуваючы бюракратычны апарат.

«Перш за ўсё нам трэба скараціць колькасць апарату і ўпарадкаваць яго функцыі. Гэта значыць адсекчы ўсё лішняе, што плодзіць бюракратыю і перашкаджае дынамічнаму развіццю краіны, — сказаў кіраўнік дзяржавы. — Тут мы павінны кіравацца сувораўскім прынцыпам: не колькасцю, а ўменнем дабівацца вынікаў».

Паводле меркавання Прэзідэнта, пастаяннае ўдасканаленне кіраўніцкай сістэмы і яе механізмаў з'яўляецца адной з галоўных тэндэнцый у развіцці сучаснай дзяржавы. На яго думку, рэформа дзяржаўнага апарату — гэта неабходная ўмова павышэння эфектыўнасці дзяржаўнай улады.

Прэзідэнт адзначыў, што вопыт у рэфармаванні ў Беларусі ўжо ёсць: «Пачынаючы са стварэння стройнай вертыкалі ўлады пасля першых прэзідэнцкіх выбараў. У многім дзякуючы менавіта гэтаму мы змаглі пераадолець тагачасны сістэмны крызіс, які ахапіў усю постсавецкую прастору, і не дапусцілі хаосу і абвалу краіны. І ў далейшым органы ўлады і кіравання паспяхова вырашалі складаныя задачы ўздыму эканомікі, станаўлення дзяржаўнасці і кансалідацыі грамадства».

У той жа час Прэзідэнт прызнаў, што апошнія гады кіраўніцкія структуры крыху разрасліся. Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што ім неабходна паляпшаць дынаміку і якасць сваёй дзейнасці, у поўнай меры ўлічваць змяненні ў жыцці краіны і сучасныя патрабаванні гаспадарання.

«Крытэрый вызначаны: павінна быць эфектыўнасць, павінна быць аптымальная колькасць», — заявіў кіраўнік дзяржавы.

Пры гэтым Прэзідэнт лічыць, што ніякіх ільгот, прывілеяў і выплат скарачаемым дзяржаўным служачым не будзе. «Якія яшчэ могуць быць дадатковыя выплаты, дзе вы возьмеце гэтыя грошы для выплат? Размахнуліся! — падкрэсліў Прэзідэнт. — Мне тут камісія ўносіць шэраг ільгот, прывілеяў і выплат. Дык вось я хачу сказаць, што ніякіх ільгот, прывілеяў і выплат скарачаемым не будзе».

«Скажыце, якія могуць быць гарантыі, ільготы, выплаты людзям, якія сёння скарачаюцца і не могуць працаваць па сваім стане ў дзяржаўным апараце?» — дадаў Прэзідэнт. «Па-другое, ёсць людзі, якія сябе не бачаць у дзяржаўным апараце. Ён лепш будзе працаваць у школе, у іншай арганізацыі, на вытворчасці. Дык яго туды і трэба накіраваць працаваць», — лічыць кіраўнік дзяржавы. Прэзідэнт адзначыў, што работнікі, якія скарачаюцца, не будуць звольнены ў момант на вуліцу, а на працягу прыкладна паўгода змогуць знайсці сабе новую работу. «Мы нікога не хочам пакрыўдзіць. Гэта не значыць, што калі заўтра будзе прынята рашэнне, то за суткі мы павінны павыкідваць людзей на вуліцу. Ды не! Давайце, дапусцім, на працягу паўгода спакойна ўладкуем гэтых людзей на работу», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

«Мы вызваляемся і павінны вызваліцца ад тых, хто не стараецца. Хто стараецца і добра працуе, той павінен застацца ў дзяржаўным апараце. Той, хто верай і праўдай служыць дзяржаве і народу, павінен працаваць у дзяржаўным апараце. І там павінны працаваць толькі такія людзі», — падкрэсліў Прэзідэнт. «Адтуль павінны пайсці людзі, якія не хочуць працаваць, дрэнна працуюць, якія проста не туды трапілі», — дадаў кіраўнік дзяржавы.

«Вось у чым сутнасць гэтага скарачэння, а не тое, што росчыркам пяра павыкідваць людзей на вуліцу, паламаўшы ім лёсы», — адзначыў Прэзідэнт. Ён таксама дадаў, што такім рашэннем не павінны настроіць супраць сябе значную частку грамадства. «Ні ў якім выпадку гэтага нельга рабіць», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

У той жа час Аляксандр Лукашэнка лічыць недапушчальна нізкай зарплату беларускіх дзяржслужачых. «У нас некаторыя кіраўнікі прадпрыемстваў, якія сядзяць на датацыях, або кіраўнікі, якія наогул лыка не вяжуць, як у народзе кажуць, атрымліваюць каля 20 млн зарплату, яшчэ і прэмію сабе налічваюць! А дзяржаўны служачы і паловы таго не мае, той, які працуе. Таму недапушчальна нізкая зарплата», — сказаў кіраўнік дзяржавы. Пры гэтым ён падкрэсліў, што павысіць зарплату дзяржслужачых можна, толькі аптымізаваўшы іх колькасць. «У адваротным выпадку ў мяне рука не паднімецца падпісваць дакументы аб павышэнні зарплаты дзяржслужачых, якіх у нас дзясяткі тысяч», — сказаў Прэзідэнт.

СТАР. 2



ПРАКАВЕТНАЕ



## КУЗЬМІЧЫ «КАНЯ» ВАДЗІЛІ...

Заўтра наступае Стары Новы год, і менавіта на яго надыход прыпадае традыцыя калядавання, якую ў народзе здаўна называюць «Шчодры вечар», «Шчадрэц», «Шчодрык». З моманту з'яўлення на небе першай зоркі пераапранутыя і размаляваныя калядніки пачынаюць спяваць пад вокнамі песні-калядзінкі, просяцца ў хаты, каб пажадаць гаспадарам здароўя і дабрабыту. Там, дзе традыцыя не перарывалася, заўсёды з радасцю і надзеяй чакаюць гэты зімовы карнавал, жадаюць пачуць песні вясёлых шчадроўнікаў.

Па вёсцы Кузьмічы Любанскага раёна, у якой калядная традыцыя даўняя і моцная, у гэтую ноч шчадруе не менш за дзесяць гуртоў, што зусім не выпадкова: працягласць адной толькі Цэнтральнай вуліцы гэтага населенага пункта — амаль сем кіламетраў, і аднаму гурту яе не адолець. А каляднікаў чакаюць амаль у кожным доме. Па-традыцыі калядоўшчыкі водзяць не толькі казу — сімвал пладародздзя, але і «вучонага» мядзведзя, і спрадвечнага сялянскага памочніка — каня (на фотаздымку).

**Анатоль КЛЯШЧУК. Фота аўтара.**

ЦЫТАТА ДНЯ



**Леанід МАЖЭЙКА, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па прамысловасці, паліўна-энергетычным комплексе, транспарце і сувязі:**

*«Думаю, наспела неабходнасць ва ўзмацненні жорсткасці пакарання для вадзіцеляў, якія садзяцца за руль у нецвярозым стане. Мы ўжо прайшлі шлях пазбаўлення правоў і накладання штрафаў, але станоўчага эфекту не відаць. Патрэбны больш жорсткія меры — такія, як канфіскацыя аўтамабіля. Акрамя таго, важна, каб была дакладная сістэма ацэнкі цвярозасці вадзіцеля. Да абмеркавання законапраекта неабходна падключыць шырокую грамадскасць, экспертаў аўтатранспартнай галіны. Гэта дазволіць улічыць усе нюансы. Трэба, каб ініцыятыва зыходзіла ад людзей, тады яны гэты закон прымуць, і ён пойдзе, што называецца, «на ўра».*

НАДВОР'Е СЁННЯ

| | |
|---|---|
| Брэст | – 1° |
| Віцебск | – 5° |
| Гомель | – 5° |
| Гродна | – 2° |
| Магілёў | – 4° |
| Мінск | – 4° |

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 12.01.2013 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 8660,00 | ■ |
| Еўра | 11490,00 | ▲ |
| Рас. руб. | 286,00 | ▲ |
| Укр. грыўня | 1066,17 | ▼ |

## У ПАНЯДЗЕЛАК ЧАКАЮЦЦА МАРАЗЫ ДА – 20

Цыклон, які прынёс снегапады гэтымі днямі ў нашу краіну, будзе гаспадарыць у нас і ў выхадныя, паведаміла рэдакцыі спецыяліст Рэспубліканскага гідраметцэнтра Мінпрыроды Вольга Фядотава.

Таму ў суботу на большай частцы Беларусі будзе ісці снег.Будзе ісці кароткачасовы снег і ў нядзелю. На асобных участках дарог у выхадныя галалёдзіца. Тэмпература паветра ў суботу будзе вагацца ад мінус 2 градусаў на поўдні, да 10 марозу на поўначы краіны. Уначы на нядзелю пачне падмарожваць да мінус 5—12 градусаў, а пры праясненнях — і да 15 градусаў ніжэй за нуль. Удзень — мінус 3—10 градусаў.

У панядзелак атмасферны ціск пачне павялічвацца, таму невялікія ападкі чакаюцца толькі ў асобных раёнах. На дарогах слізка. У ноч на панядзелак чакаецца мінус 8—15, пры праясненнях да 15—20 марозу. Удзень — 5—12 градусаў ніжэй за нуль.

**Сяргей КУРКАЧ.**

■ Сустрэча без абцасаў



Фота Надзеі БУЖАН.

# «ТРЭБА ЖЫЦЬ, А НЕ ДАЖЫВАЦЬ»

**Анкалагічны хоспіс для дарослых — першая (не толькі ў Мінску, але і ва ўсёй рэспубліцы) установа, дзе робяць усё магчымае, каб невылечна хворыя пражылі апошнія дні, тыдні, месяцы якасна. Без пакут, болю і дэпрэсіі. Працаваць у хоспісе, пастаянна сутыкаючыся са смерцю, і заставацца пры гэтым непапраўным аптымістам — не кожнаму пад сілу... Але толькі не галоўнаму ўрачу дзяржаўнай установы «Бальніца паліятыўнага догляду «Хоспіс» Вользе Віктараўне МЫЧКО, якая больш як сем гадоў таму не па-жаноцку напорыста ўзялася за развіццё паліятыўнай медыцыны ў нашай краіне. Сваю ролю ў тым, што мая гераіня, не раздумваючы, сышла з галавой у паліятыў, адыграла і асабістае гора...**

### Пра хранічнае захворванне, пломбы і чалавека-аркестра

**У мяне рана захварэла маці.** У 28 гадоў яна ўжо мела цяжкае хранічнае захворванне. Дзяцінства праходзіла ў наведваннях бальніц. Тата прыходзіў з працы, смажыў катлеты, рабіў бульбяное пюрэ, усё гэта накладаў у слоікі, браў мяне з Марынкай (старэйшай сястры), і мы ехалі да мамы ў бальніцу. Калі хварэе родны чалавек, гэта цяжка. Таму мне хацелася хутчэй вырасці і дапамагчы.

**У дзяцінстве** я марыла стаць урачом, урачом, і толькі ўрачом. Не разумела, як можна хацець быць кімсьці іншым: гэта ж несур'ёзна *(усміхаецца)*. У дзіцячым садку лячыла лялек. Чамусьці ў асноўным была стаматолагам. Мне вельмі падабалася пламбіраваць дзіркі. Сама выкалупвала іх, а затым з зубнога парашку і ваты рабіла пломбы. Сабакам бінтавала хвасты, лапы. А пасля школы паступіла ў Мінскі медінстытут на лячэбны факультэт.

**Ніколі не імкнулася** стаць галоўным урачом. Мне заўсёды падабалася працаваць з людзьмі. Проста я перфекцыяніст па натуры, прызвычаілася ўсё рабіць сумленна. Вось мяне і заўважылі. А прага да вучобы, пазнання новага ў мяне ў крыві. Таму і пайшла атрымліваць другую адукацыю (скончыла Акадэмію кіравання пры Прэзідэнце па спецыяльнасці «Эканаміст-менеджар»). І не шкадую. Сучасны кіраўнік — гэта чалавек-аркестр. Ён, акрамя спецыяльных ведаў, павінен разбірацца і ў пытаннях эканомікі, кіравання — сёння без гэтага немагчыма. Калі хочаш заставацца ў форме, трэба ўвесь час працаваць над сабой.

**Не ў маім характары** аказваць людзям паслугі за грошы. Работа з пацыентамі на ўзроўні партнёрства прыносіць значна больш маральнага задавальнення. Гэта адна з прычын, чаму я ў свой час прамяняла камерцыйную медыцыну на бюджэтную.

### Пра галоўнае, другаснае і анёлаў

**У хоспіс мяне прывяла** прага развіваць усё новае, будаваць караблі і запускаць іх. Істотную ролю ў тым, што я, не раздумваючы, сышла з галавой у паліятыў, адыграла і асабістае гора. Калі тата захварэў на рак і месяцы яго былі злічаны, я — урач, з жыццёвым і прафесійным багажом ведаў, — не ведала, што рабіць, як зняць боль, дэпрэсію, чым дапамагчы. Пра паліятыў у Беларусі тады і думаць не думалі. Усё трэба было пачынаць з нуля.

СТАР. 3

## ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

### НОВАЯ КУПЮРА Ў 5 ЕЎРА ПАСТУПІЦЬ У АБАРАЧЭННЕ Ў МАІ 2013




Кіраўнік Еўрапейскага цэнтрабанка Марыа Драгі прадставіў узор новай купюры вартасцю 5 еўра з палепшанай абаронай ад падробак. Прэзентацыя адбылася ў Археалагічным музеі ў Франкфурце-на-Майне. Купюра паступіць у абарачэнне ў маі 2013 года. Новая купюра ў 5 еўра адкрывае другую, удасканаленую серыю еўрабанкнот, якія будуць уведзены ў абарачэнне ў бліжэйшыя некалькі гадоў. Новая серыя банкнот называецца «Еўропа» — па імені гераіні старажытнагрэчаскай міфалогіі, дачкі фінікійскага цара Еўропы. Яе партрэт, які быў скапіраваны з малюнка на антычнай чары, што захоўваецца цяпер у парыжскім Луўры, размешчаны на новай купюры ў двух месцах — у якасці вадзянога знака і галаграмы. Для дадатковай ступені абароны на банкноце будзе выкарыстана лічба наміналу, якая мяняе пад розным вуглом свой колер. Цяпер купюра ў 5 еўра абаронена галаграмай з выявай сузор'я Еўрыёна.

### ЭКСПЕРТЫ: ПАЛОВА ВЫРАБЛЕНАЙ У СВЕЦЕ ЕЖЫ ВЫКІДВАЕЦЦА

По даных даследавання, праведзенага спецыялістамі брытанскага Інстытута інжынераў-механікаў па замове ААН, каля паловы ўсіх прадуктаў харчавання, якія вырабляюцца ў свеце, выкідваецца на звалку. Паводле справаздачы, да двух мільярдаў тон харчавання знікае з-за недасканалага захоўвання, залішне строгіх тэрмінаў прыдатнасці, перавытворчасці, празмерных аптовых заказаў і капрызаў пакупнікоў, а таксама маркетынгавай палітыкі супермаркетаў, якія падахвочваюць людзей купляць больш прадуктаў, чым трэба. Па гэтых жа звестках, да 30% усёй гародніны, якая вырошчваецца ў Брытаніі, застаецца на палях проста таму, што яна не дасягае параметраў, якія робяць яе прывабнай для пакупнікоў.

Доктар Цім Фокс, кіраўнік аддзела па энергетыцы і экалогіі ў Інстытуце інжынераў-механікаў, заявіў, што ў ЗША і краінах Еўропы палова ўсёй набытай ежы выкідваецца спажыўцамі. «Аб'ёмы выдаткаванай на вытворчасць гэтай прадукцыі энергіі і прыродных рэсурсаў няўяўныя. Усе гэтыя прадукты маглі б пракарміць дзясяткі мільёнаў людзей, якія сёння галадаюць», — сказаў Цім Фокс.

ISSN 1990 - 763X

ПАДРАБЯЗНАСЦІ

### НАСА ВЫКЛЮЧАЕ МАГЧЫМАСЦЬ СУТЫКНЕННЯ АСТЭРОІДА АПОФІС З ЗЯМЛЁЙ У 2036 ГОДЗЕ



Сутыкненне буйнога астэроіда Апофіс з Зямлёй у 2036 годзе выключана: да нашай планеты ён наблізіцца на адлегласць прыкладна ў 30 тыс. км. Такое меркаванне выказалі спецыялісты НАСА. За дзень да гэтага амерыканскія эксперты ўважліва назіралі за праходжаннем нябеснага цела ў 15 млн км ад Зямлі. Атрыманыя звесткі дазволілі спецыялістам зрабіць выснову аб тым, што першапачатковыя прагнозы аб магчымым сутыкненні праз 23 гады цяпер неактуальныя. Апофіс, названы так у гонар старажытнаегіпецкага бога-разбуральніка, мае ў дыяметры каля 300 м. Адкрылі яго восем гадоў таму супрацоўнікі лабараторыі рэактыўнага руху НАСА, якія тады ацэньвалі верагоднасць сутыкнення з Зямлёй прыкладна 13 красавіка 2036 года як 1 да 45000.

КОРАТКА

Закон «Аб камерцыйнай тайне» ўступіць у сілу ў ліпені 2013 года. Прадмет рэгулявання закона складаюць адносіны, якія ўзнікаюць у сувязі з устанаўленнем, змяненнем і адменай рэжыму камерцыйнай тайны, а таксама ў сувязі з прававой аховай камерцыйнай тайны.

Адзіныя формы бланкаў пашпартоў транспартных сродкаў, пашпартоў шасі транспартных сродкаў і пашпартоў самаходных машын плануецца ўвесці ў Мытным саюзе з 1 ліпеня 2013 года. Згодна з дакументам, адзіныя формы бланкаў будуць дзейнічаць да ўвядзення ў дзеянне сістэм электронных пашпартоў.

Падатковыя органы Беларусі запланавалі правесці ў першым паўгоддзі 2013 года больш за 9 тыс. праверак, што на 15 працэнтаў менш у параўнанні з першым паўгоддзем 2012 года, паведамілі ў прэс-службе Міністэрства па падатках і зборах.

Рустам Валіулін, які два сезоны не выступаў за зборную Беларусі па біятлоне, вяртаецца ў каманду. 36-гадовы біятланіст учора прыняў удзел у мужчынскай спрынтарскай гонцы на 10 км на 5-м этапе Кубка ІБУ, які праходзіць у расійскім Востраве, і заняў 33-е месца сярод 83 удзельнікаў.

## ЦІ ВЕРЫЦЕ ВЫ Ў СТУДЭНЦКІЯ ПРЫКМЕТЫ ПЕРАД СЕСІЯЙ?



**Наталля ДЗМІТРЫЕВА, выпускніца Мінскага інстытута кіравання:**

— У злоўленую «халяву» і розныя іншыя забабоны сама ніколі не верыла і іншым не раю. Падчас вучобы рэцэпт поспеху быў вельмі просты: калі не палянуюся і вывучу — значыць, абавязкова здам. Калі абставіны склаліся адваротныя — значыць, і адзнакі добрай чакаць не выпадае. А вось знаёмая адна была — сапраўдны прыхільнік «студэнцкай магіі». Яна лічыла, што, калі памыеш валасы перад экзаменам, змыюцца ўсе веды. Таму гэтага ні ў якім разе нельга рабіць. Яшчэ ёсць такая прыкмета: нібыта перад іспытам нельга стрыгчы пазногці. Дык вось, гэтая дзяўчына таксама так лічыла.



**Вольга ХІЖАНКОВА, прэс-сакратар Белкаапсаюза:**

— Я чалавек не прымхлівы, прыкметы сур'ёзна не ўспрымаю. Таму і розныя студэнцкія рытуалы перад сесіяй мне не даспадобы. Чым верыць у нейкія нічым не абгрунтаваныя рэчы, лепш лішні раз прачытаць патрэбны да экзамену матэрыял і замацаваць веды ў сваёй галаве. Сярод сяброў і знаёмых таксама аматараў палавіць «халяву» не памятаю. На завочным аддзяленні атмасфера студэнцтва з усімі яе «наступствамі» не так адчувальная. Дарослыя сур'ёзныя людзі разумеюць, што залікоўка, якую напярэдадні высоўвалі ў адчыненую фортку, удачы на экзамене дабавіць не здольная.



**Таццяна ЗЯМЦОВА, студэнтка другога курса Беларускага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта імя М. Танка:**

— Толькі сёння здала экзамен, а напярэдадні ўвечары мы разам з суседкамі па інтэрнатаўскім пакоі бесперапынна нагадвалі адна адной, што да заўтра ні ў якім разе нельга мыць галаву. Не магу сказаць, што я апантаная верай у прыкметы. Але здараецца, што з лёсам жартаваць жадання асаблівага няма. Напрыклад, калі ведаю, што добра падрыхтавалася і ёсць упэўненасць перад іспытам, звароты да «халявы» ў акно не крычу. Тут і так усё зразумела. А выпадзе нешта складанае, ад чаго так і адчуваецца магчымае хісткае становішча падчас адказу... Вось тады ўсё магчыма.

**Падрыхтавала Ганна ГАРУСТОВІЧ.**

# Не колькасцю, а ўменнем

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

«Вы ж разумееце псіхалогію нашага народа, — сказаў кіраўнік дзяржавы. — Давайце аптымізуем колькасць, каб народ нас разумеў: так, у дзяржслужачых нармальная, дастойная зарплата, але іх колькасць у нас аптымальная».

Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што ў цэлым падтрымлівае прапановы спецыяльнай камісіі, якая была створана для выпрацоўкі рашэнняў па аптымізацыі структуры, колькасці і функцый дзяржаўных органаў. Аднак, паводле яго слоў, ёсць шэраг пытанняў, якія трэба больш дасканала, грунтоўна і ўсебакова абмеркаваць.

У прыватнасці, камісія прапануе скасаваць або аб'яднаць асобныя органы, міністэрствы і ведамствы. «Я не адмаўляў прапановы камісіі, як гэта інтэрпрэтуецца ў асобных сродках масавай інфармацыі, я проста іх паставіў пад сумненне, сказаўшы прама, што я не ведаю, як тут лепш зрабіць. Давайце разам падумаем», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

Ён падкрэсліў, што крытэрыем павінна быць эфектыўнасць работы дзяржслужачых. «Павінна быць аптымальная колькасць, нічога лішняга. Вось зыходзячы з гэтага давайце вызначымся: трэба нам аб'ядноўваць падатковае ведамства, падпарадкоўваючы яго Мінфіну, або не трэба, трэба нам у Міністэрства эканомікі скідваць Мінгандаль і іншыя ведамствы або не трэба», — адзначыў Прэзідэнт. «Мяне насцярожвае: Мінфін сёння і так не маленькі, і Мінэканомікі яшчэ большае. А мы гаворым: давайце ім яшчэ функцыі аддадзім. Можа, і правільна. Але мяне гэта насцярожвае. Ці не атрымаецца некіруемы нейкі монстр, ці не атрымаецца так, што мы, каб дагадзіць нейкай модзе, усё гэта туды скінем? Таму я нічога не адмаўляю, проста хачу з вамі параіцца», — сказаў Прэзідэнт.

Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што пры правядзенні пераўтварэнняў не павінна быць фармалізму і кампанейшчыны. «Нам гэта не трэба ні для піяру, як некаторыя тут, наша пятая калона, гавораць, ні для чаго. Нам трэба спакойнае рэфармаванне. І скажу адкрыта: лепш гэта рабіць самім, па ўласнай ініцыятыве, а не так, як гэта робіцца вось у Грэцыі, Партугаліі або яшчэ дзесьці. Вось гэтага дапусціць нельга. Трэба працаваць заўсёды на апярэджанне», — лічыць кіраўнік дзяржавы.

«Таму яшчэ раз падкрэсліваю: без фармалізму і кампанейшчыны. У нас няма ў гэтым плане ніякага крытычнага стану. Нас ніхто ў спіну не штурхае», — сказаў Прэзідэнт. «У нас і так дзяржаўны апарат, калі параўноўваць па колькасці і пэўных крытэрыях з нашымі суседзямі і нават з Еўрасаюзам, на парадак ніжэйшы. Але мы ў сувязі з эфектыўнасцю дзейнасці нашай сістэмы дзяржаўнага кіравання можам яшчэ скараціць гэты дзяржапарат», — лічыць Аляксандр Лукашэнка, дадаўшы, што аб гэтым сведчыць і работа камісіі.

Аляксандр Лукашэнка дадаў, што скарачэнні закрануць і Адміністрацыю Прэзідэнта, і ўрад. «Я гляджу і дзіўлюся: ва ўрадзе і памочнікі, і саветнікі — каго толькі там няма! У Прэзідэнта — адзін памочнік, які спраўляецца з усёй работай, і ў прыёмнай два чалавекі. А я гляджу, у маіх падначаленых па дзесяць памочнікаў, па дзесяць саветнікаў! Дарагія мае, чым яны ў вас займаюцца?» — звярнуўся кіраўнік дзяржавы да прысутных.

«Так што давайце акуратна, узважана падыдзем да ўсіх гэтых пытанняў і выпрацуем аптымальныя рашэнні, якія ўжо ў найбліжэйшы час неабходна актыўна і без затрымак рэалізаваць на практыцы», — сказаў Прэзідэнт. Пры гэтым ён падкрэсліў, што ў гэтым пытанні неабходна кіравацца інтарэсамі дзяржавы і грамадства, а не адстойваць вузкаведамасныя або местачковыя пазіцыі. «Тое, што мы павінны скараціцца прыкладна на чвэрць — гэта непазбежна. Давайце з гэтага зыходзіць», — падкрэсліў Прэзідэнт.

## УДАСКАНАЛЬВАЕЦЦА МЕХАНІЗМ ПРАВЯДЗЕННЯ АЎКЦЫЁНАЎ І КОНКУРСАЎ

Адпаведны ўказ № 14 «Аб унясенні змяненняў і дапаўненняў ва Указ Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 5 мая 2009 г. № 232» кіраўнік дзяржавы Аляксандр Лукашэнка падпісаў 10 студзеня, паведамілі БЕЛТА ў прэс-службе беларускага лідара.

Указам уводзіцца магчымасць продажу маёмасці, якая знаходзіцца ў дзяржаўнай уласнасці, уключаючы зямельныя ўчасткі, шляхам правядзення электронных таргоў.

У мэтах стварэння адзінай і празрыстай сістэмы правядзення таргоў па продажы маёмасці, што знаходзіцца ва ўласнасці Рэспублікі Беларусь і ў камунальнай уласнасці адміністрацыйна-тэрытарыяльных адзінак, гэтым указам ураду прадастаўлена права ўстанаўлення адзінага парадку правядзення аўкцыёнаў (конкурсаў) па продажы такой маёмасці.

Указам устанаўліваецца апошні тэрмін прыёму заявак на ўдзел у аўкцыёне (конкурсе) — не пазней як за тры рабочыя дні да даты яго правядзення і замацоўваецца магчымасць рэалізацыі маёмасці асобе, якая стала адзіным удзельнікам аўкцыёну (конкурсу) не толькі з-за адсутнасці заявак ад іншых асоб на ўдзел у ім, але і ў выніку нез'яўлення на аўкцыён (конкурс) іншых асоб, якія падалі заяўкі на ўдзел. У такім выпадку маёмасць можа быць прададзена адзінаму ўдзельніку па пачатковай цане, павялічанай на 5 працэнтаў.

Акрамя таго, дакументам прадугледжана магчымасць накладання штрафу на нядобрасумленных удзельнікаў аўкцыёну (конкурсу), па віне якіх ён прызнаецца невыніковым або яго вынікі анулююцца.

**Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.**

■ Блізкая ўлада

# КАБ ЛЮДЗЯМ БЫЛО ДОБРА

**На чарговым прыёме грамадзян старшыня Магілёўскага аблвыканкама Пётр Руднік вырашаў сацыяльныя пытанні.**


Фота БЕЛТА.

### Бацька і дзеці

З усяго парадку прыёмнага дня кіраўнік вобласці прасіў сродкі масавай інфармацыі асабліва звярнуць увагу людзей на зварот ветэрана вайны і інваліда Міхаіла Іосіфавіча Куляшова. Ён прыехаў у Магілёў да Пятра Рудніка з аграгарадка Вішоў, што ў Бялыніцкім раёне. Вяскоўцу ўжо 94 гады. Ён паскардзіўся на хваробы і нястачу сіл, і расказаў, што мае патрэбу ў дапамозе. Асабліва цяпер, узімку, калі двойчы на дзень трэба тапіць печку. Праўда, Міхаіл Іосіфавіч катэгарычна адмовіўся на халодны сезон перасяліцца ў дом-інтэрнат, а таксама не задаволіўся паслугамі сацыяльнага работніка, які наведваў яго паводле звычайнага графіку. Ён просіць, каб пра яго дома клапаціліся штодзённа.

Між тым, ветэран — не адзінокі чалавек, ён мае дзяцей і ўнукаў. Увогуле ён бацька 6 дзяцей, прычым трое з іх жывуць з ім у адной вёсцы, і двое з гэтых траіх — працуюць. Нібыта ёсць каму з родных людзей дапамагчы састарэламу чалавеку, але Міхаіл Іосіфавіч расказаў на прыёме пра сваё бачанне праблемы: ён хоча, каб дзяржава, у дадатак да пенсіі, плаціла грошы яго дзецям, якія і будуць добра даглядаць бацьку.

Пётр Руднік падкрэсліў: органы ўлады робяць для ветэрана Вялікай Айчыннай вайны ўсё, што трэба, і нават больш. Аднак усё павінна быць у межах закона, і ў гэтым выпадку ён не дазваляе плаціць дзецям, якія маюць іншую сталую працу, яшчэ і за догляд сваіх бацькоў.

У такой сітуацыі кіраўнік вобласці вырашыў, што дзяржава тэрмінова знойдзе сацыяльнага работніка, які будзе штодня, і нават двойчы на дзень, наведваць ветэрана і клапаціцца пра печ, набыццё харчоў у краме і іншыя надзённыя патрэбы паважанага чалавека. Аднак Пётр Руднік і нагадаў: «Дзеці павінны даглядаць сваіх састарэлых бацькоў».

### Свая паліклініка

Жыхары магілёўскага мікраraёна Казіміраўка, на ускраіне абласнога цэнтра, вырашылі нагадаць уладам пра рашэнне, якое было прынята амаль 15 гадоў таму. Безумоўна, за гэты час кіраўнікі змяніліся, але людзі засталіся, і свая паліклініка па-ранейшаму застаецца для іх актуальным пытаннем. «Яна патрэбна як паветра», — так сказаў на прыёме ў старшыні аблвыканкама член ветэранскай арганізацыі Анатоль Доктараў.

Пётр Руднік прызнаў, што ў апошнія гады будаўніцтва жылля ішло такімі шпаркімі тэмпамі, што сацыяльная сфера адставала. Цяпер надышоў час скасаваць разрыў. Тым больш што Казіміраўка развіваецца, там будзе ўзведзены гіпермаркет і з'явяцца новыя жылыя дамы паблізу ад кальцавой дарогі. Таму паліклініка мясцовым жыхарам сапраўды патрэбна.

Сёлета кіраўнік вобласці паабяцаў выдаткаваць сродкі на праект: гэта будзе 5-павярховы тыпавы будынак. Паліклініка зможа прымаць 500 наведвальнікаў у змену. Пётр Руднік паабяцаў, што адкрыццё адбудзецца напрыканцы 2015 года.

### Другі шанц вёскі

Вёска Долгавічы Мсціслаўскага раёна на беларуска-расійскім памежжы — радзіма майстра па габеленах Ніны Пілюзінай, лаўрэата Дзяржаўнай прэміі Беларусі. Ніна Васільеўна прыехала ў Магілёў з прапановай адрадзіць Долгавічы. У вёсцы закрылі школу, і будынак выкарыстоўваецца для дзіцячага лагера толькі ўлетку. Майстар прапануе адкрыць у ім аддзяленне каледжа па народных рамёствах, дзе б маладыя людзі маглі скарыстацца ў тым ліку і вопытам мясцовых жыхароў. Традыцыйнае вясковае мастацтва, на думку Ніны Васільеўны, магло б прыцягнуць у гэты край турыстаў і даць Долгавічам «другое дыханне».

Цяпер жа вёска не лічыцца перспектыўнай. І хаця агульная колькасць жыхароў яшчэ каля 250 чалавек, найбольш з іх — пенсіянеры, а дзяцей толькі з дзясятак. Таму, на погляд мсціслаўскіх улад, спачатку трэба ацаніць выдаткі: ці будуць яны мэтазгодныя. Пакуль жа ўпраўленне культуры аблвыканкама дамовілася з Нінай Пілюзінай аб серыі майстар-класаў у рэгіёне і ўдзеле ў этнаграфічнай экспедыцыі.

Пётр Руднік пагадзіўся, што калі ў Долгавічах сёння засталася толькі крама, няма клуба і школы, то вёска сапраўды вырачана на паступовае старэнне. Як яго спыніць? Кіраўнік вобласці лічыць, што трэба развіваць аграэкатурызм і прыдарожны сэрвіс. Дарэчы, Долгавічы месцяцца непадалёк ад аўтатрасы з актыўным памежным рухам, таму паабапал яе, на думку Пятра Рудніка, можна было б адкрыць заезны дом альбо карчму з вясковай кухняй і тымі ж рамёствамі. Галоўнае — пачаць, каб адрадзіць цікавасць да беларускай глыбінкі.

**Ілона ІВАНОВА** ■

## Устаноўлены асобы тых, хто збіў у метро інваліда

**Супрацоўнікі аддзела крымінальнага вышуку Партызанскага РУУС г.Мінска затрымалі трох падазроных ва ўчыненні злачынства ў сталічным метрапалітэне. Пра гэтую дзікунскую гісторыю «Звязда» паведамляла ў мінулым нумары: на просьбу саступіць месца чалавеку, якому цяжка было стаяць, тыя адказалі... кулакамі. Устанавіць асобы гэтых маладых людзей дапамаглі інтэрнэт-карыстальнікі.**

Просьба аб дапамозе, а таксама фатаграфіі і відэа, на якіх былі магчымыя падазроныя, была размешчана на афіцыйным інтэрнэт-сайце ГУУС Мінгарвыканкама. Літаральна праз некалькі гадзін інтэрнэт-карыстальнікі нашлі асабістыя старонкі верагодных падазроных у сацыяльнай сетцы. Гэтая інфармацыя ў рэшце рэшт дайшла да аператыўнікаў. Пасля было ўстаноўлена, што з трох указаных асоб да падзей у вагоне метро мае дачыненне толькі адна з іх. Аднак неўзабаве аператыўнікі зноў атрымалі ананімнае паведамленне, у якім была ўдакладняльная інфармацыя адносна двух іншых падазроных.

І вось учора раніцай усе падазроныя былі затрыманы і дастаўлены ў Партызанскі РУУС сталіцы для правядзення праверачных мерапрыемстваў. Кваліфікаваць дзеянні трох маладых людзей будуць у Следчым камітэце, куды будуць перададзены матэрыялы праверкі. У прэс-службе ГУУС Мінгарвыканкама заўважылі, што гэта далёка не першы выпадак, калі грамадскасць аказвае значную дапамогу органам унутраных спраў у раскрыцці злачынстваў.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

# ЖЫЛЛЁВЫ «КВАДРАТ» У ФАВОРЫ

## ЭКСПЕРТЫ ПРАГНАЗУЮЦЬ ПАДАРАЖАННЕ СТАЛІЧНЫХ КВАТЭР ДА МАЯ ЯШЧЭ НА 5—7 ПРАЦЭНТАЎ


Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

**Мінулы год для спецыялістаў другаснага рынку жыллёвай нерухомасці быў даволі ўрадлівым на знакавыя падзеі. Упершыню на рынку кватэр Мінска адсутнічаў «мёртвы сезон» летам, а з восені кліенты пачалі купляць не толькі таннае жыллё. Рынак «заварушыўся»... Аб папярэдніх выніках сезона-2012, пра сітуацыю, што зараз назіраецца ў жыллёвай сферы сталіцы, і невялікі прагноз на заўтра карэспандэнту «Звязды» паведаміў наш пастаянны кансультант — кіраўнік агенцтва «БелЦТН», старшыня рады Беларускай асацыяцыі «Нерухомасць» Мікалай ПРАСТАЛУПАЎ.**

### Разглядаюцца ўсе варыянты

Яшчэ летась у верасні наша выданне прапанавала прагноз экспертаў, якія лічылі, што да лістапада на другасным рынку жылля сталіцы цэны будуць трымацца на мінімальным узроўні. Прагноз спраўдзіўся толькі часткова, бо на рынку ўжо ў кастрычніку пачалі дзейнічаць не эканамічныя прынцыпы, а эмацыянальныя фактары. Улады сталіцы паведамілі насельніцтву, што бюджэтнага жылля ў галоўным мегаполісе краіны будзе будавацца значна менш, чым у мінулыя гады. А цэны на камерцыйнае будаўніцтва ўжо ніхто не трымае. Масавае будаўніцтва жылля для сталічных чаргавікоў было вырашана перанакіраваць у гарады-спадарожнікі.

У гэтым выпадку людзі з грашыма зразумелі, што на дзяржаву моцна спадзявацца ўжо нельга, а трэба вырашаць свае жыллёвыя праблемы самастойна. Менавіта таму ў апошнія тры месяцы патэнцыяльныя пакупнікі сталічнага жылля пачалі не толькі цікавіцца існуючымі прапановамі, але і рэальна набываць кватэры як на стадыі будаўніцтва, так і на другасным рынку.

А ў выніку летась за тры апошнія месяцы колькасць здзелак па куплі-продажы кватэр павялічылася прыкладна на 10—15%. Зразумела, што павышаны попыт на жыллё паўплываў і на цэнавы фактар. Таму ў апошнія месяцы года пачала назірацца тэндэнцыя па плаўным павелічэнні кошту на другасным рынку сталічных кватэр.

Мікалай Прасталупаў адзначае, што за гэты час сярэдні кошт квадратнага метра стандартных кватэр павялічыўся прыкладна на 60—90 долараў, або на 6—8%. Тут трэба адзначыць той момант, што зараз набываюцца кватэры не толькі ніжэйшай цэнавай катэгорыі, але разглядаюцца ўсе варыянты па жыллі эканом-класа, дзе цэны ўжо сур'ёзныя. Мабыць, людзі сапраўды зразумелі, што жыллё танней у Мінску ўжо не будзе і трэба карыстацца момантам, пакуль яшчэ ёсць выбар.

### Стандартныя аднапакаёўкі — не менш чым 45 тысяч USD

Калі некалькі месяцаў таму на рынку можна было без праблем адшукаць не вельмі дрэнную аднапакаёўку да 40 тысяч долараў, то зараз сітуацыя зусім іншая. Праўда, у інфармацыйных каталогах спецыялізаваных выданняў прысутнічае каля дзесяці варыянтаў аднапакаёвак па кошце ад 42 да 45 тысяч долараў, аднак гэта не зусім ліквіднае жыллё. Звычайна гэта кватэры агульнай плошчай да 30—32 кв. м і абавязкова на крайніх паверхах у старых трох-, пяціпавярховых дамах.

Стандартныя аднапакаёвыя кватэры агульнай плошчай ад 33 да 40 кв. м прапануюцца ў спальных раёнах па кошце ад 45 да 55 тысяч долараў. Тут галоўным фактарам ацэнкі жылога памяшкання з'яўляецца «прапіска» яго ў мікрараёне, адлегласць ад метро, наяўнасць побач сацыяльнай інфраструктуры, зялёнай зоны і буйных гандлёвых аб'ектаў. Паўплывае на кошт жылля год пабудовы дома, яго стан і канкрэтны паверх кватэры. Больш прасторныя аднапакаёўкі ў адносна новых дзевяціпавярховых дамах каштуюць ужо ад 55 да 65 тысяч долараў. Аднак і па гэтым сегменце якасных кватэр сапраўды прывабных варыянтаў засталося ўжо не вельмі шмат.

Мінімальны кошт двухпакаёвых кватэр складае ад 46 да 52 тысяч долараў. Яшчэ ў лістападзе падобныя кватэры-«хрушчоўкі» ў старых дамах каштавалі ў дыяпазоне ад 44 да 49 тысяч долараў. Звычайныя двухпакаёвыя кватэры ў панэльных дзевяціпавярховых дамах прапануюцца ад 53 да 70 тысяч долараў.

Кватэры коштам ад 70 да 100 тысяч долараў маюць агульную плошчу ад 65 да 75 кв. м, або размешчаны бліжэй да цэнтра горада. Зараз нават стандартныя па плошчы двухпакаёўкі з якасным рамонтам і сучаснай мэбляй або ў элітных дамах прапануюцца за 100—160 тысяч долараў.

**Людзі зразумелі, што жыллё танней у Мінску ўжо не будзе і трэба карыстацца момантам, пакуль яшчэ ёсць выбар**

Апошняя тэндэнцыя сярод пакупнікоў не вельмі танных кватэр заключаецца ў тым, што кліенты адмаўляюцца набываць жыллё, якое патрабуе сур'ёзнага рамонту. А наадварот, кватэры з якасным рамонтам даволі хутка прадаюцца па кошце нават на 1—2 тысячы долараў большым, чым у сярэднім на рынку.

Стартавы кошт маленькіх трохпакаёвых кватэр пачынаецца з 60 тысяч долараў. Гэта «хрушчоўкі» з сумежнымі пакоямі і агульнай плошчай ад 55 да 62 кв. м. У лістападзе кватэры падобнай катэгорыі каштавалі прыкладна на 3—5 тысяч долараў менш. Стандартныя трохпакаёўкі, дзе агульная плошча складае да 80 кв. м, каштуюць ужо ў дыяпазоне ад 75 да 95 тысяч долараў.

Згодна са статыстыкай інфармацыйнага каталога выдання «Нерухомасць Беларусі», сярэдні кошт квадратнага метра аднапакаёвых кватэр складае 1440 долараў. Жыллёвы «квадрат» двухпакаёвых кватэр, па гэтай статыстыцы, нават даражэйшы — 1455 долараў. Аднак пры рэальных здзелках звычайна кватэры набываюцца, калі кошт квадратнага метра адна- і двухпакаёвых кватэр не больш чым 1320—1360 долараў. Трохпакаёвыя кватэры добра набываюцца, калі квадратны метр такога жылля вагаецца ў межах ад 1280 да 1320 долараў.

### У валюце даражэюць і новабудоўлі

Мікалай Прасталупаў адзначае, што апошнім часам істотна скарацілася прапанова па камерцыйным будаўніцтве жылля ў сталіцы. Сабекошт будаўніцтва працягвае павялічвацца, а вось прадаць яго па новым цэнніку робіцца праблематычным. Чаму? Наш суразмоўца тлумачыць гэта такім чынам. Летась у краіне была зафіксавана інфляцыя на ўзроўні 22%. Разам з тым, кошт замежнай валюты застаўся амаль на ранейшым узроўні. Тады атрымліваецца, што тавары і паслугі за год у нас падаражэлі ў валюце на гэтыя 22%. Гэта напрамую тычыцца не ўсіх сфер эканомікі, але...

Зразумела, што павялічыць цэннік новага жылля адразу на 22% у валюце арганізатар будаўніцтва не адважыцца, бо такія кватэры ніхто купляць не будзе. Разам з тым, сёння адкрытае акцыянернае таварыства «Мінскпрамбуд» прапануе кліентам долевае будаўніцтва жылога дома па вуліцы Прытыцкага, дзе квадратны метр аднапакаёвых кватэр каштуе 1300—1350 долараў, а жыллёвы «квадрат» двухпакаёвых кватэр цягне ўжо 1350—1400 долараў. Тэрмін увода дома ў эксплуатацыю — верасень гэтага года.

Зараз будуецца група жылых дамоў па вуліцы Шафарнянскай у мікрараёне Уручча-6. Там кошт кватэр ад забудоўшчыка складае ад 11 млн рублёў за квадратны метр. І новае жыллё будзе здадзена ў эксплуатацыю таксама сёлета.

Танней магчыма адшукаць долевае будаўніцтва толькі па такіх праектах, калі здача дома запланавана, напрыклад, на апошні квартал 2014 года. У такім доме (мікрараён Каменная горка-1) квадратны метр жылля прапануецца за 1000—1350 долараў. А калі дом запланавана пабудаваць ажно ў 2016 годзе, то квадратны метр будзе каштаваць нават ад 7,3 млн рублёў. Тут існуе толькі адна ўмова: неабходна аплаціць адразу 100% кошту будаўніцтва.

❍ ❍ ❍

Мікалай Прасталупаў упэўнены, што пры сённяшняй сітуацыі ў камерцыйным будаўніцтве і пры стабільнай айчыннай валюце, да мая кватэры на другасным рынку Мінска падаражэюць яшчэ мінімум на 5—7%. Асобныя эксперты рынку нерухомасці не выключаюць таго, што пры павелічэнні попыту на сталічнае жыллё з боку жыхароў іншых гарадоў Беларусі яно можа падаражэць сёлета больш істотна.

**Сяргей КУРКАЧ.**

■ Парламенцкі дзённік

# ШТО ПАТРЭБНА ВУЧОНАМУ, КАБ ЗРАБІЦЬ КРАІНУ БАГАТАЙ?

**На пашыраным пасяджэнні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу па адукацыі, культуры і навуцы вучоныя і дэпутаты сфармулявалі галоўныя праблемы развіцця беларускай навукі.**

### Прывабіць маладых

— У працэсе рэфармавання беларускай навукі самае галоўнае — не згубіць тое, што яна мае, — сказаў дэпутатам **намеснік старшыні прэзідыума Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі Сяргей ЧЫЖЫК.** — Увесь прагрэсіўны свет зараз настроены на тое, каб упор у развіцці эканомікі рабіць на інтэлект, веды і прыцягненне ў навуку таленавітай моладзі. Гэта не проста, бо такой від дзейнасці патрабуе адданасці, ахвяравання і шмат часу для станаўлення.

Зараз у свеце распаўсюджана пераманьванне таленавітых вучоных. Гэта балюча адбіваецца на беларускай навуцы, дзе сярэдні заробак вучонага далёкі ад першых радкоў рэйтынгу па краіне. Калі сітуацыя не зменіцца, беларуская навука акажацца ў крытычным стане, лічаць акадэмікі.

Прадстаўнікі Акадэміі навук указалі таксама на разрыў у сістэме падрыхтоўкі вучоных, які ўсталяваўся з нядаўна прынятым Кодэксам аб адукацыі. Сёння для таго, каб паступіць у аспірантуру і весці работу над дысертацыяй, трэба скончыць магістратуру. Аднак магістратура пакуль не ў стане падсілкаваць аспірантуру: яе выпускнікоў недастаткова. Да таго ж чалавек, які мае вопыт практычнай працы, не жадае вяртацца на стыпендыю магістранта, якая амаль роўная стыпендыі студэнта.

Адна з найбольш вострых праблем для беларускай навукі — адсутнасць матывацыі для таленавітай моладзі. Калі раней лепшыя выпускнікі ВНУ ішлі ў навуку і гэта лічылася гонарам, то цяпер лепшыя выпускнікі зыходзяць у фірмы, якія ім адразу даюць высокі заробак.

— Адносіны да інтэлігента і вучонага дасягнулі свайго апагею, — маючы на ўвазе негатыўную афарбоўку, заўважыў **намеснік старшыні прэзідыума НАН Беларусі Аляксандр СУКАЛА.** — Раней з пагардай казалі: «Ты інтэлігент у капелюшы!», а цяпер кажуць: «Ты батанік!» Гэта трэба выправіць, і ў законе трэба прадугледзець паважлівае стаўленне да вучонага. Аналітычны даклад пра стан навукі ў нашай краіне сведчыць пра катастрофу: за апошнія 10 гадоў праслойка вучоных самага плённага для навукі ўзросту — з 35 да 50 гадоў— знізілася амаль на траціну. Калі мы зараз не прымем рашучых крокаў, навука ў Беларусі загіне.

**Аналітычны даклад пра стан навукі ў нашай краіне сведчыць пра катастрофу: за апошнія 10 гадоў праслойка вучоных самага плённага для навукі ўзросту — з 35 да 50 гадоў— знізілася амаль на траціну.**

На разрыў у ланцужку «адукацыя — навука — інавацыі — вытворчасць — рынак» указаў і **кіраўнік апарата Нацыянальнай акадэміі навук Пётр ВІЦЯЗЬ.** «Ланцужок гэты павінен разглядацца ў адным цыкле і адным заканадаўстве. У нас ён не працуе. Мы вырошчваем цудоўных інжынераў, укладаем у іх дзяржаўныя сродкі, але іх потым «скупляюць» замежныя фірмы.

Справа не толькі ў заробках, дадаў **галоўны вучоны сакратар НАН Беларусі Сяргей КІЛІН.** Суседнія краіны ствараюць аптымальныя ўмовы для работы навуковага супрацоўніка, больш лёгкую інфраструктуру, каб вучоны не выдаткоўваў свой каштоўны час на мытню, дакументы, а займаўся справай. Асабліва актуальна гэтае пытанне ва ўмовах фарміравання Адзінай эканамічнай прасторы, якая, калі Беларусь не прыме меры, можа абярнуцца стратай для нашай краіны навуковага патэнцыялу.

З акадэмікамі цалкам пагадзіўся **намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па адукацыі, культуры і навуцы Міхаіл ВОЛКАЎ.** Не толькі студэнты, але і школьнікі зараз не звязваюць сваю будучыню з навукай, бо, папершае, не атрымліваюць неабходнага развіцця ва ўмовах ураўнілаўкі ў адукацыі, лічыць дэпутат. Зараз у школах няма класаў з паглыбленым вывучэннем, профільных, дзе ў дзяцей выхоўвалася б цяга да навуковай, даследчай дзейнасці.


Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

— Я выхаваў 17 пераможцаў міжнародных алімпіяд па матэматыцы. Многія з іх заканчвалі беларускія ВНУ. Але дзе яны зараз? Адзін — загадчык кафедры Ельскага ўніверсітэта, узначальваў групу Абамы па выхадзе з эканамічнага крызісу. Другі — Арцём Кохан — двойчы «залаты хлопчык» на міжнародных алімпіядах, пасля заканчэння БДУ атрымаў асабістае запрашэнне на працу ад заснавальніка «Майкрасофта» Біла Гейтса. Яму прапанавалі катэдж, няньку для дзіцяці (Арцём нядаўна ажаніўся) і двухгадовы кантракт. І ён паехаў. Таму, безумоўна, пакуль дзяржава не задумаецца пра тое, што аснову яе складаюць адукацыя, навука і культура, ніякай мадэрнізацыі не атрымаецца, — заявіў парламентарый.

### Заахвоціць вынаходнікаў

Другая праблема ў развіцці беларускай навукі, закранутая на пашыраным пасяджэнні профільнай камісіі ў парламенце, — камерцыйны бок. У свеце сёння найбольш моцная так званая «фірменная навука», тлумачылі вучоныя. Буйныя фірмы IBM, SAMSUNG, LG і падобныя ім маюць свой навуковы сектар, найбольш перадавы. «Фірменныя» навукоўцы не заўсёды паказваюць вынікі сваёй працы, але маюць напрацоўкі, мэта якіх — зрабіць прадукцыю канкурэнтнай. У Беларусі фірмаў, якія гатовы ўкласці значныя сродкі ў развіццё навукі, пакуль няма.

Крокі ў гэтым кірунку робяць навуковыя ўстановы. Магчыма, варта было б стварыць пры Акадэміі навук сектар малых прадпрыемстваў, лічаць вучоныя. «Сёння мы маем шмат распрацовак, якія не ўяўляюць вялікай каштоўнасці для буйной прамысловасці, але могуць паспяхова выкарыстоўвацца малой прамысловасцю, — сказаў доктар тэхнічных навук Сяргей Чыжык. — Напрыклад, вядомая за межамі Беларусі фірма «Адані» (выпускае рэнтгенаўскія апараты), заснаваная прафесарам БДУ Уладзімірам Лінёвым, пачынала з малога. З Інстытута фізікі Нацыянальнай акадэміі навук таксама выйшаў шэраг моцных фірмаў. Трэба не біць іх па руках, а заахвочваць, і рабіць гэта на заканадаўчым узроўні».

Доктар медыцынскіх навук, прафесар Аляксандр Сукала лічыць, што ў законе павінна быць прапісана таксама падтрымка ўласнага вытворцы высокатэхналагічнай прадукцыі ў першыя 3-5 гадоў. «Мы распрацоўваем новы лекавы сродак і пачынаем яго выпрацоўваць на базе створаных у Акадэміі навук вытворчасцяў, — прывёў ён прыклад. — І мы трапляем у жудасную сітуацыю: малая вытворчасць, невялікі ўнутраны рынак, і мы павінны хаця б сабекошт гэтай прадукцыі апраўдаць. Пры гэтым нашымі канкурэнтамі з'яўляюцца кітайскія аналагі, на якія выдаткоўваюць вялізныя сродкі».

Вучоныя бачаць выйсце ў развіцці дзяржаўна-прыватнага партнёрства, аднак адпаведны закон летась так і не быў прыняты. Гэты закон заклікаы даць штуршок для развіцця менавіта той сферы эканомікі, дзе навука адыгрывае ключавую ролю. Прафесары прывялі ў прыклад замежны вопыт. У Паўднёвай Карэі вучонаму дазваляюць тры гады сумяшчаць працу ў дзяржаўным і камерцыйным сектарах, і толькі потым ён павінен вызначыцца з выбарам. У Германіі лічыцца, што прафесара, які не стварыў фірму, нельга лічыць паспяховым. Акадэмікі таксама звярнулі ўвагу дэпутатаў на ролю вучонага ў фарміраванні міжнароднага іміджу краіны.

### Абараніць сакрэты

Доктар тэхнічных навук Пётр Віцязь звярнуў увагу дэпутатаў на пагадненне аб закупках у Мытным саюзе, якое закранае і сферу навукі. «Неабходна абараніць нашы нацыянальныя інтарэсы, інтэлектуальную ўласнасць, — падкрэсліў ён. — Важна, каб правілы і стандарты, па якіх распаўсюджваюцца беларускія патэнты на тэрыторыі Мытнага саюза, былі аднолькавыя для ўсіх удзельнікаў інтэграцыі, каб мы захавалі свае бюджэтныя сродкі».

Навука ў Беларусі фінансуецца з бюджэту толькі на 30%. Каля 40 млн долараў ёй удаецца зарабіць на экспарце (сёлета гэты паказчык плануецца павялічыць). Але трэба разумець, папярэджваюць вучоныя, што экспарт у навуковай дзейнасці мае на ўвазе працу на замежную крыніцу фінансавання, а значыць, і перадачу беларускага ноу-хау за мяжу.

Прафесар Віцязь агучыў яшчэ адно балючае для беларускай навукі пытанне: надзвычайную цяжкасць узгаднення нарматыўных дакументаў: «У нас няма сістэмы з пункту погляду заканадаўства. У кожным ведамстве ёсць юрыст: у Акадэміі навук, Мінфіне, Міністэрстве эканомікі, Адміністрацыі Прэзідэнта... і ўсе яны размаўляюць на розных мовах! Чаму не стварыць адзін орган, няхай на самым высокім узроўні?»

**Старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па адукацыі, культуры і навуцы Генадзь ПАЛЬЧЫК** цалкам падтрымаў акадэмікаў і распарадзіўся стварыць працоўную групу ў ніжняй палаце парламента, якая будзе садзейнічаць вырашэнню ўсіх адзначаных на пасяджэнні пытанняў.

**Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.**

## ■ Як жывяце, землякі?



### Брэстчына

#### НОВЫ ДОМ ДЛЯ ШМАТДЗЕТНАЙ СЯМ'І

**У навагоднія дні ў Кобрыне адкрыўся яшчэ адзін дом сямейнага тыпу для дзяцей, якія засталіся без апекі бацькоў**

На гэты раз двухпавярховы катэдж пабудаваны на вуліцы Грыбаедава. Бацькамі для сірот тут сталі Алена і Віктар Асіюкі. У іх сына — сямігадовага Дзімы — паявілася адразу пяцёра братоў і сясцёр. Дзяцей ва ўзросце ад 5 да 15 гадоў узялі з Дзівінскага інтэрната Кобрынскага раёна.

**Яна СВЕТАВА.**

#### ВЫБУХНУЎ КАЦЁЛ

**У доме па Слонімскай шашы, дзе адбылося здарэнне, жыве пенсіянерка 1931 года нараджэння.**

Каля шасці гадзін вечара, як звычайна, бабуля распаліла кацёл і пайшла ў пакой. А праз паўгадзіны прагрымеў выбух. Узрыўной хваляй пашкодзіла сцяну ў кухні, але абышлося без пажару. На жаль, пацярпела і гаспадыня дома. З апёкамі 50% скуры яна дастаўлена ў бальніцу. Папярэдняй прычынай выбуху спецыялісты МНС назвалі адсутнасць цыркуляцыі вады ў сістэме ацяплення.

**Яна СВЕТАВА.**

### Віцебшчына

#### МЯЖУ ПЕРАСЯЧЫ НЕ ЎДАЛОСЯ

**Затрымалі арганізатараў нелегальнай міграцыі**

Супрацоўнікі праваахоўных органаў Віцебскай вобласці вечарам у кавярні, што каля аўтадарогі Віцебск — Полацк — мяжа Літвы паблізу вёскі Баранава Полацкага раёна, затрымалі без выязных віз Рэспублікі Беларусь і дакументаў шэсць грамадзян В'етнама, грамадзяніна Ірака і грамадзяніна Афганістана. Іншаземцы, як высветлілася, перамяшчаліся на двух легкавых аўтамабілях праз тэрыторыю нашай краіны з Масквы на мяжу з Літвой.

— Пры правядзенні першапачатковых следчых дзеянняў і аператыўна-вышуковых мерапрыемстваў з'явілася падстава меркаваць, што арганізацыяй незаконнай міграцыі займаліся грамадзяне Расійскай Федэрацыі, 1982 і 1976 года нараджэння, — паведаміла Іна Гарбачова, афіцыйны прадстаўнік упраўлення Следчага камітэта па Віцебскай вобласці. — У цяперашні час яны затрыманы. Вядзецца збор доказаў па распачатай крымінальнай справе.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

### Гомельшчына

#### ШУКАЮЦЬ «ЗОЛАТАЗДАБЫТЧЫКА»

**Падчас абедзеннага перапынку невядомы мужчына сарваў навясныя замкі з дзвярэй і рашоткі складскога памяшкання і пракраўся ў петрыкаўскую краму «Галантарэя»**

Зламыснік пашкодзіў замкі вітрын і выкраў з іх залатыя ювелірныя вырабы на суму каля 200 мільёнаў беларускіх рублёў. Як расказалі ў групе інфармацыі і сувязяў з грамадскасцю ўпраўлення Следчага камітэта РБ па Гомельскай вобласці, падазронага мужчыну каля складскога памяшкання заўважылі супрацоўніцы ўстановы, якая размешчана побач з крамай. Яны і выклікалі міліцыю. Зараз праводзяцца аператыўна-вышуковыя і следчыя мерапрыемствы па ўстанаўленні асобы злачынцы. Петрыкаўскім раённым аддзелам Следчага камітэта Рэспублікі Беларусь заведзена крымінальная справа па факце крадзяжу ў асабліва буйным памеры.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**

### Гродзеншчына

#### НЕ СТРАЦІЦЬ ВЕРЫ Ў ЦУД

**Удзельнікі акцыі «Каляды ў Элізы Ажэшкі» ў Гродне выканалі жаданні 350 дзяцей-інвалідаў і сірот**

Акцыя праводзілася з 17 снежня 2012-га па 11 студзеня гэтага года ў Гродне, паведаміла карэспандэнту **БЕЛТА** дырэктар Гродзенскага абласнога аддзялення Беларускага дзіцячага фонду Таццяна Чарвякова.

Падчас дабрачыннай акцыі адбыліся розныя мерапрыемствы, якія дазволілі акунуцца ў калядныя дні канца XIX — пачатку XX стагоддзя і пазнаёміцца з жыццём, сучаснікамі і актыўнай дабрачыннай дзейнасцю вядомай пісьменніцы, ураджэнкі Гродзеншчыны Элізы Ажэшкі. Былі праведзены ёлкі для дзяцей-сірот і інвалідаў, канцэрт з удзелам вядучых гродзенскіх калектываў, сустрэчы ў доме-музеі пісьменніцы, вернісаж дзіцячых малюнкаў, аўкцыён карцін гродзенскіх мастакоў. Студэнты-валанцёры працавалі ў буйных гандлёвых цэнтрах, прапаноўваючы ўсім ахвотным далучыцца да акцыі.

Для дзяцей-сірот і інвалідаў удалося сабраць за час акцыі больш за 66 млн рублёў. Гэта ахвяраванні грамадзян, храмаў, даход ад рэалізацыі карцін мастакоў на аўкцыёне. Набытыя на іх падарункі ўручаны дзецям на мерапрыемствах, якія праводзіліся ў рамках акцыі.

#### АДКУЛЬ ЖАНІХІ?

**З 1344 зарэгістраваных летась у Гродне шлюбаў 109 — з замежнымі грамадзянамі**

Па адрасах заморскіх «прынцаў», якія бяруць у жонкі гродзенскіх дзяўчат, можна вывучаць геаграфію. Яны родам амаль з пяцідзесяці краін свету.

— Найбольш часта рэгіструем шлюбы з грамадзянамі Расіі, Украіны, Германіі, Польшчы, — расказвае дырэктар Дома грамадзянскіх абрадаў Гродзенскага гарвыканкама Галіна Казакова. — Менш прадстаўнікоў Аўстрыі, Швецыі, Швейцарыі, Аўстраліі, Іарданіі, Нігерыі, Марока, Маўрытаніі, Лівіі, Лівана... Рэдкія жаніхі каўказскай нацыянальнасці. Толькі ў снежні ў якасці жаніхоў былі грэкі, італьянцы, французы, сірыйцы.

**Сяргей ДРУЖЧЫЦ.**

### Магілёўшчына

#### АНТЫВАНДАЛЬНЫЯ ПАШТОВЫЯ СКРЫНІ

**Магілёўскае адкрытае акцыянернае таварыства «Ольса» стала выпрабляць новую прадукцыю, якая замяшчае імпарт і адпавядае сучасным патрабаванням**



Паштовыя скрыні «новага пакалення» застрахаваны не толькі ад узлому і хуліганскага падпалу, але ад смецця і друкаванага «спаму» — рэкламнай прадукцыі, якую кідаюць для жыхароў без разбору. Канструкцыя скрыні прадугледжвае два ключы: адзін ад уласнай секцыі — для гаспадара, а іншы ад агульнай дзверцы — для паштальёна. Знешні выгляд таксама задаволіць спажыўцоў: палімернае пакрыццё абараняе ад драпін.

Антывандальныя паштовыя скрыні карыстаюцца попытам: іх набываюць арганізацыі, якія ўсталёўваюць такія скрыні ў новабудоўлях Магілёва. Аднак і кожны жылец, заклапочаны захаванасцю сваёй пошты, можа набыць, у кааперацыі з суседзямі, секцыю скрыняў. У фірменнай краме «Ольсы» чатыры секцыі каштуюць каля 400 тысяч рублёў, шэсць — 535 тысяч рублёў.

**Ілона ІВАНОВА.**

#### НЕ ПЛАЦІШ АЛІМЕНТЫ — НЕ СЯДЗЕШ У АЎТО...

**Аліментшчыкаў у Магілёве абмяжоўваюць у праве кіравання аўтамабілем**

Магілёўскіх аліментшчыкаў з-за запазычанасці пазбаўляюць маёмасці і абмяжоўваюць у праве кіравання аўтамабілем. Судовыя выканаўцы нярэдка звяртаюцца да гэтых мер уздзеяння на бацькоў, якія ўхіляюцца ад утрымання сваіх непаўналетніх дзяцей.

Толькі ў Ленінскім раёне Магілёва налічваецца каля 1300 беспрацоўных аліментшчыкаў. Большасць з іх добрасумленна плаціць аліменты. Але ёсць і тыя, хто знаходзіцца ў вышуку. Адной з самых хуткадзейных мер, якія вымушаюць неплацельшчыка неадкладна пагасіць доўг, прызнана абмежаванне ў праве кіравання аўтамабіля.

Як лічыць старшы судовы выканаўца суда Ленінскага раёна Магілёва Ірына Сабалькова, гэта вельмі дзейсная мера: «Мы робім запыт у ДАІ. Калі высвятляецца, што ў чалавека ёсць вадзіцельскае пасведчанне і адначасова вялікая запазычанасць па аліментах, то ў суда ёсць падстава вырашаць пытанне аб канфіскацыі вадзіцельскага пасведчання — гэта значыць, часова абмяжоўваць. Вельмі дзейсная мера», — адзначыла яна.

**Антон ЗАПОЛЬСКІ.**

### Міншчына

#### ТРАКТАР ЯК ТВОР МАСТАЦТВА

**У Крупках упершыню прымаюць незвычайную выставу скульптур**

Яе аўтар — вядомы сталічны майстар каменя і пэндзля Эдуард Астаф'еў. У экспазіцыі — 25 работ. Творы выкананыя ў розных тэхніках. Матэрыял — бронза, сталь, алюміній, камень і дрэва. Характэрная асаблівасць кампазіцый — выкарыстанне самых розных дэталяў ад сельскагаспадарчай тэхнікі. Прадстаўленыя на выставе скульптуры — гэта толькі невялікая частка работ аўтара. Сёння творы Эдуарда Барысавіча знаходзяцца як у музеях Беларусі, так і ў прыватных замежных калекцыях.

**Міхась ФІРСАЎ.**

# «ТРЭБА ЖЫЦЬ, А НЕ ДАЖЫВАЦЬ»



*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

**Рана сышлі бацькі,** якія мелі патрэбу ў тваёй прысутнасці, а ты так часта быў заняты... Толькі цяпер, калі іх ужо не стала, я пачынаю разумець, што было галоўным у той момант, што другасным. Таму работа ў хоспісе — гэта ў нейкай ступені і патрэба аддаць тое, што не дадала сваім бацькам. Магчыма, гэта гучыць некалькі эгаістычна, але гэта так.

**Самае складанае** (было і застаецца) — гэта знайсці людзей, якія не пагубяць тое, што зроблена. Я не толькі галоўны ўрач, але і галоўны пазаштатны спецыяліст Міністэрства аховы здароўя па паліятыўнай медыцыне. Бачу, з якімі цяжкасцямі сутыкаюцца кіраўнікі новых структур паліятыўнай дапамогі. Там, дзе няма матору — чалавека, які гарыць гэтай справай, — пустыня. Так, ёсць нарматыўныя дакументы, набор медыкаментаў, але няма самага галоўнага — няма філасофіі ў аказанні дапамогі, каманднага духу, цеплыні.

**На днях** да мяне прыходзіў сын нашага пацыента. Ён сказаў: «Тое, што ёсць хоспіс, — гэта проста цуд. У вас тут працуюць сапраўдныя анёлы. Калі ў наш дом прыйшла доктар Ала Аляксееўна са сваімі медсёстрамі (гаворка ідзе пра выязную службу) — адразу ўсё памянялася, стала неяк цёпла, настрой з'явіўся. Яна, здаецца, яшчэ нічога і не зрабіла, нават лекі не паспела прызначыць, а ўжо ўсё памянялася». Такія словы дарагога каштуюць.

**У хоспіс часцей за ўсё** супрацоўнікаў і валанцёраў Гасподзь прыводзіць сам. Гэта ў большасці выпадкаў людзі, якія перажылі страту, якія ведаюць, што і ў якую хвіліну трэба сказаць пацыенту і яго блізкім. Мне нават здаецца, што людзі без жыццёвага вопыту не маюць маральнага права суцяшаць чалавека, у якога памірае маці ці дзіця. Менавіта таму, пэўна, у хоспісе затрымліваюцца пераважна людзі пенсійнага ўзросту, хоць гэта і цяжкая работа. Часам факт прысутнасці чалавека, які мае вопыт, дзейнічае лепш, чым таблетка.

**На жаль,** такія якасці, як духоўнасць і міласэрнасць, апошнім часам прытупляюцца, страчваюцца. Такое адчуванне, што чалавечая цеплыня ўступіла ў эру збеГражэння. Людзі развучыліся аддаваць, дзяліцца...

### Пра афіцыёз, славянскі менталітэт і эўтаназію

**Галоўны ўрач у хоспісе** не можа быць проста адміністратарам. Гэта нерэальна. Само сабой, я ведаю ўсіх хворых, гісторыі іх хваробы, іх праблемы і патрэбнасці. Штодзень па некалькі разоў падымаюся наверх і гляджу, што адбываецца ў палатах. Кантактую са сваякамі пацыентаў. Праводжу кансультацыі па складаных выпадках. Хоспіс адрозніваецца ад клінік тым, што тут менш афіцыёзу.

**Каб аблегчыць фізічны боль** пацыента, сёння не трэба вынаходзіць веласіпед. Дастаткова проста пераняць еўрапейскі вопыт, чым мы і займаемся. А вось што тычыцца падыходаў у заходняй псіхаанкалогіі (зрабіць так, каб пацыент адчуваў сябе камфортна духоўна і псіхалагічна), то яны не зусім укладваюцца на наш славянскі менталітэт. Нам бліжэй хрысціянская ідэя, бо мы на ёй выраслі. Таму вось гэты духоўны, псіхалагічны аспект паліятыўнай медыцыны мы павінны сфарміраваць самі.

**На заканадаўчым узроўні** назіраюцца сур'ёзныя зрухі. Унесены змяненні ў праект закона аб ахове здароўя, дзе паліятыўная медыцына выдзелена як асобны від меддапамогі. На гэтым спыняцца не збіраемся, ёсць яшчэ над чым працаваць.

**За мяжой** пераважна ўсе хоспісы — прыватныя некамерцыйныя арганізацыі. І яны прапаноўваюць дзяржаве свае паслугі па аказанні дапамогі невылечна хворым на конкурснай аснове. Спадзяюся, што і мы з часам да гэтага прыйдзем.

**Не падзяляю** поглядаў тых людзей, якія прапаноўваюць заканадаўча замацаваць эўтаназію: маўляў, навошта чалавеку мучыцца, давайце дапаможам яму памерці. Я — праваслаўная хрысціянка. Лічу, што ў Божыя справы нельга ўмешвацца. Гэта не наш узровень.

### Пра кухонную плітку, каратэ і тры вуглы

**На працы** мне пастаянна даводзіцца прымаць рашэнні. І гэта на аўтамаце роўненька трансфармуецца ў сям'ю. Пастаянна чую пытанне: «Дык што мы будзем рабіць? Дык як мы гэта будзем рабіць?» (*смяецца*). А часам так хочацца, каб хто-небудзь за цябе вырашыў, якую плітку выбраць на кухню ці ў які колер пафарбаваць сцены.

**У кожнага чалавека** па законе аб трох вуглах павінна быць тры кропкі апоры. Першая — сям'я, другая — праца, трэцяя — хобі. І калі ты адмаўляеш нейкую з кропак — гэта дрэнна. Нездарма кажуць: не загаsuccessive сябе ў вугал. Што тычыцца хобі, то псіхолагі рэкамендуюць, калі табе не прывілі яго з дзяцінства, насаджваць яго штучна. І я з імі згодна. У кожнага чалавека павінен быць любімы занятак для душы. У школьныя гады я займалася каратэ.



**Мне падабаецца** нешта рабіць рукамі. Як бы дзіўна гэта ні гучала — палоць градкі. Хоць да 30 гадоў мяне на агарод было не загнаць. Некалі вельмі шмат вязала. Гэта, хутчэй, ад безвыходнасці. Час быў такі дэфіцытны, у краме нічога нельга было купіць. Таму для сваёй Дашкі (дачкі) вопратку вязала ўласнымі рукамі.

**Шмат чытаю,** у тым ліку і спецыяльную літаратуру. Вельмі люблю Маэма — мастака чалавечых душ. Наогул самае цікавае для мяне — гэта пазнанне чалавечай душы.

### Пра цуды, блакітныя вочы і падушку бяспекі

**У мяне часта пытаюцца:** «Воля, як у цябе атрымліваецца, працуючы ў хоспісе, заставацца аптымісткай?». А я не проста аптыміст, я філосаф-аптыміст. Вельмі люблю жыццё. Але пры гэтым разумею, што ўсе мы на гэтай зямлі госці. Жыццё не можа быць без смерці, як не можа быць цень без святла, ці святло без ценю.

**Не перастаю верыць** у цуды. Пацыенты, якім аднойчы быў пастаўлены дыягназ «рак», і 10, і 15 гадоў на маіх вачах жывуць. Яны ўжо забыліся, што ў іх было гэтае захворванне. І дай Бог, каб яно не вярнулася ніколі.

**Калі пацыента нельга вылечыць,** гэта не значыць, што для яго нічога нельга зрабіць. Тое, што падаецца дробяззю здароваму чалавеку — для невылечна хворага мае велізарны сэнс. Для такіх людзей увага, добрае слова, усмешка ці такія элементарныя рэчы, як паштоўка ці ліст, даражэйшыя за самы дарагі пярсцёнак з брыльянтам. Пераацэнка каштоўнасцяў адбываецца. Адзін наш пацыент толькі напрыканцы жыцця ўпершыню ўбачыў, што ў жонкі блакітныя вочы. Усё жыццё лічыў, што яны ў яе шэрыя...

**Не ўяўляю сябе без** сваёй працы. Калі нешта раблю, то пагружаюся ў тэму цалкам. Атрымліваю задавальненне ад таго, што магу нечым дапамагчы пацыентам і іх сваякам. Мае хатнія проста змірыліся з гэтым. Хоць часам у нашым доме жартам гучыць нешта накшталт: «Я ўтаплю твой тэлефон ва ўнітазе» (*смяецца*).

**У мяне цудоўная сям'я.** З намі вось ужо 11 гадоў жыве ратвейлер. Дана вельмі разумная, за дзецьмі дапамагала прыглядаць, калі яны былі маленькімі. Але апошнім часам наша любіміца моцна захварэла, таму ў мяне дома цяпер сабачы міні-хоспіс.

**Мая дачка** вучыцца ў медуніверсітэце. Думаю, з яе атрымаецца талковы ўрач. У Дашы былі думкі: «Давай я таксама буду ў хоспісе працаваць». Але я пакуль катэгарычна супраць. Гэты выбар павінен стаць свядомым. Каб працаваць у хоспісе, трэба мець падушку бяспекі са сваіх уласных жыццёвых поглядаў. Нельга жыць поглядамі некага, жыць нечым вопытам. Я маю на ўвазе паліятыўную медыцыну, а не кажу пра медыцыну наогул.

**Анкалагічна хворых становіцца больш,** але гэта зусім не значыць, што ў той жа прагрэсіі расце смяротнасць ад гэтага захворвання. Проста цяпер сталі лепш і больш дыягнаставаць, выяўляць рак на больш ранніх стадыях. Як бы ні лаялі медыцыну, усё ж такі лячыць анкалогію сталі нашмат лепш, чым гэта было 10 і 20 гадоў таму.

**Кожны саракавы чалавек** у Мінску — анкахворы. Згодна з нарматывамі, якія вывела Еўрапейская асацыяцыя паліятыўнай дапамогі, на 1 млн жыхароў павінна быць 80-100 ложкаў. Атрымліваецца, што калі ў Мінску ў сярэднім 1,5 млн дарослага насельніцтва, то павінна быць недзе 150 ложкаў. Сёння ў нас, з улікам нашага хоспіса і іншых структурных падраздзяленняў, 78 ложкаў. Але ці трэба іх больш? Недарэмна ж кажуць: «Тое, што для немца добра, для рускага — смерць». Для нашых людзей больш прымальнай з'яўляецца форма арганізацыі дапамогі дома, калі пацыент апошнія дні праводзіць у родных сценах. Таму праблема не столькі ў колькасці хоспісаў, а ў недахопе кваліфікаваных урачоў і медсёстраў для працы з невылечна хворымі.

**І як жанчына, і як урач** я мару з'ездзіць у адпачынак. На мора, рэчку, возера... Туды, дзе ёсць вада, бо для мяне адпачынак без вады — гэта не адпачынак. Але гэта вельмі простае жаданне... Калі пра вялікае... То мару, каб людзі не хварэлі на анкалогію. Ці, калі ўжо захварэлі, каб іх смерць была не пакутлівай. Хочацца, каб чалавек не толькі нараджаўся, але і сыходзіў з гэтага свету годна.

**Надзея ДРЫЛА**

Фотаздымкі Надзеі БУЖАН.



#### ТРЫ ПЫТАННІ ВОЛЬЗЕ МЫЧКО СА ЗНАКАМІТАГА АПЫТАЛЬНІКА МАРСЕЛЯ ПРУСТА

**— Якасці, якія вы больш за ўсё цэніце ў мужчыне?**

— Розум і адказнасць.

**— Якасці, якія вы больш за ўсё цэніце ў жанчыне?**

— Розум і дабрыню. Як і ў мужчынах, так і жанчынах цаню не столькі розум, колькі мудрасць. Бо выдасканалены розум не заўсёды нясе пазітыў і дабрыню.

**— Што вы лічыце самым вялікім няшчасцем?**

— Духоўную смерць, адсутнасць усялякіх жаданняў, адзіноту. Калі ты нічога не хочаш і нікому не патрэбны.

## ■ Фестывалі

# «КАЛІ Ў ДУШЫ ЗАСТАЕЦЦА ТОЛЬКІ МУЗЫКА...»

**Фэст класічнай музыкі «Студзеньскія музычныя вечары» — гэта як глыток паветра, якога прагла душа пасля чарады свят з аднатыпнай тэлевізійнай эстрадай. 25-ы раз у Брэсцкім акадэмічным тэатры драмы сабраліся аматары высокага мастацтва і музыканты, выканаўцы, сярод якіх ёсць сусветныя імёны.**

Фота Валерыя КАРАЛЯ.



Святаслаў БЭЛЗА

Не, брэсцкія «Вечары» — не мястэчковы фестываль. Пра гэта гаварылі знакамітыя госці. Знаёмы мільёнам мастацтвазнаўца і тэлевядучы Святаслаў Бэлза паведаміў са сцэны, што пра брэсцкі фэст яму з асаблівай пяшчотай расказваў Зураб Саткілава. Сам Святаслаў Ігаравіч, як аказалася, у нашым горадзе не бываў раней. Таму запрашэнне прыняў як магчымасць «запоўніць прабел у сваёй біяграфіі». Маэстра канферансу паведаміў цікавыя падрабязнасці нам жа пра наш горад. У свой час Брэст-Літоўск наведаў Міхаіл Глінка і пакінуў пра тое свае ўспаміны. А вялікі Рахманінаў па дарозе ў Варшаву спыняўся ў Брэсце і даваў вялікі канцэрт сто гадоў таму.

А вось Святаслаў Рыхтэр бываў у Брэсце ажно 18 разоў. І не без яго блаславення тут прапісаўся такі цудоўны фестываль, куды едуць «зоркі» сусветнай велічыні. Некаторыя музыканты і оперныя выканаўцы выступалі на студзеньскіх канцэртах па тры, чатыры, а то і больш разоў. Вось ужо трэці раз дарыў сваё мастацтва італьянскі флейтыст Антоніа Амедуні, які з першага выступлення закахаў у сябе брэсцкіх слухачак. Сумнавата-задуменны флейтыст з вытанчанай знешнасцю і добрымі вачыма прымушае сачыць за сваёй флейтай з заміраннем сэрца. Гэта якраз той выпадак, пра які сказала дырэктар фестывалю Лілія Батырава: «...Калі ў душы застаецца толькі музыка і нічога, акрамя музыкі».

Апошняе прыходзіць на памяць, калі слухаеш бліскучую грузінскую скрыпачку Ліяну Ісакадзэ. Беларуская піяністка Жанна Варламава так ахарактарызавала самазабыўную ігру Ліяны: «Гэта яе споведзь». Пра асобныя вехі біяграфіі народнай артысткі СССР публіцы за хвіліну да выступлення скрыпачкі расказаў Святаслаў Бэлза. Яна была дзіцём-вундэркіндам. Ужо ў сем гадоў давала паспяховыя канцэрты. У васямнаццаць, студэнткай 2 курса кансерваторыі, стала лаўрэатам міжнароднага конкурсу ў Парыжы. Затым — шэраг новых перамог. Вучаніца Давіда Ойстраха з трыумфам выступала ва ўсім свеце. А 20 гадоў таму адкрыла ў Германіі Акадэмію струнных інструментаў. Там яна перадае свае майстэрства юным музыкантам.

Ліяна Ісакадзэ разам з аркестрам Белдзяржфілармоніі пад кіраўніцтвам Аляксандра Анісімава выканала канцэрт для скрыпкі з аркестрам П.І. Чайкоўскага. Пасля выступлення яна сказала журналістам:

— Я ніколі не рабіла кар'еру. Усё атрымлівалася само сабой. Я толькі сумленна выконваю сваю місію, якая дадзена мне вышэй. А жыць трэба так, каб ніхто не абрэзаў вам крылы!

Пасля выступлення юнага віртуоза з Літвы Крысціёнаса Мегелінскаса верылася, што на змену старэйшаму пакаленню падрастае новае, якому сапраўды крылы ніхто не падрэжа. Хлопчык пасля паўгадзіннай рэпетыцыі здолеў сыграцца з Львоўскім аркестрам «Акадэмія» і выканаў канцэрт Роўлі ў трох частках. Раяль падпарадкоўваўся яму, нібы сталаму мэтру.

Амаль гадзіну працягвалася выкананне твора італьянскага кампазітара Пергалезі. І гэта былі незабыўныя ўражанні. Дзяржаўны акадэмічны сімфанічны аркестр Белдзяржфілармоніі пад кіраўніцтвам Аляксандра Анісімава ажыццявіў грандыёзны праект разам з дзіцячым хорам музычнай школы №10 Мінска, а таксама салісткамі Пермскага акадэмічнага тэатра оперы і балета Надзеяй Бабінцавай і Ірынай Крыкуновай.

На гэты раз удзельнікам «Вечароў», акрамя традыцыйных дыпломаў, уручалі яшчэ сувеніры-статуэткі. А тых, хто выступаў шмат разоў, Лілія Батырава аб'яўляла ганаровымі ўдзельнікамі. Дык вось высветлілася, што самым адданым удзельнікам «Вечароў» стаў народны артыст Беларусі, піяніст Ігар Алоўнікаў. Ён выступаў на дванаццаці фестывалях.

**Святлана ЯСКЕВІЧ**

## ■ Расклад на заўтра

# «Дарагая» мая фізіка!

**Згодна з Праграмай развіцця агульнай сярэдняй адукацыі на 2007-2016 гады, на аснашчэнне вучэбных кабінетаў фізікі ў беларускіх школах прадугледжана выдаткаваць у 2013 годзе 150 млрд рублёў. Міністэрствам адукацыі вызначаны 222 установы агульнай сярэдняй адукацыі, у якіх плануецца поўнасцю абсталяваць кабінеты фізікі ў новым годзе.**

Ва ўдзельнікаў навукова-метадычнага семінара «Фізіка ў школе: стан, праблемы, перспектывы», які прайшоў у пачатку студзеня ў Нацыянальным інстытуце адукацыі, была магчымасць здзейсніць віртуальную экскурсію па будучым кабінеце фізікі. Уся камплектацыя кабінета будзе ажыццяўляцца па прынцыпе «ад разеткі да штор». Спецыялістамі Нацыянальнага інстытута адукацыі быў распрацаваны пералік адпаведных прыбораў і інструментарыю, які павінен быць прадстаўлены ў сучасным кабінеце фізікі.

Плануецца, што «абноўленыя» кабінеты фізікі будуць аснашчаны інтэрактыўнай дошкай, праектарам, маркернай (мабільнай) дошкай, камп'ютарнай тэхнікай, вэб-камерай, лічбавай камерай, сучасным тэлевізарам. У кабінеце будзе зручны настаўніцкі стол, які сумяшчаецца з дэманстрацыйным, корпусная мэбля для наглядных і дыдактычных матэрыялаў. На вокнах абавязкова ўсталююць зацямненне. Таксама ў новым кабінеце будзе і новая сучасная лабаранцкая з капіравальным апаратам, сканерам і прынтарам, дзе знойдзецца месца і для абсталявання для ўрокаў астраноміі. Тэлескопамі плануюць аснасціць усе 222 школы. Прадугледжваецца месца і для набораў для лабараторных і практычных работ. Фактычна гэтыя кабінеты будуць выконваць функцыю рэсурсных цэнтраў. Кошт поўнай камплектацыі такога кабінета складае больш за 40 тысяч долараў.

Згодна з Праграмай развіцця агульнай сярэдняй адукацыі на 2007-2016 гады, з 2014 па 2016 год на аснашчэнне кабінетаў фізікі, хіміі і біялогіі прадугледжана выдаткоўваць па 475,5 млрд штогод. Не сакрэт, што нярэдка менавіта практычны тур становіцца сур'ёзнай перашкодай для беларускіх школьнікаў на міжнародных алімпіядах па вучэбных дысцыплінах. Напрыклад, на сёлетняй міжнароднай алімпіядзе па хіміі пры выкананні першага задання ад школьнікаў патрабавалася вывучыць хуткасць рэакцыі ўзаемадзеяння звычайнага і дэйтэрыраванага ацэтону. Уся справа ў тым, што дэйтэрыраваныя спалучэнні вельмі рэдкія і вельмі дарагія. Тым не менш кожнаму ўдзельніку алімпіяды было прадастаўлена па 3 мілілітры такога спалучэння.

**Надзея НІКАЛАЕВА**

## ■ Факт

# Кіроўцы парушаюць правілы часцей, чым пешаходы

**У мінулым годзе ў сталіцы па віне кіроўцаў учынена 614 аўтааварый. Кіроўцы транспартных сродкаў часцей, чым пешаходы, парушаюць правілы дарожнага руху і, як вынік, становяцца ўдзельнікамі дарожна-транспартных здарэнняў.**

Як паведамілі ў ДАІ ГУУС Мінгарвыканкама, у 2012 годзе ў сталіцы па віне кіроўцаў учынена 614 аўтааварый, што складае 76,3% ад агульнай колькасці ДТЗ. У выніку гэтых здарэнняў загінулі 40 і атрымалі траўмы 750 чалавек. Летась 219 наездаў на пешаходаў аўтамабілісты ўчынілі на абазначаных пешаходных пераходах (якія рэгулююцца і не рэгулююцца). У выніку загінулі 13 і траўмаваны 215 чалавек. Па віне пешаходаў у Мінску здарылася 149 дарожна-транспартных здарэнняў, у якіх загінулі 30 чалавек і яшчэ 121 атрымаў раненні. У ДАІ таксама назвалі асноўныя прычыны ўчынення ДТЗ: парушэнне кіроўцамі правілаў праезду пешаходных пераходаў, праезду скрыжаванняў, манеўравання, парушэнне хуткасных рэжымаў руху.

**«Мінск-Навіны»**

Наш культурны асяродак

# Жырандоля

Выпуск № 2 (172)

■ Прэм'ера

## АСОЛЬ, РАМАНТЫЧНАЯ ДЗЯЎЧЫНА. ПА-БЕЛАРУСКУ РАМАНТЫЧНАЯ...

### У музычным тэатры створаны балет айчыннага аўтара

**І паспрабуйце прыдрацца: Аляксандр Грын мае беларускія карані. Хоць і нарадзіўся ў Расіі, у Вяцкай губерні. Але як туды патрапіў яго тата, шляхціц Стэфан Грынявіцкі, народжаны ў некалі Віленскай губерні ў 1843 годзе? Гэта ж колькі яму было падчас паўстання Каліноўскага? Гадоў 20 — самы ўзрост для высокіх учынкаў і высакародных мар. Вось за іх і расплаціўся, стаўшы ўдзельнікам паўстання, атрымаў у пакаранне высылку спачатку ў Томскую губерню, потым у Вяцкую. А ў 1880 годзе ў сям'і Грынявіцкіх нарадзіўся сын Аляксандр. І вось мяркуйце, у каго ён пайшоў такім рамантызмам і імкненнем да высокіх пачуццяў, якія выдатным чынам увасоблены ў «Пунсовых ветразях». Твор, які не абыходзяць увагай людзі ў перыяд станаўлення асобы, і які любяць асобы, чыя душа не змярцвела пад цяжарам жыццёвых клопатаў, можа, таму, што неверагодна жывымі былі юнацкія мары пра шчырасць і здзяйсненне надзей. Што да беларусаў, то мары — хіба не сутнасць натуры?..**

Цяпер вам зразумела, чаму на сцэне Беларускага музычнага тэатра ўвасоблены гэты твор? Насамрэч прычын шмат, з якіх галоўная ўсё-такі творчая. У кампазітара Уладзіміра Саўчыка нарадзіўся музычны вобраз закаханай і пяшчотнай Асоль, якая вельмі цікаўная, пазнае свет, адкрытая яму. Натуральна, калі захапіцца гэтай дзяўчынай праз кнігу, то забыць пра яе немагчыма, а тым больш творчаму чалавеку. Нездарма на тэму «Пунсовых ветразяў» было створана вельмі шмат мастацкіх твораў ад музыкі да кіно. А беларускі кампазітар Саўчык захацеў сказаць сваё слова. Ну і выдатна!

Яму пашчасціла не проста выказацца. Яму пашчасціла быць пачутым. Таму што яго музыка цяпер загучыць перад публікай, якая будзе прыходзіць на балет. Яго паставіў народны артыст Беларусі Уладзімір Іваноў, які ў творы Грына адчуў вялікую энергетыку і стараўся перавесці яе на мову рухаў. Галоўнае ў гэтым балеце — нават не сама мара, якая ўвасоблена ў пунсовыя ветразі (гэты сімвал, можа, ужо і надакучыў). Галоўныя — самі героі, іх характары, паводзіны, матывы ўчынкаў. Адпаведна пабудаваны сюжэты двух актаў, на якія падзелены балет. У першым — перад гледачом свет Асоль, якая зацікавіла сваёй непасрэднасцю апавядальніка. У другой дзеі — свет Грэя, які насамрэч не такі ўжо беззаганны рамантычны герой, а, наадварот, чалавек, які ў жыцці паспрабаваў шмат, прычым не заўсёды добрага: ён гулец у карты, ён гулец па жыцці (бо прамотвае бацькоўскую спадчыну). Яго паматала жыццё. І можа быць, таму каханне да Асоль — гэта яго ратаванне, прыстанак душы, надзея на іншае жыццё. А мы ўсё прывыклі: «Дачакалася свайго Грэя...» Можа, наадварот, — ён яе знайшоў? І як яму пашчасціла!..

Прынамсі, калі ёсць пра што разважаць, то справа зроблена недарма. Прэм'ера балета адбываецца менавіта ў гэтыя дні, якія вельмі напоўнены марамі і надзеямі. Што якраз дарэчы.

**Ларыса ЦІМОШЫК**

■ Юбілей

## «Дзе-Я?» па-новаму

Напрыканцы мінулага года Новы драматычны тэатр Мінска зафіксаваў свой невялікі юбілей — 20 гадоў існавання. Можа, нехта здзівіцца: назва ж «Новы драматычны» на тэатральнай мапе сталіцы з'явілася зусім нядаўна. Але насамрэч даволі смелы тэатр у спальным раёне Мінска адкрыўся і існаваў зусім пад іншай назвай: «Дзе-Я?» Яго тагачасны кіраўнік Мікола Трухан прыклаў шмат намаганняў, каб тэатр, які стварыўся на хвалі ўздыму самасвядомасці і ў час пошуку адказаў на пытанні (у 1987-м годзе), працягваў сваё існаванне з пэўным статусам. Гарадскім тэатрам «Дзе-Я?» стаў у 1992 годзе. Гэты былі гады, калі тэатр дапамагаў людзям шукаць шлях да саміх сябе. «Дзе-я?» Трухана ў гэтым вылучалася: ён не імкнуўся забаўляць, а запрашаў разважаць, прычым на беларускай мове. Але жыццё рэжысёра, які, можа, не заўсёды і не ўсім быў зразумелы ў пошуках новых сэнсаў і формаў, абарвалася заўчасна.

А тэатр, створаны ім, застаўся. Імкнуўся жыць, шукаць, мяняцца ў адпаведнасці з часам. Імкнуўся быць больш зразумелым і прывабным для самага рознага гледача. Атрымаў назву — Новы драматычны тэатр Мінска. Сапраўды, па сутнасці, гэты тэатр стаў іншым. Новым. Спектаклі ствараліся не толькі паводле твораў беларускіх аўтараў, але і расійскіх, і сусветных драматургаў. Але тэатральныя адкрыцці нават у нашай краіне Новы драматычны працягваў дарыць: «Чароўная скрыпка» Алеся Гаруна была пастаўлена менавіта тут. І па-ранейшаму ён гатовы супрацоўнічаць з сучаснымі беларускімі аўтарамі. Напрыклад, за мінулы год у пастаноўцы Дзяніса Нупрэйчыка выйшлі спектаклі «Мудрамер» паводле М. Матукоўскага і «Яблычны пірог» Д. Балыка. А гэты год Новы драматычны пачаў з прэм'еры балгарскай «Казкі пра чатырох блізнят» П. Панчава ў пастаноўцы Святланы Навумавай. Нешта новае ў новым павінна радаваць як дарослых, так і дзяцей.

**Ларыса ЦІМОШЫК**

■ Кінакрокі

## НЯЗГАСНАЕ КІНО

### Ёсць фільмы, якія больш чым проста фільмы

**Чым далей, тым дакументальнае кіно мне пачынае падабацца значна больш, чым мастацкае. У сённяшніх умовах, калі любое мастацтва, у прынцыпе, пазычае ў жыцця тэмы, ідэі, імпульсы і імкнецца да найбольшай праўдападобнасці (чытай: дакументальнасці), менавіта дакументальнае кіно з'яўляецца найбольш цікавым і шчырым з пункту гледжання пазнання. Гаворка ідзе, вядома, пра ўласна дакументальныя фільмы, а не пра іх аналагі для тэлебачання. Тыя дакументальныя фільмы, якія пакуль што (поруч з анімацыяй) з'яўляюцца тварам і гонарам беларускага кінематографа, наогул. Таму што ў мастацкім кіно, на жаль, мы пакуль не дацягваем — ну, вы разумееце...**



Кадр з дакументальнага фільма Ірыны Волах «Брацкая свечка».

Ёсць фільмы, якія больш чым проста фільмы. У іх, акрамя кіно, ёсць яшчэ душа і звышзадача. Яны патрэбныя ў тым ліку дзеля таго, каб... памяталі. Такія фільмы цікавыя не толькі кінааматарам і, уласна, самім кінематаграфістам, але і прафесіяналам вузкіх спецыяльнасцяў. Напрыклад, этнографам і гісторыкам.

Так і новая дакументальная стужка «Брацкая свечка», зробленая на студыі імя святога Іаана Воіна (рэж. Ірына Волах, сцэн. Вольга Лабачэўская, апер. Аляксандра Мяснікова). Фільм распавядае пра старадаўні абрад «Брацкая свечка», традыцыі якога, як мяркуюць этнографы, узыходзяць ажно да XVI стагоддзя. Гэты абрад мала дзе захаваўся на Беларусі. Але вось жыхары вёскі Лука Столінскага раёна, што на Палессі, захоўваюць завядзёнку продкаў. Як многія простыя людзі, яны і самі не могуць патлумачыць, навошта ён, той абрад, патрэбны. Проста, маўляў, так прынята. Але ў гэтым «так прынята» якраз і знаходзіцца квінтэсэнцыя беларускага духу. І менавіта яны, простыя вясковыя людзі, яшчэ з'яўляюцца захавальнікамі нашай спадчыны, якая так імкліва знікае, не адлюстраваная ні ў літаратуры, ні ў кіно, ні ў СМІ...

У вёсцы Лука сям'я Мікалая Пешкі «адказвае» за жыццяздольнасць абраду. Раз у два гады напярэдадні Шчадраца Мікалай Цімафеевіч выпраўляецца па суседзях збіраць грошы на свечкі — хто колькі дасць. На сабраныя грошы Пешкі купляюць воск. Потым цэлай кагортай збіраюцца мужчыны з вёскі. І зладжана, кожны ўсведамляючы сваю функцыю ў сакральным працэсе вырабу свечкі, ствараюць два калектыўныя цуды — дзве свечкі. Потым гэтыя свечкі вязуць у храм у суседняй вёсцы Гарадняны. Там свечкі гараць за спачын і здароўе. І хапае іх на два гады. Які-небудзь прасунуты культуролаг без агляднкі назваў бы гэтыя свечкі творамі мастацтва. І сапраўды чаму не! Гэта і ёсць творы народнага мастацтва, якія заўжды ствараюцца не дзеля позы (як многае робіцца сёння якраз у сучасным мастацтве), а паводле парыву душы і абавязкова для нейкай практычнай (душэўнай і духоўнай таксама) патрэбы. Свечкі вельмі высокія і важаць да 9 кілаграмаў — сапраўдны вынік супольнай працы. І менавіта гэтая супольнасць мяне асабіста больш за ўсё і ўразіла. Аказваецца, беларусы ўсё яшчэ могуць быць еднымі дзеля дасягнення агульнай мэты...

Стваральнікі фільма — рэжысёр, сцэнарыст і аператар — пражылі ў сям'і Мікалая і Ніны Пешак тыдзень — акурат да Новага года па старым стылі (Шчадрэц). Яны імкнуліся не ўблытвацца ў рэальнасць, за якой назіралі, а проста фіксаваць усё дзеля таго, каб абрад і людзі, якія яго захоўваюць, не былі забыты.

— Год таму мы паехалі ў глыбінку беларускага Палесся, дзе захаваўся старадаўні звычай збіраць і ахвяраваць грошы на агульную свечку, — распавядае **Вольга ЛАБАЧЭЎСКАЯ, аўтар сцэнарыя фільма, кандыдат мастацтвазнаўства, дацэнт кафедры этнаграфіі і фальклору Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў.** — Мы хацелі самі паглядзець, як гэта адбываецца, і расказаць іншым людзям, таму што гэта ўнікальны прыклад саборнай, супольнай працы. Сёння мы амаль усе жывём у сваіх кватэрах і рэдка кантактуем, збіраемся разам. А ў вёсцы Лука людзі падчас абраду «Брацкая свечка» прытрымліваюцца традыцыйнага абшчыннага ўкладу. Яны разам моляць Бога пра дабрабыт, здароўе, шчасце. І робяць сваю супольную ахвяру Богу.

Метад назірання, дынамічны мантаж і доўгія планы, цікавыя ракурсы і адсутнасць музычнага суправаджэння набліжаюць атмасферу фільма да аўтэнтычнай. Быццам ты не на экран глядзіш, а ўдзельнічаеш у працэсе — едзеш збіраць грошы, купляеш воск, клічаш мужыкоў да Адама рабіць свечкі, ідзеш у храм...

**Вольга ЧАЙКОЎСКАЯ.**

***P.S. Яшчэ пра беларускую кінадакументалістыку чытайце ў наступнай «Жырандолі».***

**Ёсць яшчэ некалькі спосабаў паглядзець беларускае дакументальнае кіно.**

**1. Відэатэка Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі.** Там і так сёе-тое было, а якраз кагадзе, як паведамілі на студыі «Летапіс» кінастудыі «Беларусьфільм», відэатэка абнавілася яшчэ 60 беларускімі фільмамі на лічбавых носьбітах.

**2. Інтэрактыўнае тэлебачанне ZALA.** Тут за сімвалічную плату можна паглядзець дакументальныя стужкі Беларускага відэацэнтра і студыі «Летапіс». Прычым база даступных фільмаў увесь час абнаўляецца. Шукайце і знойдзеце!



Кадр з дакументальнага фільма Ірыны Волах «Брацкая свечка».

## КІНО, КАБ ГЛЯДЗЕЦЬ

**Пытанне пра даступнасць беларускага дакументальнага кіно, здаецца, ужо намуляла вока і тым, хто яго задае, і тым, хто спрабуе знайсці адказ. У прынцыпе, у Беларусі ствараецца дастатковая колькасць дакументальных фільмаў, каб хоць час ад часу запаўняць імі, напрыклад, тэлевізійную прастору. Каб гледачы нарэшце мелі ўяўленне пра наша дакументальнае ўсё. Вядома, варта было б зрабіць і рэтраспектыву старых дакументальных стужак па тэлебачанні. Напрыклад, на кінафестывалі «Лістапад-2012» былі цудоўныя спробы паказаць шэдэўры даўняй кінадакументалістыкі, зробленай на студыі «Летапіс». У нас усё ёсць, толькі мы гэта старанна хаваем: кіно, літаратура, нацыянальная годнасць...**

Акурат нядаўна дайшла да мяне інфармацыя, што быццам па кабельным тэлебачанні збіраюцца ладзіць рэтраспектыву беларускіх дакументальных фільмаў. І што самае галоўнае, працяглую, пастаянна паказваць новыя стужкі. Ёсць чаму парадавацца! Але высветлілася, што ўсё не зусім так.

— Пераважную колькасць нашага кантэнту складаюць імпартаваныя з расійскага «24 ДАК» дакументальныя фільмы, — распавядае **Алена ШАНДРАК, вядучы спецыяліст сектара па закупцы кантэнту і развіцця тэлепраграм тэлеканала «Мінск 24 ДАК».** — Што тычыцца чыста беларускага кантэнту, то яго ў нас пакуль не шмат. Зараз гэта ваенна-патрыятычныя фільмы, зробленыя на «Ваен-ТБ». У канцы мінулага года ў нас быў парыў закупіць беларускія кароткаметражныя фільмы, але яны аказаліся надта эксперыментальнымі, і мы пакуль вырашылі лепш асэнсаваць гэтую задуму. Нашаму тэлеканалу было б вельмі цікава паказваць больш беларускай дакументалістыкі. У планах на перспектыву ў нас ёсць падобныя трансляцыі. Мы нават шукалі такія фільмы ў інтэрнэце, але там не так ужо і лёгка натрапіць на нейкую інфармацыю. Мы былі б вельмі ўдзячныя, калі б беларускія вытворцы дакументальных стужак змаглі прыслаць нам спісы сваіх фільмаў. І калі яны будуць падыходзіць нам па фармаце, мы з радасцю пачнём супрацоўніцтва.

Карацей, у Беларусі, як звычайна, самая галоўная праблема ў тым, што кожны сам па сабе. І тэлебачанне хоча паказваць, і фільмы ёсць. Але лёс склаўся так, што... яны ніяк не могуць напаткаць адно аднаго.

## А ПІСАЦЬ ВАРТА НА РОДНАЙ МОВЕ

НА КОНКУРС АПАВЯДАННЯЎ

### Падведзены вынікі конкурсу апавяданняў «Звязды»

**Галоўны з іх: 12 твораў надрукавана на старонках газеты за год. Хто даўно сочыць за нашым конкурсам, той ведае: бывала і больш. Але ж справа ўсё-такі не ў колькасці, а ў якасці напісанага.**

Мала радавацца апавяданню, якое прыходзіць у рэдакцыю, толькі таму, што яно напісана па-беларуску. Хочацца, каб яно несла думку і было напісана па-майстэрску, адлюстроўвала праз вобразы частку сучаснай беларускай рэчаіснасці. А тут ёсць над чым працаваць нашым аўтарам, сярод якіх ёсць прафесійныя літаратары і тыя, хто пачаў пісаць пад уплывам чытання газеты на беларускай мове. У нейкім сэнсе і гэта было мэтай нашага конкурсу: улюбёнасць у родную мову перавесці ў жаданне развіваць яе і дзяліцца сваімі думкамі на беларускай мове з іншымі, казаць пра тое, што турбуе. І трэба прызнаць: тых, хто дасылае свае апавяданні, значна больш, чым тых, хто ў выніку бачыць іх надрукаванымі. Таму што вядучы конкурсу 2012 года Алесь Бадак імкнуўся выбіраць для друку апавяданні, у якіх ёсць зерне, адметнасць, аўтарскі стыль. Дзе ёсць літаратура. Дзе ёсць мастацкі адбітак жыцця. Дзе ёсць вобраз.

Пераможцамі за 2012 год (з грашовай адзнакай) сталі:

**1-я прэмія — Марына Яўсейчык «Сейбіт» (7 красавіка 2012 г.).**

**2-я прэмія — Уладзімір Сцяпан «Дом» (21 лістапада 2012).**

**3-я прэмія — Аляксандр Вашчанка «Апошняе паляванне Марэны» (29 лістапада 2012).**

Спецыяльным дыпломам і памятным падарункам ад «Звязды» ўзнагароджваецца **Навум Гальпяровіч** за апавяданне **«Брат»** (18 жніўня).

Усім нашым пераможцам мы зычым поспехаў і натхнення і запросім іх на ўзнагароджанне, якое неўзабаве адбудзецца ў рэдакцыі. (Удакладніць інфармацыю можна па тэлефоне ў Мінску: 287 18 69 (аддзел культуры) альбо +375296910249 (Velcom).

Дзякуй усім нашым сталым аўтарам, якія не першы год дасылаюць свае апавяданні на конкурс. Дзякуй і ўсім тым, хто проста піша, таму што хоча пісаць па-беларуску, хто гатовы працаваць над сабой далей. Таму што беларуская мова адкрывае прастору для творчасці.

## ХТО ТУТ СМЯЕЦЦА?..

### Паказваць на сцэне сваё, значыць быць заўважаным. Як мінімум

**Але тэатр-студыя кінаакцёра быў адзначаны спецыяльнай прэміяй дзеячам культуры, прапанаваўшы ў мінулым сезоне прэм'еру паводле вядомай, вывучанай, асэнсаванай праз урокі літаратуры і сачыненні калісьці праграмнай п'есы Кандрата Крапівы «Хто смяецца апошнім».**

І вось тут самы час разважаць пра тое, што ёсць той самы беларускі матэрыял у тэатры, навошта, чаму ставіць, як і ці можна інтэрпрэтаваць? І бывае такое, што нам здаецца, нібыта мы пра ўсё сваё добра ведаем і здзівіць нас тут немагчыма. А прыходзім — і дзівімся таму, што некаторыя тэмы і ідэі могуць быць актуальнымі, вобразы — жыццёвымі, а сюжэты — пазнавальнымі. Нават калі на дварэ не 1939 год (калі была напісана п'еса). Не, год напісання, безумоўна, важны. Адразу абмалёўваецца кантэкст, у якім існаваў аўтар і яго акружэнне. Адпаведна, больш зразумелыя яго матывы, ідэі і некаторыя сентэнцыі, нават моўныя абароты (і, безумоўна, сама мова). Але мысленна адкінуўшы часовае, можна выкрышталізаваць вечнае. А вечны — сам чалавек, рысы яго характару, якія фарміруюцца ў залежнасці як ад асабовых характарыстык, выхавання, так і пад уплывам агульнай атмасферы, якая выносіць на паверхню канкрэтныя задачы ў залежнасці ад абставін — для кагосьці гэта проста існаваць, для кагосьці існаваць за кошт іншых, для кагосьці існаваць годна. Хоць шмат што ў п'есе Крапівы можа падавацца сёння наіўным і занадта прамалінейным, але, па вялікім рахунку, усё так і выглядае: можна безліч разоў пераконваць сябе ў тым, што ёсць адценні чорнага, таксама, як і няма бездакорна белага. Але ў выніку ўсё ж мы мысленна хоць бы для сябе робім выснову: дабру ці злу, праўдзе ці няпраўдзе служыць тая ці іншая з'ява, падзея, чалавек. Хоць у дачыненні да людзей і можам дадаваць спагадліва: ніхто не ідэальны... Але ж можна быць не ідэальным, але працаваць над тым, каб ідэальным стаць, а можна і не працаваць і атручваць свет сваімі ўчынкамі. А можна наогул нічога не рабіць, але і гэта не значыць спрыяць дабру.

З гэтага пункту гледжання, Кандрат Крапіва напісаў сапраўды вечны твор — закрануўшы вечную тэму барацьбы са страсцямі і чалавечымі спакусамі, непрымальнымі якасцямі кшталту халуйства, прыстасаванства, жаданне дагадзіць, сквапнасць, зайздрасць, пляткарства. І калі адкінуць у ім эпоху, калі не зважаць на савецкую пафаснасць, то застаюцца персанажы, якіх я, вы ды ўсе мы можам назіраць у жыцці сёння.

Гэта тое, над чым разважаў рэжысёр Алег Кірэеў, калі браўся ставіць п'есу. Але хацеў паразважаць пра лепшае і дрэннае ў чалавеку праз часы — ад таго, калі п'еса паўстала, да нашага, ужо XXI стагоддзя. Іншая справа — сродкі, якімі гэтая думка рэалізоўвалася. Не заўсёды яны падаюцца абгрунтаванымі — як у дэталях, так і ў стылістыцы наогул. Але цікавая сама ідэя — зрабіць так, каб дзеянне адбывалася ў розных эпохах і героі пераходзяць з адной у другую, нядрэнна адчуваючы сябе ўжо нават з ноўтбукамі. Мяняецца антураж, людзі не мяняюцца са сваім жаданнем нядрэнна ўладкавацца — хтосьці маючы на гэта права, а хтосьці зусім беспадстаўна.

Дырэктар інстытута геалогіі Гарлахвацкі (у спектаклі яго ролю выконвае Аляксандр Кашпераў) хоча шляхам падману атрымаць навуковую ступень. А яго падначалены Туляга (артыст Анатоль Цярпіцкі), які хоча ціха існаваць на сваім месцы, робіць за яго навуковую працу, імкнучыся дагадзіць начальніку. Але не быў бы гэта ўсё-такі навуковы інстытут, каб у ім не было сапраўдных вучоных, як Чарнавус (Уладзімір Мішчанчук). Аднак і яго імя не дае спакою зайздроснікам і інтрыганам... Не, чалавечы свет з тых часоў, як пісалася п'еса, напэўна, не змяніўся. Іншая справа, што для Крапівы існавала яшчэ адна задача — высмеяць, каб стымуляваць жаданне пазбаўляцца ад парокаў. Закляйміць ворагаў. Вывесці на чыстую ваду, каб усталяваць справядлівасць. І гэта, здаецца, таксама вечнае імкненне нармальнага чалавека ў здаровым грамадстве. І няхай вобраз партыйца Левановіча, можа, сёння не зусім зразумелы, але праз яго драматург даводзіў думку пра тое, што беспакаранасці не будзе... Але спектакль — іншы твор, як і ў рэжысёра, які яго паставіў, былі свае задачы, адрозныя ад задач драматурга. Рэжысёр, хутчэй, стварае рэтраспектыву існавання ўсіх гэтых Гарлахвацкіх, Туляг, Зёлкіных, якія знаходзяць сабе месца ў любой эпосе, зусім не баючыся быць выкрытымі. І гэта сумна. Каму іх выкрываць — можа, усё-такі не тэатральным персанажам, а нам, гледачам?



Спектакль па-беларуску праўдзівы — дзякуючы менавіта драматургіі. Спектакль па-беларуску патрэбны — дзякуючы рэжысёру, які ажыццявіў пастаноўку п'есы, няхай не бездакорную, якая выклікае шэраг пытанняў, але глядач усё ж мае магчымасць адчуць сутнасць сатыры. І тут рэжысёру трэба дзякаваць двойчы: адзін з самых папулярных і любімых публікай тэатраў у краіне гадоў 20 не прапаноўваў спектакляў на беларускай мове. Таму для тэатра кінаакцёра кінастудыі «Беларусьфільм» наогул гэтую пастаноўку можна лічыць прарывам у беларускі кантэкст. У якім, як аказалася, тэмы вельмі жывучыя, незалежна ад змены эпох, ідэя генеральная адна — перамога ўсяго добрага над усім дрэнным. І здаецца, у нашых тэатрах беларускую класіку можна ставіць яшчэ доўга і знайсці ў ёй актуальнасць — бо пра нас, вечных, вечную праўду ніхто лепш не скажа, і ніхто іншы можа яе не зразумець (проста таму, што жыве ў іншым свеце). Таму наш тэатральны кантэкст асаблівы: ён — пра сваё, балюча-ідэальнае, можа, таму і недасягальнае. А шкада...

**Ларыса ЦІМОШЫК.**

## СТАРЫ НОВЫ ГОД У ОПЕРНЫМ

**Атрымаўшы ў падарунак на Каляды ганаровую прэмію за пастаноўку оперы Д. Смольскага «Сівая легенда» (пра яе мы падрабязна распавядалі ў верасні), Нацыянальны акадэмічны Вялікі тэатр оперы і балета на забыўся пра тое, чаго ад яго чакаюць ужо чацвёрты год запар. Чароўнага свята з цудамі і прыемнымі — мілагучнымі і вытанчанымі — сюрпрызамі. Менавіта тут можна знайсці выдатную кампанію, каб сустрэць стары Новы год. І адчуць сябе нават самым чаканым і ганаровым госцем, для якога адбываецца самы сапраўды свецкі выхад.**

У ноч з 13 на 14 студзеня можна спасцігнуць адразу некалькі бальных традыцый — княжацкую беларускую (дзякуючы таму, што ў нас ёсць скарб у выглядзе так званага «Полацкага сшытка», які павінен прадставіць ансамбль «Харошкі»), рускую (аркестр тэатра рыхтуе адпаведную праграму), венскую з шыкоўнымі папулярнымі мелодыямі, якія настройваюць на лёгкае і святочнае адчуванне. А яшчэ можна далучыцца да нейкай святочнай экзотыкі — усходняй, напрыклад, ці лацінаамерыканскай. Бо час такі, калі ўсё магчыма...

Ёсць прыхільнікі баляў у оперным, якія гэта ўжо зразумелі і не думаюць пра тое, як правядуць гэтую ноч...

**Ларыса ЦІМОШЫК.**

## УСЕ НА БАЛЬ!

**Калядны баль школьнікаў пройдзе заўтра (12 студзеня) у Гомелі.**

Як расказалі ў аддзеле ідэалагічнай работы адміністрацыі Савецкага раёна Гомеля, сёлета мерапрыемства выйшла на гарадскі ўзровень і адбудзецца ў аднаўленым Палацы культуры чыгуначнікаў. Некалькі гадоў запар такія балі праводзіліся на базе агульнаадукацыйных школ №47 і №22, але зараз колькасць аматараў класічнага танца значна вырасла. 120 удзельнікаў (а гэта старшакласнікі школ горада над Сожам), каб прыняць удзел у мерапрыемстве, на працягу некалькіх месяцаў навучаліся бальным танцам. Маладыя людзі будуць вальсіраваць у бальных сукенках і фраках. Яны выканаюць паланэз, польку і некаторыя іншыя класічныя танцы. Акрамя таго, на балі будуць абраны Кароль і Каралева, а таксама ў праграме запланаваны выступленні творчых калектываў, конкурсы, узнагароджанне найбольш актыўных, творчых і адораных дзяцей, пераможцаў алімпіяд. Не выключана, што балі стануць традыцыйнымі і ініцыятыву Савецкага раёна Гомеля падтрымаюць юнакі і дзяўчаты ўсёй Гомельшчыны.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**

■ Простая мова

# «БЫВАЮЦЬ РАНЫ БОЛЬШЫЯ І МЕНШЫЯ»

**...Пра любімы занятак ніхто не пытаў, а то — услед за Быкавым — адказала б: «Думаць».**
**Але гэта — па-першае. Ці не па-другое — чысціць снег.**
**На знаёмым лецішчы ўвесь рыштунак для гэтага далі. Нават з пальчаткамі — чорнымі, рабочымі, з надпісам (зверху): «Залатыя ручкі».**
**...Гэта — не пра мае, вядома ж!**
**А пафарсіць — прыемна.**

## КАЙФ

З даўняга і чужога: «В стране моей великой /Чудес не перечесть: /Вот комсомола — нету, /А «Комсомолка» — есть!»

Не дзіва, што ў руках маладых. А тут — вельмі пажылы і, відавочна, хворы, бо сядзіць у паліклініцы, у чарзе да доктара.

Але ж газету гартае: разглядае здымкі, чытае загалоўкі — на адной старонцы, на другой. Апошняя — нарэшце. З чарговай прыгажуняй — без адзення, можна сказаць...

— Ты паглядзі! — гучна прапаноўвае дзед суседзям па крэслах. — Ледзь не голымі ўжо для газеты здымаюцца! Сораму — ні на грошык няма!

— І не трэба, браце, не трэба! — па-змоўніцку спыняе старога крыху маладзейшы. — Мы з табой хоць паглядзім на старасці, і тое ўжо добра.

## ХТО ПАПЯРЭДЖАНЫ...

Горад. Прыпынак. Слуп — аб'яўка з выдумкай зроблена (усе вочы там!), бо на белым лісце паперы намалявана яркая аранжавая далонь з актуальным у снежні: «Прадам петарды!».

Знізу, як і належыць, нумары тэлефонаў плюс рэкламнае «Поўны адрыў!» , што «ілюструе» ўсё тая ж аранжавая далонь: сярэдняга пальца на ёй... няма і ў паміне!..

А таму і прэтэнзій — калі раптам што — быць не павінна: тых, хто купляў, папярэджвалі?

Значыць, самі і дурні.

## НАВУКА І ПРАКТЫКА

...«Новы» беларус у вёску з'ездзіў. Вярнуўся — вочы па яблыку. Жонцы расказвае:

— Там чалавек — я сам гэта бачыў — жывога каня зрабіў!

— Ат, не кажы ты глупства, — адмахваецца маладзіца.

— Ды далібог жа! — хрысціцца той. — Калі я падышоў, ён заканчваў яму ногі прыбіваць!

Гэта — анекдот быў. Зараз — чыстая праўда.

Акурат такому ж «новаму» (дом у яго, за горадам) жонка загадала лапак прынесці — ружу на зімку ўкрыць. Ельнік у іх побач, за плотам, можна сказаць, але ж пехам ісці лянота. Ды і навошта, калі ў гаражы цэлы «парк» машын.

Ён на джыпе рашыў матнуцца. «Выкаціў», паехаў. Па дарозе разважыў, што чым далей у лес, тым лепшыя лапкі. Таму і глядзеў не столькі на дарогу, колькі па баках... Аж пакуль не сеў... Ды так, што ні ўзад, ні ўперад — колькі не тузаўся...

Прыйшлося бедаку па навакольных вёсках прайсціся, трактар пашукаць.

У выніку замест пяці-дзясяці хвілін на тыя клятыя лапкі ён патраціў аж тры гадзіны, бутэльку гарэлкі і дзесяць баксаў.

Але ж вопыт нажыў: прынамсі, цяпер ён дакладна ведае, што джып і напраўду машына класная: яна сядзе там, куды іншая ніколі не даедзе!

І адкуль насамрэч далёка ісці па трактар.

## ГРОШ ТАКІ...

«Наш зяць — як лётчык: на зямлі ад яго аніякай карысці», — казала суседкам цешча. Хоць магла і прамаўчаць, бо і так відаць было: у сям'ю, якая ўсё жыццё штосьці будавала, рамантавала, абнаўляла і менавіта гэтым зарабляла на жыццё, прыйшоў худы, бы той хорт, акулярык, які ўсяго і ўмеў, што эфектна трымаць нож у правай руцэ, а відэлец — у левай... Усё астатняе (малаток, рыдлёўка, сякера, нажоўка) у руках яго не проста не трымалася — вывальвалася... Прычым то ў самым нечаканым месцы, то ў самы недарэчны момант!

Спачатку гэтыя яго «прыгоды» не маглі не замілоўваць, не маглі не смяшыць. Потым, як і варта было чакаць, пачалі раздражняць. Цешча ўсё часцей называла зяця хадзячым непаразуменнем, цесць намякаў, што ён «халяўшчык», дачка ўсё радзей і радзей ім пярэчыла. І, відаць, сапраўды падала б на развод («пакуль дзяцей няма»), калі б...

Калі б гэты «акулярык» раптам не змяніў працу і не стаў зарабляць, як той самы лётчык!

...І запаважала чалавека цешча. І не фанабэрыцца больш цесць. І... зацяжарала жонка.

...Продкі праўду казалі, што грош — ён маленькі, ды вялікія справы робіць.

## КУРЫЦЕ!

Справа імгненняў: дзень, сталіца, праспект, каля шапіка — тройка малых, кураць — крадком, з рукавоў...

Пакуль цямлю сваё «няўжо?!», прыкідваю ўзрост і думаю, што ж рабіць, — міма праносіць цётку:

— Курыце, болей курыце! — кідае яна хлапчукам, — пі..кі ніколі не вырастуць!

...Не скажу, што гэта дзяцей насцярожыла. Не скажу, што цыгаркі яны адразу патушылі — гэта будзе няпраўдай... Але ж тое, што цётку хлопцы пачулі, — факт.

Як, дарэчы, і тое, што ў пэўным узросце слова, сказанае вось так, мімаходзь і зусім чужым чалавекам, спрацоўвае куды лепш, чым самая разумная лекцыя.

## БЕЗ ВЕЖЫ

Кумачкі ў трамваі — ну як дома на кухні сядзяць! Нуль увагі на людзей, «шчабечуць» — пра ўсё...

Тут — самае цікавае:

— Слухай, а былы твой на Новы год прыходзіў? — цікавіцца адна.

— А як жа!.. І мне падарунак прынёс, і дзецям, — хваліцца другая. — Нават маёй маме! Уручае нам ды гаворыць: «Я толькі на хвілінку да вас...». Мы яму (разам): «Ды хоць на ўсю ноч!». А што — госць лаўкі не праседзіць, як той казаў, а стол, лічы, накрыты. Мяне ж хлебам не кармі, дай нешта зрабіць. Тым болей — да свята: сем салатаў гатавала, тры гарачыя, пірагоў з дачкою напяклі... І суседзі не з пустымі рукамі прыйшлі, потым — кум з кумою. Пасядзелі, пагаварылі, выпілі, заспявалі... Дачка ж наша на піяніна іграе, сын — на гітары... Такі канцэрт устроілі! Былы мой сядзіць — ну як кот у красках! Шапчу: «Можа, табе ўжо пара? Дома ж чакаюць». А ён — аж здрыгануўся, бедны: мусіць, забыўся, што не тут яго дом?.. На дарожку з кумам пакурыць пайшлі, дык яму і прызнаўся (ведама, пад градусам, язык развязаны), што тая, новая яго, на 15 гадоў маладзейшая. І прыгожая, і вельмі сочыць за сабой: каб малое на вуліцу вывезці, дзве гадзіны малюецца-апранаецца... А вось каб па гаспадарцы нешта зрабіць, дык няма яе. Усё сам ды сам.

— Праўда?! — аж не верыць вушам суразмоўца. — І як жа ён мог так уляпацца?

— Як?.. Як?... Ты не ведаеш: мужчына — ён жа што танк: куды дула, туды і вежа.

...А хацеў як лепш.

## ЧАЛАВЕК МЯРКУЕ...

Пятровіч нарадзіўся даўно, у вёсцы... І жыў бы там! Калі б не... БАМ — наслухаўся, кажа, радыё, начытаўся газет, паехаў — па камсамольскай пуцёўцы. Пяць гадочкаў «адтрубіў», рамантыкі спажыў — напоўніцу! Там жа частку здароўя паклаў... Але ж дадому вярнуўся. Праўда, асеў не ў вёсцы (бо «да грошай прывык»), а ў горадзе: на заводзе сабе працу знайшоў, там жа і нявесту — дзякаваць Богу, добрую. І родам яна таксама з вёскі. Таму ўдваіх ужо сталі марыць, як падгадуюць дзяцей, як дапрацуюць да пенсіі, як потым, хоць калі-небудзь зажывуць — у сваім садку, у сваім дамку, са сваёю козачкай, на зямлі, на свабодзе!..

Думалі, тое не хутка яшчэ, а сталася... «Зляцелі гадочкі, як адна вясна»: абое цяпер на пенсіі.

Дзе жывуць? У горадзе: сына, кажуць, няма з кім пакінуць!

Тому, беднаму, трыццаць пяты пайшоў. Да дзевак у апошнія гады не хадок — не жанаты і нават не быў, а вось да гарэлкі... Аж памірае...

Сам-насам такога пакінь, разважаюць бацькі, — прападзе, загіне як піць даць!

...Таму... чэзнуць і гінуць самі.

## ТРЭБА ЧАКАЦЬ

Вёска, новы плот, хатка: знешне — невялічкая, старая... Іншая справа — унутры: прасторная кухня з усімі «наваротамі» (з душавой кабінай, з бойлерам, з мікрахвалёўкай...), зала ў кніжных паліцах ...

Пакуль разглядаліся там (першы раз у гасцях), пакуль віталіся з гаспадыняй, — з кухні пах кавы прыплыў — свежазмолатай, зваранай; гаспадар з падносам з'явіўся.

— Божухна, малайчына які!.. Дзе ж знаходзяць такіх?

Мы, відаць, не першыя, хто пра гэта пытаўся, бо адказ у гаспадыні гатовы быў:

— Я свайго не знайшла, я свайго... дачакалася.

Ён, па словах жонкі, як многія быў: і рабіць нічога не хацеў, і не слухаў, і крыўдзіў часта, і выпіваў; нават, здаралася, начаваць не прыходзіў... Пакуль пад машыну не трапіў.

А там — паўгода ў бальніцы, група інваліднасці.

— Час упушчаны, здароўя аніякага, у дзяцей свая дзятва. Так што новы дом нам ужо не паставіць. Дык муж во ў гэтым, у старым, выгоды зрабіў, — хваліцца гаспадыня. — Я сябе хоць пад старасць чалавекам адчула...

Больш як 20 гадоў пачакаўшы...

Чаго?

Як ні страшна гэта гучыць, пакуль мужа... пераедзе машына.

## СТАРОЕ ШЧАСЦЕ

З ліста: «У нашым райцэнтры завядзёнка: у першую гадзіну Новага года вылезці з-за стала, пайсці на плошчу, «на ёлку» і вітацца там не інакш як вясёлым «З Новым годам!», «З новым шчасцем!».

...Старое — таксама нідзе не дзелася: «Дык ты не чапай яго, не будзі, — па мабільным раіць камусь прыгожая маладзіца. — Ну навошта ён тут, п'яны? Няхай сабе спіць! Ты адна, без яго прыходзь. Тут музыка, весела... Ну чаму ты не прыйдзеш?»...

Можа, таму, што адной — не хочацца? Хочацца ў пары...

Як усе прыстойныя людзі.

## РАНЫ

Жахі нашага горада: з 12 паверха сіганула ўніз 20-гадовая дзяўчына, з сёмага — жанчына з немаўлём...

Не першыя яны, гэтыя ластаўкі. І, напэўна, не апошнія з тых, хто ў гадзіну адчаю не вытрымае, хто, чуючы толькі ўласны боль, не ўспомніць пра блізкіх і родных, хто, можа, зноў прапусціць, не прачытае, не падумае пра напісанае сто гадоў таму:

«Бываюць раны большыя і меншыя. Меншыя — гояцца, і па іх знаку няма. Большыя — гояцца, але па іх астаюцца рубцы.

Гэтак на целе.

Бываюць раны большыя і меншыя. Меншыя — гояцца; па іх астаюцца рубцы. Большыя — заўсёды крывавяцца.

Гэтак на сэрцы.

Бываюць раны большыя і меншыя. Меншыя — заўсёды крывавяцца. Большыя — залечвае толькі... смерць. Гэтак на душы» (Ядвігін Ш., «Раны»).

**Валянціна ДОЎНАР**

■

## ЮНЫЯ ТАЛЕНТЫ СУСТРЭЛІСЯ Ў БРЭСЦЕ

**У Брэсцкім абласным цэнтры моладзевай творчасці праходзіць VII Міжнародны фестываль дзіцяча-юнацкай творчасці «Мы — разам». Удзельнікі фэсту — дзеці і падлеткі з Беларусі, Украіны, Расіі.**

Усяго ў Брэст прыехала каля 400 юных талентаў. Творчыя калектывы і салісты спаборнічаюць па пяці кірунках: харэаграфія, цыркавое мастацтва, танцы, вакал і інструментальная творчасць.

Пасля трох дзён выступленняў адбудзецца гала-канцэрт і ўзнагароджанне пераможцаў. Дарэчы, летась журы не змагло вызначыцца з тым, хто заслужыў Гран-пры. Таму галоўную ўзнагароду не прысуджалі. Пазалетась лепшым аказаўся хлопчык з Татарстана, які іграў на народных інструментах. Удзельнікі фестывалю адзначаюць яго каштоўнасць перш за ўсё як магчымасць для камунікацый і дружбы дзяцей розных краін.

**Яна СВЕТАВА.**



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

НО, ЗІМА! ПАЕХАЛІ!

■ Супрацоўнічаюць органы правапарадку

# СУСТРЭЛІСЯ МІЛІЦЫЯ І ПАЛІЦЫЯ...

**У Віцебску сустрэліся кіраўнікі ўпраўленняў МУС па Пскоўскай і Смаленскай абласцях, а таксама ўпраўлення ўнутраных спраў Віцебскага аблвыканкама. Абмяркоўваліся пытанні прафілактыкі і барацьбы з крымінальным аўтабізнэсам, забеспячэння дарожнай бяспекі прыгранічных раёнаў, супрацьдзеяння экстрэмізму і тэрарызму.**

### Беларускую сям'ю забілі з-за журавін

Дзякуючы сумеснаму і плённаму ўзаемадзеянню паліцэйскіх і міліцыянераў у Пскоўскай вобласці нядаўна раскрылі крымінальную справу па факце забойства беларускай сям'і, якая зарабляла грошы на журавінах. Злачынства было ўчынена яшчэ ў 2011-м, мела вялікі грамадскі рэзананс.

— Сям'я беларусаў, якая жыла ў Віцебскай вобласці, па прозвішчы Пшонка, знікла, як і іх мікрааўтобус. Практычна на працягу дзевяці месяцаў вялося расследаванне ў цесным узаемадзеянні з работнікамі крымінальнага пошуку ўпраўлення ўнутраных спраў Віцебскага аблвыканкама, — расказвае карэспандэнту «Звязды» **Барыс ГАВАРУН, начальнік упраўлення МУС Пскоўскай вобласці.** — Знайшлі, на жаль, трупы беларусаў — у розных месцах, аўто. Гэтае злачынства было раскрыта. А прычынай забойства з'явілася тое, што яны гандлявалі журавінамі. І тыя зладзеі (як высветлілася, жыхары Пскоўскай вобласці), якія ўчынілі забойства, думалі, што ў іх ёсць вялікія грошы, зароблены на журавіне. Машыну забітых загналі ў лес. І нават аўто мы не маглі адразу знайсці. Падчас расследавання ўдалося ўстанавіць, што зладзеі здзейснілі яшчэ некалькі цяжкіх злачынстваў.

### Беражыце свой аўтамабіль

Барыс Гаварун адзначыў, што згон аўто — «біч» у рабоце паліцыі. Уганяюць аўто не толькі з тэрыторыі Пскоўскай вобласці, але і з Санкт-Пецярбурга, Ленінградскай вобласці. У прыватнасці, грамадзянін Беларусі ўсяго за чатыры месяцы ўгнаў больш як дваццаць аўто. Калі паліцэйскія яго затрымалі, у багажніку машыны ўбачылі расійскія нумары ўкрадзеных аўто. У цэлым сёлета з тэрыторыі толькі Пскоўскай вобласці ўгналі 124 транспартныя сродкі. І ў асноўным — легкавыя машыны іншаземнай вытворчасці. «Працуе» ў гэтым «бізнэсе» шмат крымінальных груп. Сярод пацярпелых і маладая жыхарка Пскоўскай вобласці, машыну якой угналі на трэці дзень пасля таго, як яна яе купіла. А жанчына для пакупкі ўлезла ў крэдыты... У Эстоніі знайшлі ўкрадзеную з Беларусі іншамарку. Цяпер паліцэйскія і міліцыянеры «шукаюць канцы».

**Начальнік упраўлення ўнутраных спраў Віцебскага аблвыканкама Ігар ЯЎСЕЕЎ** дадаў, што ў Віцебску і Наваполацку неаднаразова затрымліваліся аўто, якія ўгналі з тэрыторыі Расіі. І беларускія аўтамабілі, у сваю чаргу, затрымлівалі ў прыгранічных абласцях. Апошняе затрыманне: злавілі жыхара Беларусі, які кіраваў украдзеным аўто. Дык ён нават не палічыў неабходным пры ўгоне схаваць расійскія нумары. На аўтамашыну начапіў беларускі нумар і быў затрыманы паліцыяй. Пасля чаго былі выяўлены два аналагічныя ўгоны...

У раёне мяжы плануецца ўстаноўка стацыянарных сістэм відэаназірання — на трасах М-1 і М-8. У наступным годзе беларускія міліцыянеры ўпэўнены, што пры падтрымцы губернатара Віцебшчыны неабходныя сродкі на ўстаноўку камер будуць выдзелены.

### Пра фальшывыя грошы і махляроў-асуджаных

Кіраўніцтва Пскоўскай паліцыі вельмі турбуе пытанне збыту фальшывых расійскіх грошай, якія могуць апынуцца і ў нас.

— У нашай вобласці асабліва ў два апошнія гады з'явілася вельмі шмат фальшывак. За тыдзень бывае па 10-11 фактаў, калі ў банках выяўляюць фальшывыя купюры. Спачатку гэта былі тысячныя купюры ўзору 1994 і 1997 гадоў, а з пачатку 2012 года актыўна сталі выяўляць пяцітысячныя купюры, — працягвае Барыс Гаварун. — Гэта праблема маштабу краіны. І ўсе крымінальныя «ніці» вядуць у асноўным на Каўказ, дзе фальшыўкі вырабляюць, а потым распаўсюджваюць іх па рэгіёнах Расіі і далей. Вельмі актуальная і праблема мабільнага махлярства, калі пры дапамозе мабільнікаў просяць пералічыць грошы. Мы выкрылі цэлую сетку махляроў, банду. І ў асноўным, як высветлілася, званкі ідуць з калоній і гэтак далей — Сібіры, Урала. Самую апошнюю групу зладзеяў выявілі ў Самарскай вобласці... Даверлівыя людзі пераводзяць зламыснікам грошы. Адкрыю вам тайну: правяралі раён каля адной зоны. І высветлілася, што ўсяго толькі за пяць гадзін адтуль было зроблена больш як 700 званкоў. Вядома, мабільныя тэлефоны ў зоне забаронены. Такім чынам, седзячы ў няволі, асуджаныя займаюцца бізнэсам. Пераводзяць ім, бывае, і ад 20 да 100 тысяч расійскіх рублёў. Людзі плацяць, пачуўшы па тэлефоне, што, маўляў, затрыманы іх блізкія, сваякі, тэрмінова трэба пералічыць грошы. А яшчэ махляры зарабляюць, калі адпраўляюць СМС-паведамленні з тэкстам. Маўляў, банкаўская картка заблакіравана, і трэба, каб яе разблакіраваць, тэрмінова пералічыць грошы.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**


**ОАО «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» (организатор аукциона) по поручению ОАО «Гомельагроэнергосервис» (продавец)**

**извещает о проведении 13 февраля 2013 года повторного открытого аукциона по продаже имущества в 11.00 в городе Гомеле по улице Гагарина, 20, кабинет 2-16**

| № лота | Наименование | Начальная цена продажи объектов, с учетом НДС, бел. руб. | Адрес объектов | Начальная цена продажи лота, с учетом НДС, бел. руб. | Задаток, с учетом НДС, бел. руб. |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | производственно-лабораторный корпус с инв. № 350/С-81273 общей площадью 2878,0 кв.м | **6 996 979 200** | Гомельская обл., г. Гомель, ул. Братьев Лизюковых, дом 2 | 8 296 104 781 | 829 000 000 |
| | одноэтажное кирпичное здание гаража инв. № 350/С-114844 общей площадью 514,0 кв.м | **805 010 400** | | | |
| | - забор-ограждение (забор металлический общей площадью 231,2 кв.м, забор – металлическая сетка на металлических столбах общей площадью 25,7 кв.м, забор кирпичный 9,6 кв.м, ворота металлические (3 ед.) | **180 275 581** | | | |
| | покрытие асфальтобетонное общей площадью 2761,2 кв.м | **211 658 400** | | | |
| | теплосети протяженностью 33,5 м и 126,0 м | **102 181 200** | | | |

Продавец: Открытое акционерное общество «Гомельагроэнергосервис», Индустриальный проезд, 11, 246027, г. Гомель, тел. 8(0232)46-09-47.

**Шаг аукциона – 5% от начальной цены лота.**

**Для участия в аукционе необходимо:**

1. Оплатить задаток на расчетный счет Продавца (Открытое акционерное общество «Гомельагроэнергосервис») р/с 3012200550013 в Гомельском обл. упр. ОАО БЕЛ АПБ, МФО 151501912, УНН 400068169 **по 11 февраля 2013 года в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00.**

2. Подать заявление организатору аукциона по установленной форме с приложением необходимых документов по адресу: ул. Гагарина, 20, каб. 2-16, г. Гомель **по 11 февраля 2013 года в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 от даты опубликования настоящего извещения.**

К заявлению прилагаются следующие документы:

заверенная банком копия платежного поручения о внесении суммы задатка на расчетный счет, указанный в извещении (информационном сообщении);

индивидуальным предпринимателем – копия (без нотариального засвидетельствования) свидетельства о государственной регистрации; юридическим лицом – доверенность, выданная представителю юридического лица (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель), а также копии учредительных документов и свидетельства о государственной регистрации юридического лица; иностранным юридическим лицом, иностранной организацией, не являющейся юридическим лицом, созданной в соответствии с законодательством иностранных государств, иностранным государством и их административно-территориальными единицами в лице уполномоченных органов, международной организацией – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов, выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в торгах) либо иное эквивалентное доказательство статуса юридического лица в соответствии с законодательством страны происхождения, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией; представителем иностранного инвестора – легализованная в установленном порядке доверенность, документ о финансовой состоятельности иностранного инвестора, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, без нотариального засвидетельствования; гражданину Республики Беларусь – копия паспорта и копия договора на открытие текущего (расчетного) счета (в случае отсутствия у физического лица текущего счета – необходимо его открыть); представителем гражданина Республики Беларусь или индивидуального предпринимателя – доверенность.

При подаче документов на участие в торгах граждане Республики Беларусь, иностранные граждане, физические лица (граждане Республики Беларусь и лица без гражданства), постоянно проживающие за пределами Республики Беларусь, в том числе представители юридических лиц Республики Беларусь, представители иностранных инвесторов предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность.

**Дополнительная информация по контактному телефону организатора аукциона: 8 (0232) 74-59-73 и на сайте gomeloblreklama.by**



***Предложение о покупке акций ОАО «Минский комбинат хлебопродуктов»***

**Полное наименование и местонахождение Покупателя акций:** Закрытое акционерное общество «Белтяжмаш», 220036, г. Минск, пер. Северный, 13, административный корпус (здание № 2), каб. 18, контактный телефон : 8(017)2135455. Полное наименование и местонахождение эмитента, акции которого покупаются – Открытое акционерное общество «Минский комбинат хлебопродуктов», 220088, г. Минск, ул. Слесарная, дом 48. Количество акций, которое намеревается приобрести Покупатель – 15000 (пятнадцать тысяч) простых (обыкновенных) акций. Минимальная цена приобретения акций – 210 000 рублей за одну акцию.

**Сроки, форма и порядок оплаты акций:** оплата будет производиться денежными средствами в белорусских рублях безналичным перечислением на счет брокера-продавца в день заключения сделки согласно требованиям расчётно-клиринговой системы ОАО «БВФБ». Место совершения сделок – ОАО «Белорусская валютно-фондовая биржа», г. Минск, ул. Сурганова, 48а. Брокер покупателя – УП «Совмедиа», г. Минск, пер. Северный, 13, адм. здание к. 2, 2 эт. ком. 19. Дата начала покупки акций – «18» января 2013 г. Дата окончания покупки акций – «31» мая 2013 г.

В случае досрочного приобретения количества акций, указанного в тексте предложения, покупатель имеет право отозвать настоящее предложение тем же способом, которым был объявлен текст предложения о покупке.



Утерянный представительством Белгосстраха по Московскому району г. Минска бланк страхового полиса по добровольному страхованию от несчастных случаев и заболеваний формы 2РН серии БН № 1386568 **считать недействительным.** УНП 101883943



**ГП «ГРОДНЕНСКИЙ ЦЕНТР НЕДВИЖИМОСТИ»**
**сообщает, что аукцион по продаже права аренды изолированных помещений и зданий в г. Гродно ПЕРЕНОСИТСЯ с 30.01.2013 г. на 04.02.2013 г.**
**Заявления на участие в аукционе принимаются по 29.01.2013 г.**



**ПРИГЛАШЕНИЕ НА УЧАСТИЕ В ОТКРЫТОМ КОНКУРСЕ на приобретение транспортно-экспедиционных услуг по организации перевозки грузов в Латинскую Америку**

**Предмет конкурса:** Право на заключение договора транспортной экспедиции.

**Наименование и место нахождения заказчика:** ЗАО «Белагроинторг», 220073, г. Минск, ул. Скрыганова, д. 6, комн. 607, тел. 259 17 19, 259 17 29, 259 17 13, факс 259 17 70, 259 17 13, адреса электронной почты: prokopchik@belagro.by, antonjuk@belagro.by.

**Срок оказания услуг:** 1 год с момента заключения договора транспортной экспедиции.

**Способ получения конкурсных документов на приобретение услуг:** конкурсные документы можно получить в течение 30 календарных дней со дня публикации объявления на сайте РУП «Национальный центр маркетинга и конъюнктуры цен» www.icetrade.by на основании предоставленного секретарю конкурсной комиссии «Заявления об участии в конкурсе» по адресу: ЗАО «Белагроинторг», 220073, г. Минск, ул. Скрыганова, д. 6, комн. 808а.

**Конкурсные предложения будут вскрыты 12.02.2013 года в 11.00 по адресу: ЗАО «Белагроинторг», 220073, г. Минск, ул. Скрыганова, д. 6, комн. 607 (Зал переговоров).**

Информацию о порядке проведения конкурса, в том числе об оформлении участия в конкурсе, определении победителя конкурса можно получить по телефонам: **(8 017) 259 17 29, 259 17 19, 259 17 13.**

УНП 100071233



**Извещение об открытом повторном аукционе по продаже права аренды земельных участков в г. Гродно**

| № лота | Наименование объекта | Местонахождение объекта | Площадь земельного участка (га) | Кадастровый номер | Начальная цена (руб.) | Сумма задатка (руб.) | Расходы по подготовке земельно-кадастровой документации (руб.) | Условие продажи и целевое использование земельного участка |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1. | Право аренды земельного участка сроком на 25 лет | ул. Белуша | 2,6475 | 440100000001006777 | 4 500 000 000 | 450 000 000 | 4 281 873 | Строительство строймаркета. * |
| 2. | Право аренды земельного участка сроком на 25 лет | Индурское шоссе на перекрестке с ул. Малаховичской | 0,8266 | 440100000001006858 | 1 152 000 000 | 115 000 000 | 4 123 464 | Строительство магазина продовольственных товаров.* Вынос существующего газопровода высокого давления с пятна застройки. |
| 3. | Право аренды земельного участка сроком на 25 лет | м-н «Девятовка-4» ул. Тавлая позиция по генплану № 45А | 0,0296 | 440100000002006895 | 62 000 000 | 7 000 000 | 3 603 789 | Строительство и обслуживание объекта «Блок торгово-бытового назначения»* |

*Победитель аукциона обязан в установленном порядке получить разрешение на проведение проектно-изыскательских работ и разработать строительный проект на строительство объекта в срок, не превышающий 2 года, а также осуществить строительство объекта в сроки, определенные проектно-сметной документацией. В случае нарушения сроков проектирования и строительства в договоре аренды будут предусмотрены штрафные санкции.

Организатор аукциона: ГП «Гродненский центр недвижимости». При оформлении заявления лицо, желающее принять участие в аукционе, представляет:

1) Копии платежных поручений о внесении **задатка** на расчетный счет 3012000041810 в ф-ле 400 Гродненском областном управлении ОАО «АСБ Беларусбанк», код 752, УНП 590727594 получатель – ГП «Гродненский центр недвижимости», с отметкой банка-отправителя об их исполнении.

**Юридическое лицо:** доверенность, выданную представителю юридического лица (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель), одну копию учредительных документов.

**Физическое лицо**: паспорт, а в случае участия в аукционе представителя физического лица – паспорт и нотариально заверенную доверенность.

2) Платеж за право заключения договора аренды земельных участков осуществляется в течение 10-ти рабочих дней со дня утверждения протокола о результатах аукциона.

3) Победитель аукциона обязан в течение 10-ти рабочих дней со дня утверждения протокола о результатах аукциона возместить организатору аукциона затраты, связанные с организацией и проведением аукциона, а также расходы по подготовке земельно-кадастровой документации.

4) Всем желающим предоставляется возможность ознакомиться с объектами.

**Аукцион состоится 12 февраля 2013 года, в 16.00 в здании горисполкома по адресу: г. Гродно, пл. Ленина, 2/1.** Заявления на участие в аукционах принимаются по адресу: г. Гродно, пл. Ленина, 2/1, каб. № 61, в рабочие дни с 8.00 до13.00 и с 14.00 до 17.00 **с 14 января 2013 г. по 6 февраля 2013 г.** Телефоны для справок в Гродно: (0152) 720546. **Адрес сайта: www.grodno.gov.by**

■ На свае вочы

# Санкт-Пецярбургу не даюць спакою лаўры Венецыі

**Нататкі аб тым, што перашкаджае знакамітаму расійскаму гораду стаць турыстычнай Мекай і што робіцца для пераўтварэння яго ў адзін з самых наведвальных гарадоў планеты.**

Паветраная гавань паўночнай сталіцы Расіі, мякка кажучы, не натхняе на сустрэчу з адным з прыгажэйшых гарадоў свету. Цесны, цёмны і няўтульны аэрапорт «Пулкава» быў перапоўнены пасажырамі, якія з першых крокаў сустракаюцца з дробнымі, але непрыемнымі праблемамі. Напрыклад, мы вымушаны былі некалькі сотняў метраў цягнуцца з багажом да месца пасадкі ў арандаваны для нас аўтобус, які ў дадатак да гэтага спазніўся хвілін на 20. Аказалася, там, дзе нам належала яго чакаць, нельга аўтобусу паркавацца. З гэтай нагоды адбылася яго перадыслакацыя ў новае месца. Шчыра скажу, першыя ўражанні ад Санкт-Пецярбурга не супалі з чаканнямі. Нават у час павярхоўнага знаёмства з яго гістарычным цэнтрам адразу кідаецца ў вочы наступнае: шмат будынкаў маюць патрэбу хаця б у касметычным рамонце. А гэта грошы, шмат грошай. Сродкі на адраджэнне і падтрыманне свайго архітэктурнага бляску горад, як потым высветлілася, імкнецца зарабляць і на турызме.

Наступнае, больш змястоўнае знаёмства з Санкт-Пецярбургам хаця і змяніла ўражанні аб ім у лепшы бок, аднак, разам з тым, заставалася нейкая незадаволенасць убачаным, бо не адчувалася жадання горада, так бы мовіць, актыўна ісці на ўзаемны кантакт. Маўляў, прыехалі дык прыехалі, вашы клопаты. А яшчэ ўзяцца за напісанне гэтых радкоў у многім натхніла аглядная экскурсія па піцерскіх славутасцях і сугучныя майму настрою думкі нашага гіда. Маладая дзяўчына, выдатны экскурсавод і патрыётка роднага горада, расказала, між іншым, і аб гарадскіх турыстычных праблемах, аб пошуках шляхоў іх вырашэння. Калі казаць зусім коратка, то намечана праграма стварэння спрыяльнага асяроддзя для турыстаў. Для іншаземцаў плануецца прадубліраваць назвы многіх вуліц, турыстычных аб'ектаў на англійскай мове. Прадугледжваюцца істотныя зніжкі на паслугі ў міжсезонне. Бацькі Санкт-Пецярбурга, як і яго знакаміты заснавальнік Пётр Першы, відаць па ўсім, вырашылі не вынаходзіць свой славянскі веласіпед, а рашуча перанесці на рускую глебу лепшы досвед сусветнай туріндустрыі па прыцягненні замежных турыстаў. У прыватнасці, усямерна садзейнічаць развіццю кангрэснага турызму.



Яно і правільна. Бо лепшы і кароткі шлях да сэрцаў і кашалькоў, прабачце, крэдытных картак інтурыстаў — гэта хутчэй прыстасавацца да іх менталітэту. Для нас Санкт-Пецярбург — гэта і «град Петров», «Петра творенье», і «самы культурны горад СССР», і «калыска рэвалюцыі». Цікавую гісторыю расказала мне адна мінчанка аб турыстычнай практыцы часоў застою. Тады былі папулярныя паездкі на некалькі дзён у тагачасны Ленінград. У праграме экскурсій (акрамя Эрмітажа, Ісакіеўскага сабора, Петрапаўлаўскай крэпасці і шэрагу іншых культавых аб'ектаў) былі і абавязковыя — у прыватнасці, ленінскі шалаш у Разліве. Туды беларускія турысты не любілі ездзіць, а таму дамаўляліся з экскурсаводамі наступным чынам: маўляў, мы вам трохі даплачваем, а вы замест Разліва пакажыце нам нешта больш цікавае — скажам, адзін з царскіх палацаў.

У замежных турыстаў іншы менталітэт. Многія і не супраць былі б убачыць на свае вочы той жа шалаш у Разліве, іншыя знакавыя месцы расійскай гісторыі, якіх у былой сталіцы імперыі больш чым дастаткова і на любы густ. Ці проста прагуляцца па Неўскім праспекце, у час белых начэй пракаціцца на лодцы па рэках і каналах паўночнай сталіцы. Толькі ўсё павінна быць арганізавана на ўзроўні сучасных міжнародных стандартаў. А вось гэтага якраз пакуль і не хапае Санкт-Пецярбургу.

Размовы пра тое, як зрабіць яго адным з самых наведвальных гарадоў планеты, вядуцца тут не першы год, пытанне рэгулярна абмяркоўваецца на нарадах, семінарах і канферэнцыях рознага ўзроўню. Гэта даволі гарачая дыскусія мае на мэце выпрацаваць меры, шляхіператварэння Санкт-Пецярбурга ў лідары па прыёме замежных і айчынных турыстаў. Ці кажучы мовай тураператараў, зрабіць недасканалы пецярбургскі турыстычны прадукт запатрабаваным жыхарамі многіх краін свету. Хаця нам, мінчанам і не мінчанам, гэтыя клопаты могуць падацца дзіўнымі. Здавалася, чаго хвалявацца, калі ў многія музеі Паўночнай Пальміры чэргі, у гасцініц выдатная, асабліва летам у перыяд белых начэй, запаўняльнасць, а сам горад паспяхова канкурыруе з Масквой па папулярнасці сярод замежных турыстаў.

Але нездарма кажуць, што ўсё пазнаецца ў параўнанні. На жаль, па галоўных паказчыках Санкт-Пецярбург істотна прайграе грандам еўрапейскага ўязнога турызму. І гэта адзін з важкіх аргументаў крытыкі рэшткаў той сістэмы работы па прыёме інтурыстаў, якая склалася яшчэ ў савецкія часы. Незадаволеныя ёй пецярбуржцы прапаноўваюць параўнаць свой горад з Парыжам і Лонданам. Кожны з іх штогод наведвае недзе па 15 мільёнаў чалавек, а Санкт-Пецярбург — у шэсць разоў менш! І няхай колькасць насельніцтва ў кожнай з гэтых сталіц амаль удвая большая, чым у Санкт-Пецярбургу, аднак асадак ад такога параўнання, як гаворыцца, застаецца. І зусім «дабівае» параўнанне Санкт-Пецярбурга з Венецыяй, дзе, уявіце толькі сабе, у 20 разоў жыве менш людзей, а турыстаў італьянскі горад сустракае ў 4 разы больш, чым Санкт-Пецярбург. Зразумела, можна знайсці шмат апраўданняў (і знаходзяць) гэтым мінусам, але, як ні круці, усё ж рэальны фінансавы вынік ад прыёму турыстаў засмучае пецярбуржцаў. І як можа быць інакш, калі турыстычны штогадовы ўнёсак у бюджэт горада складае прыкладна 3-5%, а ў Парыжы ці Лондане — у некалькі разоў больш.

І гэта пры тым, што ў Санкт-Пецярбурга ёсць шмат таго, чаго няма ні ў Парыжа, ні ў Лондана, ні ў любой іншай еўрапейскай сталіцы. Рупліўцы бурнага развіцця ўязнога турызму ў горадзе на Няве любяць, пры магчымасці, паўтараць фразу прапраўнучкі знакамітага італьянскага архітэктара Д. Кварэнгі аб тым, што Санкт-Пецярбург з'яўляецца самым еўрапейскім горадам у Еўропе. Марыела Альберыні ў сярэдзіне 1990-х наведала Санкт-Пецярбург, была ў захапленні ад яго славутасцяў. Тады ў эмацыянальным парыве жанчына і выказала сваю цікавую думку. Аргумент на карысць гэтага небяспрэчнага тэзіса наступны: нідзе ў Еўропе не захавалася ў такіх маштабах архітэктурных ансамбляў, якія пабудаваны ў духу антычна-еўрапейскай класікі XVIII—XIX стагоддзяў — у прыватнасці, на ўзорах італьянскага Адраджэння. А вось у Санкт-Пецярбургу гэта ёсць. Значыць, робяць выснову пецярбуржцы, і ёсць вялікі патэнцыял для прыцягнення новых плыняў турыстаў: багатая гісторыя, цудоўная архітэктура, зайздросная культурная спадчына. Можна доўга пералічваць. Але, як гэта ні прыкра, пакуль не атрымліваецца гораду стаць турыстычнай Мекай. Турыстаў у Санкт-Пецярбургу зусім няшмат у параўнанні з вядомымі гарадамі, якія амаль на працягу ўсяго года «акупіруюць» натоўпы іншаземцаў. І тым самым істотна папаўняюць гарадскую казну, даюць магчымасць зарабіць турыстычным бюро, гаспадарам атэляў, рэстаратарам, таксістам, шматлікім гандлярам сувенірнай прадукцыяй.

Вядома, арыентацыя на масавы ўязны турызм патрабуе і велізарных інвестыцый, у першую чаргу ў гасцінічны бізнэс, дзе прыярытэт — 3-4 зоркавыя атэлі з неабходным мінімумам (па еўрапейскіх мерках) выгод і паслуг і прымальнымі цэнамі на начлег. У большасці еўрапейскіх сталіц лёгка знайсці прыстойны атэль коштам нумара 60-70 еўра. У Санкт-Пецярбургу гасцініца ніжэй за 100 еўра ў суткі — рэдкасць. Мы, напрыклад, жылі ўдваіх у даволі цеснаватым пакойчыку ў нядаўна адноўленым атэлі. Склалася ўражанне, што раней гэта быў аднамесны нумар, але потым яго ўшчыльнілі, паставілі яшчэ ложак. Плата з чалавека — недзе ў межах 100 еўра. Але ў атэля ёсць важная перавага: ён знаходзіцца ў цэнтры, у пяці хвілінах ад слыннага Неўскага праспекта, непадалёку ад іншых вядомых мясцін. На гэтым фоне ўсе атэльныя нязручнасці здаваліся нам не вартымі ўвагі дробязямі.

Дарэчы, уражвае статыстыка росту колькасці гасцінічных нумароў у горадзе на Няве. У 2007 годзе іх было 10 тысяч, а ўжо ў 2011-м — удвая больш. Да 2016 года мяркуецца гэтую лічбу давесці да 34 тысяч. І, магчыма, гэта не мяжа. Бо па разліках мясцовых і замежных экспертаў, Санкт-Пецярбург мае ўсе магчымасці з часам прымаць да 30 мільёнаў турыстаў. Аднак тыя эксперты вымушаны прызнаць, што сёння рэальна сустрэць па-людску, камфортна размясціць каля 3 мільёнаў чалавек. Відаць, пры жаданні маглі і больш, але больш турыстаў пакуль не едзе сюды.

Адлёт у Мінск таксама быў звязаны з нязручнасцямі: прыйшлося на сабе цягнуць багаж на другі паверх па даволі крутой лесвіцы, потым у змрочным зале аэрапорта доўга шукаць пакой для кантролю, стаяць у чарзе, прабачце, у мужчынскую прыбіральню. Запомнілася і яшчэ адна важная дэталь навакольнага ландшафту. Наш шлях ад аўтобуса да аэрапорта ляжаў міма вялікай будаўнічай пляцоўкі. Як потым аказалася — новага цэнтралізаванага пасажырскага тэрмінала «Пулкава», якому надаюць важнасць на самым версе ўлады. Невыпадкова ў лістападзе 2010 года ў гэтым аэрапорце адбылася ўрачыстая цырымонія закладкі новага аэравакзальнага комплексу з удзелам тагачаснага старшыні ўрада Уладзіміра Пуціна. За два гады з нечым года будаўніцтва тэрмінала моцна прасунулася наперад: цалкам закрыты дах і фасад будынка, завершана ўстаноўка ўнікальных элементаў натуральнага асвятлення «скайлайт», ідзе ўстаноўка тэхналагічнага абсталявання, па-еўрапейску прывабна будуць выглядаць залы прыбыцця і вылету міжнародных рэйсаў, зоны мытнага кантролю для іх пасажыраў, зоны выдачы багажу і выхады на пасадку. Побач з аэрапортам узвядуць чатырохзорны атэль і бізнэс-цэнтр.

Узровень і якасць арганізацыі масавага ўязнога турызму ў краінах, якія асабліва любяць наведваць іншаземцы, невыпадкова параўноўваюць з «індустрыяй гасціннасці». Вельмі ёмкае азначэнне, у якім слова «індустрыя» — ключавое. А індустрыялізацыя зноў жа немагчымая без сур'ёзных інвестыцый — у прыватнасці, у развіццё паветранай гавані. Прапускная здольнасць новага аб'яднанага пасажырскага тэрмінала пасля завяршэння рэканструкцыі «Пулкава» складзе 17 млн пасажыраў штогод. Увогуле ў Санкт-Пецярбургу мэтанакіравана ўкладваюць велізарныя сродкі ў стварэнне сучаснай турыстычнай інфраструктуры. І хто ведае, можа, у недалёкай будучыні гэты славуты горад, які нярэдка называюць «паўночнай Венецыяй», перасягне па колькасці турыстаў італьянскую Венецыю.

**Леанід ЛАХМАНЕНКА.**

*Санкт-Пецярбург*



Юрый ШАЎЦОЎ.

# З надзеяй і верай у Сарагосу

**Сёння ў Іспаніі стартуе 23 чэмпіянат свету па гандболе сярод мужчын. Другі раз у гісторыі на першынстве свету выступіць і зборная Беларусі.**

Мне здаецца, бліжэйшыя тыдні ў айчынных балельшчыкаў павінны быць пазначаны ў праграме тэлеперадач чырвоным колерам. Упершыню за апошнія 18 гадоў наш мужчынскі гандбол прэзентаваны на першынстве планеты. Наша каманда зноў сярод лепшых! І гэта сапраўды ўзровень, які дэманструе прагрэс зборнай Юрыя Шаўцова. Між іншым, зусім нядаўна хлопцы Шаўцова з перамогай вярнуліся з міжнароднага турніру, які адбыўся ў Швейцарыі: атрымалі адну вікторыю і зарабілі 2 нічыі. На провады ў штаб-кватэру Нацыянальнага алімпійскага камітэта прынеслі і галоўны трафей — вялікі званочак. Няхай бы ён і стаў тым талісманам, які б дапамагаў нашым хлопцам на Пірэнеях.



Сяргей РУТЭНКА.

Лірыка лірыкай, але матчы ў нашых гандбалістаў на чэмпіянаце свету будуць адказныя. І гэта ўжо не плэй-оф, калі беларусы ў цяжкай барацьбе перамаглі вопытных славакаў. У групавой стадыі нас чакаюць палякі, сярэбраныя прызёры чэмпіянату свету-2007, Паўднёвая Карэя, лепшая зборная Азіі, а таксама моцныя каманды Сербіі і Славеніі, «кот у мяху» ў вобразе Саудаўскай Аравіі. Карацей, сапернікі моцныя, у якіх, у адрозненне ад нашых гульцоў, ёсць неблагі досвед выступленняў на падобных турнірах. Аднак, каб прайсці далей, неабходна трапіць у чацвёрку лепшых зборных групы. Упэўнены, змагацца за падобны вынік наша дружына не толькі можа, але і павінна рабіць. Тым больш з такім цудоўным трэнерам, як Юрый Шаўцоў і лідарам Сяргеем Рутэнкам.

— Нарэшце пасля доўгага перапынку мы трапілі на чэмпіянат свету, — з радасцю кажа **Аляксандр КАРШАКЕВІЧ, славуты гандбаліст мінскага СКА, алімпійскі чэмпіён Сеула.** — Ведаеце, будаваць прагнозы — няўдзячная справа. Проста хочацца пажадаць гандбалістам удачы, шанцавання, каб рабілі тое, што могуць. Спадзяюся, усё атрымаецца. У нас добры калектыў і трэнеры.

Сёння ў беларусаў першы бой. Зразумела, ад сустрэчы з палякамі цалкам не будзе залежаць лёс Беларусі на іспанскім чэмпіянаце свету, аднак на псіхалагічны фон зборнай гэты матч паўплывае дакладна. Але што з сябе цяпер уяўляе каманда Польшчы, наш першы апанент?

— У гэтай зборнай засталіся вельмі вядомыя гульцы, — кажа «Звяздзе» **Казімір Катлінскі, галкіпер зборнай Беларусі,** які ўжо даўно жыве і гуляе на радзіме Шапэна. — А гэта і варатар Славэк Шмаль, Караль Бялецкі, Кшыштаф Ліеўскі. З'явіліся гандбалісты, якія прынясуць у гульню зборнай нешта новае. Але ўсё дакладна вырашыцца толькі на паркеце.

А для таго, каб сачыць за перыпетыямі матчаў, дарэчы, зусім не трэба знаходзіцца разам са зборнай у далёкай Іспаніі. Неабходна проста ўключыць тэлебачанне ў патрэбны час і націснуць кнопачку пульта на адпаведны канал. Усе матчы нашай зборнай будзе трансляваць канал «Беларусь-2». Хварэем разам за Беларусь і атрымліваем задавальненне ад сапраўднага гандбола! Такія падарункі і сапраўды здараюцца не часта.

— Спадзяёмся, нашы балельшчыкі застануцца з намі ў любую хвіліну, — прызнаецца **Сяргей РУТЭНКА, капітан зборнай.** — А мы, у сваю чаргу, будзем рабіць усё, каб іх не расчараваць.

**Тарас ШЧЫРЫ.**

**РАСКЛАД МАТЧАЎ ЗБОРНАЙ БЕЛАРУСІ НА ЧЭМПІЯНАЦЕ СВЕТУ ПА ГАНДБОЛЕ**

**12 студзеня Беларусь — Польшча (22:15)**
**14 студзеня Беларусь — Сербія (20:00)**
**15 студзеня Беларусь — Славенія (17:45)**
**19 студзеня Беларусь — Саудаўская Аравія (17:45)**

*Усе матчы групавой стадыі зборная Беларусі правядзе на паркеце «Прынц Феліпэ Арэна», што ў Сарагосе.*

**Уладзімір КАНАПЛЁЎ, старшыня Беларускай федэрацыі гандбола:**

— Усе гандбалісты ў добрым стане. І я абсалютна не засмучаны тым, што ў Швейцарыі зборная двойчы згуляла ўнічыю, хоць і перамагала ў гэтых матчах. Галоўным было адпрацаваць пэўныя варыянты ўзаемадзеянняў. З Катарам, напрыклад, хлопцы адпрацоўвалі варыянты гульні супраць зборнай Паўднёвай Карэі. Істотна, што ніхто не траўмаваўся.



Фотаздымкі Вольгі ЛАСКІ.

Дзяўчаты прэзентавалі новую форму беларускай зборнай.

■ Які пах!

# «БЕЛАЯ РУСЬ» — ПРА ЛУГІ, ПРА ЛЯСЫ...

**Беларусь дала свету многа знакамітых імёнаў. І гэтыя людзі, куды б ні закінуў іх лёс, заўсёды памятаюць пра нашу краіну, выказваюць сваю пашану ёй. Своеасаблівым знакам удзячнасці стаў і водар «Белая Русь». Яго стварыла сусветна вядомы парфумер Сафія Ходаш-Гройсман, якая нарадзілася ў Беларусі. На сустрэчы з журналістамі гэтую парфуму прэзентаваў яе вучань Уладзіслаў Ракуноў і афіцыйна аб'явіў адкрытым конкурс на права яго вытворчасці.**

Ураджэнка вёскі Любча Навагрудскага раёна зараз жыве і працуе ў ЗША. У 15-гадовым узросце яна разам з сям'ёй пераехала ў Польшчу, а потым, па запрашэнні родных, — у Амерыку. Сёння сярод водараў, створаных Сафіяй Гройсман, не адзін дзясятак парфумерных шэдэўраў. Так, да прыкладу, менавіта яна стварыла кампазіцыю «Tresor» (Lancom), якая па продажах пабіла нават знакаміты «Chanel №5». А таксама знакамітыя «Yves Saint Laurent», «Calvin Klein», «Estee Lauder» і шэраг іншых. Кожнаму свайму тварэнню яна аддае часцінку сваёй душы. Ды пры гэтым адзначае: «Усе тыя рэчы, якія я ствараю ў парфумерыі, — гэта маё дзяцінства ў Беларусі. Там былі кветкі, зямля, лес... Магчыма, менавіта з-за гэтага я і абрала сваю прафесію».

Сафія нарадзілася 8 сакавіка 1946 года. Яе дзяцінства прыпала на пасляваенны час. Яна не мела разнастайных цацак, але ўзгадвае, што каля хаты раслі фіялкі. Дзяўчына любіла зрываць кветкі і ўдыхаць іх водар. Мабыць, так нагадвалі пра сябе парасткі будучага таленту? Маці брала дачку з сабой на кірмаш, бо тая добра адчувала смак таго ці іншага прадукту. Таксама дзяўчынка любіла дапамагаць з прыправамі, калі яны разам гатавалі ежу для бацькі. Важна зазначыць, што бацька Сафіі быў партызанам, які ўратаваў яе маці і многіх яе сяброў падчас вайны. Яго дачка ўспамінае з сумам і вялікай любоўю. Ён — галоўны мужчына ў яе жыцці.

Сваю навінку «Белую Русь» вядомы парфумер стварыла, каб захаваць і перадаць свае ўспаміны пра радзіму.

— Гэты водар — мая асацыяцыя з Беларуссю, якой я яе запомніла, калі была дзіцем, — кажа Сафія Гройсман. — Усе салодкія ноты ў гэтай кампазіцыі адлюстроўваюць маё стаўленне да роднай краіны. Па маіх адчуваннях, сёння людзям трэба нешта свежае і празрыстае, якім я і зрабіла гэты водар. Ён падыходзіць кожнаму, здольны падараваць пачуццё свежага паветра і натхніць сваёй лёгкасцю.

Пакуль што «Белая Русь» створана толькі як водар. І нават яго назва — варыянт, які можа зведаць змены, калі знойдзецца заказчык на вытворчасць парфумы. Некаторыя ў прэсе нават падавалі яго як «Белая Русь №5», але, па словах самой ствральніцы, нічога агульнага гэта не мае з «Chanel №5». Проста, працуючы над кампазіцыяй, Сафія разглядала дзясятак варыянтаў, а калі зрабіла свой канчатковы выбар, то ім аказаўся эксперымент пад гэтым нумарам. Гэта выпадковасць, не больш. Як зазначыў дырэктар Асацыяцыі вытворцаў парфумерыі і касметыкі Уладзіслаў Гаркуноў, праца над водарам скончана, і хочацца, каб вытворцам, які дапаможа яму ўбачыць свет, быў чалавек таксама з Беларусі ці з Расіі.

**«Усе тыя рэчы, якія я ствараю ў парфумерыі, — гэта маё дзяцінства ў Беларусі. Там былі кветкі, зямля, лес... Магчыма, менавіта з-за гэтага я і абрала сваю прафесію».**

Сама кампазіцыя шматгранная. Яе глыбіня адкрываецца з часам. Многія, апісваючы свае ўражанні ад яе, казалі пра асацыяцыі з лугамі, лясамі. Кветкі ў гэтым водары дораць пачуццё свята, якое застаецца з вамі. Формула кампазіцыі сакрэтная, вялікая і дарагая, бо спецыфічныя кампаненты дазваляюць паху заставацца празрыстым і запамінальным. Гэта ў будучым таксама адаб'ецца на кошце. Якім менавіта ён будзе, пакажа час, калі знойдзецца чалавек з жаданнем прадставіць «Белую Русь» шырокай аўдыторыі.

**Алена ДРАПКО**

■ Во даюць!

# АБАРАНІЦЬ ВУЧНЯ... СА ЗБРОЯЙ У РУКАХ?

**Дзіўныя і, шчыра кажучы, зусім нечаканыя высновы былі зроблены з трагедыі, якая адбылася 14 снежня 2012 года ў амерыканскім штаце Канектыкут. Нагадаем, што ахвярамі стральбы 20-гадовага Адама Лэнза там сталі 26 чалавек, у тым ліку 20 вучняў пачатковай школы. У штатах Агаё і Тэхас настаўнікаў вырашылі навучыць карыстацца агнястрэльнай зброяй. Аўтары гэтай ініцыятывы лічаць, што менавіта ўзброены настаўнік зможа максімальна аператыўна адрэагаваць на сітуацыю і ўстараніць зламысніка.**

Арганізацыю і выдаткі па навучанні педагогаў узяла на сябе Асацыяцыя агнястрэльнай зброі штата Агаё. Плануецца, што пасля заканчэння інтэнсіўных курсаў настаўнікі набудуць многія навыкі, якімі валодаюць супрацоўнікі службаў аператыўнага рэагавання. Цікава тое, што на трохдзённыя курсы запісалася ўжо больш як 900 настаўнікаў і іншых супрацоўнікаў школ.

Трэба дадаць, што ў ЗША не сціхаюць дыскусіі наконт неабходнасці абмежавання доступу да зброі. Амерыканскае грамадства падзялілася на прыхільнікаў і праціўнікаў узбраення настаўнікаў. А нацыянальная стралковая асацыяцыя ЗША — галоўнае аб'яднанне амерыканскага «збраевога лобі» — прапанавала ўвесці ўзброеную ахову ў амерыканскіх школах.

Тым часам 8 студзеня ў амерыканскім горадзе Стойбенвіл былі закрыты ўсе школы. Прычынай стала паведамленне аб пагрозе стральбы, размешчанае ў сацыяльнай сетцы. А літаральна праз два дні стрэлы зноў прагучалі ў школе. На гэты раз у Каліфорніі, у маленькім гарадку, размешчаным за 190 кіламетраў ад Лос-Анджэлеса: з драбавіком у школу прыйшоў 16-гадовы падлетак. Юнак прыцэльна стрэліў у аднаго з аднакласнікаў, які пазней быў шпіталізаваны ў крытычным стане. Пасля гэтага падлетак стрэліў у іншага вучня, але прамахнуўся. Настаўніку ўдалося вывесці вучняў з класа, а потым яшчэ з адным супрацоўнікам школы супакоіць стралка і ўгаварыць яго кінуць зброю. Якія матывы падштурхнулі падлетка пачаць страляць у аднакласнікаў, пакуль не ўстаноўлена. Паліцэйскія і намеснікі мясцовага шэрыфа правялі ў школе вобыск, каб пераканацца, што вучням больш нічога не пагражае. У стралка была знойдзена паляўнічая стрэльба і боепрыпасы, якіх хапіла б для забойства вялікай колькасці людзей.

**Надзея НІКАЛАЕВА**

■ Будзьце здаровы!

# НАРОДНЫЯ СРОДКІ СУПРАЦЬ ПРАСТУДЫ НЕ ЗАМЕНЯЦЬ МЕДПРЭПАРАТАЎ

**Пра гэта расказаў журналістам галоўны пазаштатны спецыяліст Міністэрства аховы здароўя па інфекцыйных хваробах Ігар КАРПАЎ, перадае карэспандэнт БЕЛТА.**

«Усе мы, падхопліваючы прастуду, звяртаемся да народных сродкаў лячэння. Але тут трэба разумець адну рэч: народная сродкі дзесьці дапамагаюць, на пачатковых стадыях, але там, дзе ёсць яўная клінічная карціна, неабходна даверыцца медыцынскім прэпаратам. Народныя сродкі і лекавыя нельга параўноўваць па эфектыўнасці. Першыя моцна прайграюць», — сказаў Ігар Карпаў.

Ён падкрэсліў, што асаблівую ўвагу на гэта варта звярнуць групам рызыкі — пажылым людзям, дзецям, цяжарным жанчынам.

У сваю чаргу, **намеснік начальніка аддзела гігіены, эпідэміялогіі і прафілактыкі Міністэрства аховы здароўя Беларусі Іна КАРАБАН** паведаміла, што паказчыкі захваральнасці на грып і вострыя рэспіраторныя інфекцыі адрозніваюцца ў гарадской і сельскай мясцовасці. «У горадзе вялікая скучанасць людзей, гарадскія жыхары больш часу праводзяць у памяшканнях, таму ў мегаполісах сітуацыя па рэспіраторных інфекцыях заўсёды горшая, чым у сельскай мясцовасці. У вёсках людзі жывуць больш асобна, менш кантактуюць адзін з адным, больш часу знаходзяцца на вуліцы — адпаведна, і ўзровень захваральнасці там ніжэй», — сказала яна.

Звычайны сезонны ўздым захваральнасці на грып у Беларусі медыкі чакаюць у студзені—лютым.

# Разумнікі і разумніцы, на старт...

**14 студзеня ў краіне стартуе абласны тур рэспубліканскіх прадметных алімпіяд. Плануецца, што ўдзел у ім возьмуць больш як 8 тысяч беларускіх школьнікаў.**

Нагадаем, што два апошнія гады самыя масавыя рэспубліканскія інтэлектуальныя спаборніцтвы школьнікаў праходзілі ў новым фармаце: на абласным і рэспубліканскім турах алімпіяды школьнікі маглі ўдзельнічаць у спаборніцтвах адразу па некалькіх прадметах. Гуманітарыі маглі па чарзе блісНуць у «сваіх» дысцыплінах, а прыхільнікі дакладных і прыродазнаўчых навук — у «сваіх» (напрыклад, узяць удзел у алімпіядзе і па фізіцы, і па астраноміі, і нават па матэматыцы). Спецыяльна для гэтага алімпіяды па «роднасных» прадметах былі разведзены ў часе і доўжыліся на працягу не аднаго, а чатырох тыдняў. Прычым многія школьнікі дадзенай ім магчымасцю ахвотна карысталіся: сярод удзельнікаў алімпіяднага руху былі такія, хто выходзіў у фінал (на рэспубліканскі тур) адразу па дзвюх і нават па трох дысцыплінах. А на абласным туры колькасць вучняў, якія адстойвалі свае веды адразу па некалькіх прадметах, перавышала пяцьсот чалавек.

Напрыклад, Генадзь Караткевіч заваяваў летась на рэспубліканскім туры алімпіяды дыпломы першай ступені і па матэматыцы, і па інфарматыцы, прычым абодва дыпломы былі ўручаны яму за абсалютнае першае месца. А ўладальнік залатога медаля 44-й міжнароднай алімпіяды сярод школьнікаў па хіміі навучэнец слуцкай гімназіі № 1 Нікіфар Лазоўскі стаў летась прызёрам рэспубліканскай алімпіяды адразу па трох прадметах: фізіцы (дыплом II ступені), англійскай мове (дыплом III ступені) і хіміі (дыплом I ступені).

Але ў бягучым навучальным годзе ад такой практыкі ў Міністэрстве адукацыі вырашылі адмовіцца. Як патлумачыла прэс-сакратар галоўнага адукацыйнага ведамства Юлія Ваніна, былі ўлічаны пажаданні як саміх дзяцей і іх бацькоў, так і педагогаў: усё ж такі падрыхтоўка да алімпіяды патрабуе істотных намаганняў і аднімае ў школьнікаў шмат сіл. А на адным прадмеце сканцэнтравацца прасцей, чым на некалькіх. Таму цяпер беларускім школьнікам дазваляецца ўдзельнічаць у алімпіядах адразу па некалькіх прадметах толькі на першым (школьным) і другім (раённым) узроўнях. У сваю чаргу, абласны тур алімпіяды будзе доўжыцца, як і было раней, на працягу аднаго тыдня.

«Кошт» перамогі на абласным туры для выпускнікоў школ — гэта аўтаматычнае атрыманне 100 балаў па гэтым прадмеце на ўступных іспытах (без здачы цэнтралізаванага тэсціравання).

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

**ЗАВЕРЕНО**
Департамент по ценным бумагам
Министерства финансов
Республики Беларусь
________________Лихачевский В.В.
10.01.2013

ФРАНСАБАНК FRANSABANK

# КРАТКАЯ ИНФОРМАЦИЯ
## ОБ ОТКРЫТОЙ ПРОДАЖЕ ОБЛИГАЦИЙ ВТОРОГО ВЫПУСКА «ФРАНСАБАНК» ОАО

**1. Наименование эмитента.**
на белорусском языке:
полное – «Франсабанк» Адкрытае акцыянернае таварыства,
сокращенное – «Франсабанк» ААТ.
на русском языке:
полное – «Франсабанк» Открытое акционерное общество,
сокращенное – «Франсабанк» ОАО.

**2. Место нахождения, телефон, факс, электронный адрес (e-mail).**
Юридический и почтовый адрес: Республика Беларусь, 220012, г. Минск, пр-т Независимости, 95А.
Телефон/факс: +375 17 389 36 27; +375 17 389 36 36
**Адрес в интернете: www.fransabank.by**
**E-mail: Office@fransabank.by**

**3. Наименование периодического печатного издания, в котором публикуется бухгалтерская отчетность.**
Публикация годового отчета Банка вместе с аудиторским заключением в составе, определенном законодательством, осуществляется в периодическом печатном издании газета «Звязда» не позднее 25 апреля года, следующего за отчетным, также с данной информацией можно ознакомиться на сайте «Франсабанк» ОАО по адресу: **www.fransabank.by.** В случае принятия решения о реорганизации или ликвидации эмитента либо о возбуждении в отношении эмитента производства по делу об экономической несостоятельности (банкротстве) публикация данной информации будет осуществляться в газете «Звязда» в течение семи дней с момента принятия такого решения. Информация о внесении изменений в проспект эмиссии будет публиковаться в газете «Звязда» в течение семи дней после регистрации таких изменения Департаментом по ценным бумагам Министерства финансов Республики Беларусь.
Бухгалтерская отчетность Банка вместе с аудиторским заключением за 2011 год в составе, определенном законодательством, опубликована в периодическом печатном издании газета «Звязда» № 75 (27190) 18 апреля 2012 г.

**4. Номера счетов, на которые будут зачисляться средства, поступающие при открытой продаже облигаций.**
№ 3811800000100 в «Франсабанк» ОАО, код 266, УНП 100755021 (для индивидуальных предпринимателей и юридических лиц, не являющихся банками).
№ 1811800000043 в «Франсабанк» ОАО, код 266, УНП 100755021 (для банков).

**5. Наименование депозитария, обслуживающего эмитента, его местонахождение, дата, номер государственной регистрации и наименование органа, его зарегистрировавшего, номер специального разрешения (лицензии) на осуществление профессиональной и биржевой деятельности по ценным бумагам, срок действия лицензии.**
«Франсабанк» ОАО обслуживает депозитарий «Франсабанк» ОАО, расположенный по адресу: Республика Беларусь, г. Минск, пр-т Независимости, 95А, действующий на основании специального разрешения (лицензии) на право осуществления профессиональной и биржевой деятельности по ценным бумагам № 02200/5200-1246-1078, выданного Министерством Финансов Республики Беларусь, срок действия продлен до 29 июля 2022 года.

**6. Размер уставного фонда.**
Сумма зарегистрированного уставного фонда эмитента составляет 113 704 352 432 (Сто тринадцать миллиардов семьсот четыре миллиона триста пятьдесят две тысячи четыреста тридцать два) белорусских рублей.
**Уставный фонд эмитента** разделен на 45 049 268 (Сорок пять миллионов сорок девять тысяч двести шестьдесят восемь) простых (обыкновенных) акций, (регистрационный номер 5-200-01-15280 от 20.01.2009 г.). Номинальная стоимость одной акции – 2 524 (Две тысячи пятьсот двадцать четыре) белорусских рубля.
Все выпущенные акции полностью оплачены и размещены среди акционеров.

**7. Дата, номер государственной регистрации и наименование органа, его зарегистрировавшего.**
Эмитент зарегистрирован Национальным банком Республики Беларусь как АКБ «Золотой талер» 05 октября 1994 года, регистрационный номер № 50, переименован в ОАО Банк «Золотой талер» 23 июня 1999 года, переименован в «Франсабанк» ОАО 13 ноября 2008 г.
Деятельность эмитента регулируется Уставом, зарегистрированным Национальным банком Республики Беларусь 05 октября 1994 года под номером 50 (с изменениями и дополнениями, зарегистрированными постановлением Правления Национального Банка Республики Беларусь от 12.11.2012 г. № 575).

**8. Сведения о филиалах и представительствах эмитента с указанием их количества и места нахождения.**
Действующая структура Банка включает в себя центральный офис и структурные подразделения, не имеющие самостоятельного баланса. Банк не имеет филиалов и представительств.

**9. Место, время и способ ознакомления с проспектом эмиссии.**
Ознакомиться с подробной информацией о выпуске облигаций можно, начиная с даты публикации, в средствах массовой информации текста краткой информации об открытой продаже облигаций по адресу:
- головной офис «Франсабанк» ОАО: г. Минск, пр-т. Независимости, 95А; Управление корпоративных клиентов: г. Минск, ул. Кальварийская, 4; Управление по Брестской области «Франсабанк» ОАО: г. Брест, ул. Суворова, 105/2; Управление по Гродненской области «Франсабанк» ОАО: г. Гродно, ул. Доминиканская, 10; Управление по Гомельской области «Франсабанк» ОАО: г. Гомель, ул. Крестьянская, 22 и г. Гомель, ул. Красноармейская, 5а, с 9.00 до 16.00 в рабочие дни (в пятницу и предпраздничные дни с 9.00 до 15.00).
- на интернет-сайте эмитента: www.fransabank.by

**10. Дата принятия решения о выпуске облигаций, номер протокола и наименование органа, принявшего это решение.**
Решение о втором выпуске облигаций в соответствии с п. 9.4. Устава Банка принято Наблюдательным Советом Банка 12 декабря 2012 Протокол № 61.

**11. Форма выпуска облигаций, объем эмиссии, количество облигаций.**
К открытой продаже предлагаются 20 000 (Двадцать тысяч) именных процентных неконвертируемых облигаций в бездокументарной форме (в виде записей на счетах).
Серия «ФБ2», номера «000001-020000».
Объем эмиссии составляет 20 000 000 000 (Двадцать миллиардов) белорусских рублей.

**12. Номинальная стоимость облигаций.**
1 000 000 (Один миллион) белорусских рублей.

**13. Цель выпуска облигаций и направления использования средств, полученных от размещения облигаций.**
Целью выпуска облигаций является привлечение свободных денежных средств юридических лиц и индивидуальных предпринимателей для формирования ресурсной базы Банка.
Привлеченные средства от размещения облигаций Клиентам на внутреннем финансовом рынке будут направлены на финансирования реального сектора экономики, в том числе исходя из нормализации ликвидности Банка.

**14. Сведения об обеспечении исполнения обязательств по облигациям.**
Выпуск облигаций осуществляется без обеспечения по согласованию с Национальным Банком Республики Беларусь при условии, что общий размер обязательств по таким облигациям не превышает 80 процентов нормативного капитала Банка (подпункт 1.8 пункта 1 Указа № 277).
По состоянию на 01.11.2012 г. нормативный капитал Банка составляет 323 655,5 млн. бел. рублей.

**15. Сведения о согласовании выпуска облигаций с Национальным банком Республики Беларусь.**
Выпуск облигаций осуществляется Банком по согласованию с Национальным Банком Республики Беларусь (постановление Правления Национального Банка Республики Беларусь от 22.12.2012 г. № 693) в пределах 80 процентов нормативного капитала в соответствии с подпунктом 1.8 пункта 1 Указа Президента Республики Беларусь № 277 от 28 апреля 2006 года «О некоторых вопросах регулирования рынка ценных бумаг».

**16. Период проведения открытой продажи облигаций.**
Дата начала продажи: 15 января 2013 года.
Дата прекращения продажи: 15 июля 2013 года, если больший срок не будет определен Правлением Банка.

**17. Место и время проведения открытой продажи облигаций.**
Открытая продажа (размещение) осуществляется:
- на внебиржевом рынке по адресам:
Головной офис «Франсабанк» ОАО: г. Минск, пр-т Независимости, 95А; Управление корпоративных клиентов: г. Минск, ул. Кальварийская, 4; Управление по Брестской области «Франсабанк» ОАО: г. Брест, ул. Суворова, 105/2; Управление по Гродненской области «Франсабанк» ОАО: г. Гродно, ул. Доминиканская, 10; Управление по Гомельской области «Франсабанк» ОАО: г. Гомель, ул. Крестьянская, 22 и г. Гомель, ул. Красноармейская, 5а, с 9.00 до 16.00 в рабочие дни (в пятницу и предпраздничные дни с 9.00 до 15.00) на основании договора первичного размещения облигаций;
- на биржевом рынке в торговой системе ОАО «Белорусская валютно-фондовая биржа» в соответствии с регламентом торгов.
Продажа облигаций осуществляется по цене, равной текущей стоимости облигаций на день продажи, за исключением дней выплаты процентного дохода. В указанные дни облигации продаются по их номинальной стоимости. В день начала размещения текущая стоимость облигации равна номинальной стоимости облигации.

**18. Срок обращения облигаций.**
с 15 января 2013 года по 15 января 2016 года (1095 дней).
При расчете срока обращения облигаций день начала размещения и день начала погашения облигаций считаются одним днем.

**19. Размер или порядок определения размера дохода по облигациям, условия его выплаты.**
По облигациям устанавливается доходность в размере ставки рефинансирования Национального Банка Республики Беларусь (с учетом ее изменений).
Выплата дохода владельцам облигаций производится:
в виде процентного дохода;
периодически (один раз в три месяца) в течение срока обращения облигаций, в соответствии с графиком начисления и выплаты процентного дохода;
на основании реестра владельцев облигаций.
Формирование реестра осуществляется за 2 рабочих дня до даты выплаты дохода. Все сделки с облигациями прекращаются за 2 рабочих дня до дня выплаты процентного дохода за каждый процентный период в течение всего срока обращения облигаций.
В случае отсутствия в реестре владельцев облигаций данных о банковских реквизитах владельцев облигаций в белорусских рублях, открытых в уполномоченных Банках Республики Беларусь, а также в случае, если реестр содержит ошибочные банковские реквизиты, сумма, подлежащая выплате, выплачивается путем депонирования на счете эмитента до непосредственного обращения владельца облигаций. Проценты по депонированным суммам не начисляются и не выплачиваются.

**График начисления и выплаты процентного дохода**

| Порядковый номер периода начисления процентного дохода | Начало периода | Конец периода, дата выплаты процентного дохода | Продолжительность периода | Дата формирования реестра владельцев облигаций для целей выплаты процентного дохода |
|---|---|---|---|---|
| 1 | 16.01.2013 | 15.04.2013 | 90 | 11.04.2013 |
| 2 | 16.04.2013 | 15.07.2013 | 91 | 11.07.2013 |
| 3 | 16.07.2013 | 15.10.2013 | 92 | 11.10.2013 |
| 4 | 16.10.2013 | 15.01.2014 | 92 | 13.01.2014 |
| 5 | 16.01.2014 | 15.04.2014 | 90 | 11.04.2014 |
| 6 | 16.04.2014 | 15.07.2014 | 91 | 11.07.2014 |
| 7 | 16.07.2014 | 15.10.2014 | 92 | 13.10.2014 |
| 8 | 16.10.2014 | 15.01.2015 | 92 | 13.01.2015 |
| 9 | 16.01.2015 | 15.04.2015 | 90 | 13.04.2015 |
| 10 | 16.04.2015 | 15.07.2015 | 91 | 13.07.2015 |
| 11 | 16.07.2015 | 15.10.2015 | 92 | 13.10.2015 |
| 12 | 16.10.2015 | 15.01.2016 | 92 | 13.01.2016 |

В случае если дата выплаты процентного дохода выпадает на нерабочий день, выплата осуществляется в первый рабочий день, следующий за нерабочим днем. Проценты на сумму процентного дохода по облигациям за указанные нерабочие дни не начисляются и не выплачиваются. Под нерабочим днем в настоящем документе следует понимать выходные дни, государственные праздники и праздничные дни, установленные и объявленные Президентом Республики Беларусь нерабочими днями.
Процентный доход по облигациям за первый период начисления процентного дохода начисляется с даты, следующей за датой начала размещения облигаций, по дату выплаты процентного дохода за данный период включительно. Процентные доходы по остальным периодам (включая последний) начисляются с даты, следующей за датой выплаты процентного дохода за предшествующий период, по дату выплаты процентного дохода за соответствующий период (по дату погашения) включительно.
Начисление процентного дохода осуществляется в течение срока обращения облигаций. Со дня истечения срока обращения облигаций процентный доход не начисляется.
Расчет процентного дохода производится, путем его начисления на номинал облигаций за период начисления процентного дохода, согласно графику начисления и выплаты процентного дохода, по ставке процентного дохода указанной в настоящей Краткой информации.
Процентный доход рассчитывается по следующей формуле:

$$Д = (П1*Н*t1 + П2*Н*t2 + .... + Н*Пn*tn) / (365(366)*100), где$$

Д – процентный доход;
П1, П2, Пn – ставка процентного дохода (процентов годовых) равная ставке рефинансирования Национального банка Республики Беларусь, действующая в соответствующий период начисления процентного дохода;
Н – номинальная стоимость облигации;
t1, t2, tn — количество дней соответствующей части периода начисления процентного дохода, в пределах которой действующая ставка рефинансирования Национального банка Республики Беларусь была неизменной и неизменным оставалось количество дней в году.
Расчет процентного дохода осуществляется по каждой облигации, исходя из фактического количества дней в году, с округлением до одного рубля математическим методом.

**20. Порядок размещения облигаций. Цена продажи облигаций, расчет текущей стоимости облигаций.**
После опубликования Краткой информации об открытой продаже облигаций второго выпуска «Франсабанк» Открытого акционерного общества, заверенной в установленном порядке Департаментом по ценным бумагам Министерства финансов Республики Беларусь, размещение облигаций осуществляется **с 15.01.2013 по 15.07.2013**, если больший срок не будет определен Правлением Банка. Срок открытой продажи может быть сокращен в случае полной реализации всего объема эмиссии облигаций.
Размещение облигаций осуществляется путем открытой продажи юридическим лицам и индивидуальным предпринимателям – резидентам и нерезидентам Республики Беларусь (далее – покупатели) в соответствии с законодательством Республики Беларусь.
Продажа облигаций (при первичном размещении) осуществляется по цене, равной текущей стоимости облигации, за исключением дней выплаты процентного дохода. В указанные дни облигации продаются по их номинальной стоимости. В день начала размещения текущая стоимость облигации равна номинальной стоимости облигации.
Текущая стоимость облигации рассчитывается на дату совершения операции по следующей формуле:

$$С = Н + Дн, где:$$

С – текущая стоимость облигации;
Н – номинальная стоимость облигации;
Дн – накопленный процентный доход.
Накопленный процентный доход рассчитывается по следующей формуле:

$$Дн = (П1*Н*t1 + П2*Н*t2 + .... + Пn*Н*tn) / (365(366)*100), где:$$

Дн – накопленный процентный доход;
П1, П2, Пn – ставка процентного дохода (процентов годовых) равная ставке рефинансирования Национального банка Республики Беларусь, действующая в соответствующий период начисления процентного дохода;
t1, t2, tn – количество дней в соответствующей части текущего периода начисления процентного дохода, в пределах которой ставка рефинансирования Национального банка Республики Беларусь была неизменной и неизменным оставалось количество дней в году. При этом сумма t1 + t2 +....+ tn должна быть равна количеству дней в соответствующем периоде (части периода) начисления процентного дохода, приходящийся на календарный год, состоящий из 365 (366) дней;
Н – номинальная стоимость облигации.
День начала размещения облигаций (15.01.2013 г.) и день погашения облигаций считаются одним днем.
Расчет накопленного процентного дохода осуществляется по каждой облигации, исходя из фактического количества дней в году с округлением до одного рубля математическим методом.

**21. Условия и Порядок досрочного погашения облигаций**
Наблюдательный Совет Банка вправе принять решения о досрочном погашении облигаций второго выпуска либо его части до даты окончания срока обращения:
- неразмещенных в полном объеме эмиссии на момент принятия соответствующего решения;
- неразмещенных не в полном объеме эмиссии (оставшейся части неразмещенных облигаций) на момент принятия соответствующего решения;
- приобретенных Банком в полном объеме эмиссии до даты окончания срока обращения в порядке, указанном в пункте 25 настоящей краткой информации;
- приобретенных Банком не в полном объеме эмиссии до даты окончания срока обращения в порядке, указанном в пункте 25 настоящей краткой информации.

**22. Дата начала погашения облигаций** – 15.01.2016 года. Дата окончания погашения облигаций совпадает с датой начала погашения облигаций.

**23. Порядок погашения облигаций**
**Дата погашения облигаций – 15.01.2016 г.**
При погашении облигаций владельцам облигаций выплачивается их номинальная стоимость, а также процентный доход за последний период начисления процентного дохода (иные неполученные процентные доходы – при их наличии).
Погашение облигаций осуществляется в отношении лиц, указанных в реестре владельцев облигаций, сформированном депозитарием эмитента за 2 рабочих дня до наступления даты погашения облигаций. Владельцы облигаций обязаны прекратить все сделки с облигациями за 2 рабочих дня до наступления срока погашения облигаций.
В случае если день погашения выпадает на нерабочий день, погашение осуществляется в первый рабочий день, следующий за нерабочим днем, по цене, равной номинальной стоимости облигации, владельцам облигаций также выплачивается процентный доход за последний период начисления процентного дохода (иные неполученные процентные доходы — при их наличии). За указанные нерабочие дни проценты не начисляются и не выплачиваются.
В день погашения облигаций эмитент осуществляет списание денежных средств со своего счета по реквизитам владельцев, указанных в реестре владельцев облигаций, сформированном депозитарием эмитента за 2 рабочих дня до наступления срока погашения облигаций. Погашение облигаций производится денежными средствами в сумме и валюте номинала облигаций.
В случае отсутствия в реестре владельцев облигаций данных о банковских реквизитах владельцев облигаций, сумма, подлежащая выплате, выплачивается путем депонирования на счете эмитента до непосредственного обращения владельца облигаций. Проценты по депонированным суммам не начисляются и не выплачиваются.
При погашении владельцы облигаций обязаны перевести погашаемые облигации на счет «депо» Эмитента №266100000220, раздел 24, счет «ЛОРО» №1000015, раздел 00 в срок не позднее рабочего дня, следующего за днем перечисления Банком денежных средств, необходимых для погашения облигаций.

**24. Дата формирования реестра владельцев облигаций для целей погашения облигаций.**
Для целей погашения облигаций Депозитарий Банка формирует реестр владельцев облигаций по состоянию на 13.01.2016 г.

**25. Порядок приобретения облигаций Банком до даты их погашения.**
Эмитент обязуется произвести выкуп облигаций у их владельцев по номинальной стоимости 15.04.2013 г., 15.07.2013 г., 15.10.2013 г., 15.01.2014 г., 15.04.2014 г., 15.07.2014 г., 15.10.2014 г., 15.01.2015 г., 15.04.2015 г., 15.07.2015 г., 15.10.2015 г. Для продажи облигаций эмитенту владельцы облигаций подают заявление о намерении осуществить такую продажу. Заявление передается по факсу не позднее пяти рабочих дней до предполагаемой даты выкупа облигаций эмитентом по адресу: г. Минск, пр-т Независимости, 95А, тел./факс +375 (17)389 36 27; +375 (17) 389 37 89 (с последующим предоставлением оригинала не позднее трех дней до даты выкупа облигаций эмитентом).
В случае если дата приобретения облигаций Банком выпадает на нерабочий день, приобретение осуществляется в первый рабочий день, следующий за не рабочим днем.
Для продажи облигаций Банку владелец облигаций должен:
а) не позднее пяти рабочих дней до предполагаемой даты предоставить в Банк:
- заявление о намерении осуществить такую продажу, которое должно содержать:
наименование владельца облигаций;
наименование ценной бумаги;
количество облигаций, предложенных для продажи;
банковские реквизиты счета для перечисления денежных средств за проданные облигации (в случае если приобретение облигаций осуществляется Банком на внебиржевом рынке);
наименование профессионального участника рынка ценных бумаг – члена секции фондового рынка Биржи, который будет совершать продажу облигаций на биржевом рынке (в случае если владелец облигаций не является профессиональным участником рынка ценных бумаг);
согласие с настоящими условиями приобретения облигаций Банком;
подпись уполномоченного лица и печать владельца облигаций;
б) в случае если для осуществления продажи облигаций Банку владельцу облигаций необходимо принятие решения соответствующего органа, или получение согласования, или получение разрешения – заблаговременно принять (получить) данное решение(согласование, разрешение).
В случае невыполнения владельцем облигаций условий, установленных частью «а» настоящего пункта, приобретение облигаций Банком не осуществляется.
Эмитент имеет право выкупать облигации по договорной цене в течение всего срока обращения облигаций. Выкуп облигаций осуществляется эмитентом на внебиржевом рынке с заключением договора купли-продажи и/или на биржевом рынке в порядке, установленном ОАО «Белорусская валютно-фондовая биржа».
Эмитент имеет право:
- продавать на вторичном рынке выкупленные ранее облигации по договорным ценам;
- досрочно погасить выкупленные облигации;
- совершать иные операции с облигациями, предусмотренные законодательством Республики Беларусь.

**26. Порядок обращения облигаций.**
Сделки с облигациями на вторичном рынке осуществляются в соответствии с законодательством Республики Беларусь:
Резидентами Республики Беларусь (в том числе Банком) – в торговой системе Биржи и/или на внебиржевом рынке;
Нерезидентами Республики Беларусь – только в торговой системе Биржи.
Сделки с облигациями прекращаются за два рабочих дня:
до даты выплаты процентного дохода за каждый период начисления дохода в течение всего срока обращения облигаций;
до даты начала погашения облигаций, указанной в настоящей Краткой информации.

**27. Основания, по которым выпуск облигаций может быть признан несостоявшимся.**
Банком не устанавливаются основания признания выпуска облигаций не состоявшимся.

**28. Условия и порядок возврата денежных средств инвесторам при запрещении выпуска облигаций регистрирующим органом.**
При запрещении выпуска облигаций эмитент, в месячный срок с момента получения от регистрирующего органа уведомления о запрещении выпуска ценных бумаг, возвращает инвесторам средства, полученные в их оплату с уплатой процентов за фактический срок пользования денежными средствами по облигациям второго выпуска по процентной ставке, равной действующей ставке рефинансирования Национального банка Республики Беларусь, в безналичном порядке в соответствии с законодательством Республики Беларусь.

**29. Информация о порядке конвертации облигаций данного выпуска в облигации другого выпуска с более поздней датой погашения.**
Конвертация облигаций не производится.

**30. Дата и номер государственной регистрации облигаций.**
№ 5-200-02-1759 от «10» января 2013 года.

**Председатель Правления** **И. Колейлат**

**Главный бухгалтер** **А.Н. Русакович**

*Лицензия на осуществление банковской деятельности НБ РБ № 15 от 29.12.2008 г., УНП 100755021*


■ Навіны сталіцы

# ПАСЛУГА «САЦЫЯЛЬНАЯ ПЕРАДЫШКА» Ў МІНСКУ КАРЫСТАЕЦЦА ПАПУЛЯРНАСЦЮ

**Больш за 60 сталічных сем'яў карысталіся паслугай «Сацыяльная перадышка» летась. Як расказала намеснік старшыні грамадскага аб'яднання «Беларуская асацыяцыя дапамогі дзецям-інвалідам і маладым інвалідам (грамадскага аб'яднання «БелАДДІіМІ») Марыя Сінякевіч, гэтую паслугу аказваюць бацькам, якія выхоўваюць дзяцей з парушэннямі псіхафізічнага развіцця. Яны могуць пакінуць дзіця пад часовым наглядам сацыяльных работнікаў на тэрмін ад некалькіх дзён да месяца на працягу года. Прычым зусім бясплатна. Кампенсаваць трэба толькі выдаткі на паходы ў кіно, цырк або заапарк.**

Паслуга «Сацыяльная перадышка» з'явілася ў мінулым годзе дзякуючы старанням трох грамадскіх арганізацый — Беларускага дзіцячага хоспіса, грамадскага аб'яднання «БелАДДІіМІ» і Дзіцячага фонду ААН — ЮНІСЕФ. У першай з іх пакідаюць на часовае пражыванне дзетак з цяжкімі парушэннямі развіцця, якім патрэбна пастаянная медыцынская дапамога. Часовым жыхарам хоспіса ад 1,5 да 18 гадоў. Узрост выхаванцаў «БелАДДІіМІ» — ад 3 гадоў да 21 года.

— Перш чым узяць дзіця на пражыванне, мы дэталёва распытваем мам і татаў пра яго звычкі, перавагі і хобі, — адзначыла М. Сінякевіч. — Першую ноч яны нават могуць правесці з дзіцем, каб паглядзець, як тое адаптуецца да новых абставін. Паслуга папулярная. Заявы ад бацькоў паступілі ўжо на лета.

**Марына КАСЦЮКЕВІЧ,** *«Мінск-Навіны»*

## Усходні гараскоп на наступны тыдзень

**АВЕН.** Увага павінна быць сканцэнтравана на паўсядзённых справах і дробных жыццёвых праблемах. Супрацоўніцтва з дзелавымі партнёрамі акажацца плённым, калі меркантыльныя інтарэсы не стануць самамэтай. Настае спрыяльны момант для выйсця з сітуацыі, якая склалася. Ён дазволіць вам прасунуцца наперад да ажыццяўлення задумы.

**ЦЯЛЕЦ.** Абраўшы прыярытэтны кірунак, не зварочвайце са шляху, інакш вашы высілкі будуць дарэмныя. Варта выявіць прынцыповасць ва ўсім, што тычыцца тэрмінаў выканання работы. Не варта захапляцца барацьбой з навакольнымі. Перш чым пачынаць кусацца, далічыце да дзесяці, а лепш — да ста.

**БЛІЗНЯТЫ.** Варта арыентавацца на ўласныя сілы і магчымасці, а дэвізам паслужыць наступнае: «Хочаш, каб было зроблена добра, — зрабі сам». Блізкія людзі могуць адмовіцца беспярэчна вам падпарадкоўвацца, таму варта назапасіць важкія аргументы і пераконваць, а не загадваць.

**РАК.** Тыдзень можа стаміць сваёй інтэнсіўнасцю і напружаным рытмам. Зоркі абяцаюць шмат паездак і новых кантактаў. Давядзецца разлічваць толькі на ўласныя сілы. Значныя змены, якія адбудуцца ў гэтыя дні, могуць паўплываць на ваша жыццё на доўгія месяцы наперад.

**ЛЕЎ.** Асаблівае значэнне набудуць такія якасці, як удумлівасць і сабранасць. Калі маюць быць паездкі — то па справах, калі сустрэчы і знаёмствы — то карысныя, якія абяцаюць нядрэнныя перспектывы. Усякае ваша дзеянне павінна быць падпарадкавана мэце стварэння трывалага падмурка для выгадных дамоў і паспяховай працы. Не блытайце неразуменне з канструктыўнай крытыкай — гэта зусім розныя рэчы.

**ДЗЕВА.** Ёсць верагоднасць сутыкнення з сацыяльнымі праблемамі. Па дапамогу лепш звяртацца да сяброў ці блізкіх сваякоў. Не бойцеся выяўляць актыўнасць у барацьбе за свае правы, дзейнічайце смела, бо цяпер вашы дзеянні цалкам адпавядаюць вашым жаданням. Не будзьце занадта даверлівыя ў дачыненні да калег: шматлікімі іх учынкамі будуць кіраваць асабістыя меркаванні, сярод якіх думкі пра ваш дабрабыт нават не начавалі.

**ШАЛІ.** Спрыяльны тыдзень для дасягнення трывалага поспеху. Калі, вядома, у гэты момант вы не грэецеся на сонейку, то рыхтуйцеся папрацаваць, выкарыстоўваючы ўвесь свой досвед, фантазію, энергію і інтуіцыю. Разарвіце непатрэбныя сувязі, якія абцяжарваюць вас, вызваліцеся ад ілюзій і памылак. У выніку, пазбавіўшыся ад баласту непатрэбных перажыванняў, станеце вольныя, і дзякуючы энергіі і абаянню ў вас з'явяцца новыя сябры і партнёры.

**СКАРПІЁН.** Варта ўзяць кіраванне справамі ва ўласныя рукі і пачаць наладжваць новыя кантакты і дзелавыя сувязі. Давядзецца канкрэтызаваць і сістэматызаваць задачы, якія перад вамі стаяць. Заадно падумайце, што трэба сёе-тое змяніць у сваёй дзейнасці. У пагоні за справядлівасцю паспрабуйце пазбягаць канфліктаў. Яна пераможа крыху пазней, пакуль паберажыце сілы.

**СТРАЛЕЦ.** Пры ўмелым спалучэнні аптымізму і гнуткасці ў паводзінах, зможаце прыцягнуць да сябе ўвагу навакольных. Працуйце, і ваш прафесійны поспех забяспечыць годнае існаванне. Не кажучы ўжо пра маральнае задавальненне. Займіцеся асваеннем новых прафесійных навыкаў. Звярніце ўвагу на інтэлектуальную сферу дзейнасці: у ёй вас чакае поспех.

**КАЗЯРОГ.** Вы на ростанях. Збярыцеся з сіламі і паспрабуйце рэалістычна ацаніць праблемы. Памятайце, што перад рашучым кідком неабходны паўнавартасны адпачынак. Калі такой магчымасці няма, то вазьміце хоць бы невялікі водпуск, змяніце атмасферу. Гэта дапаможа страсянуцца і знайсці выйсце са становішча, якое стварылася.

**ВАДАЛЕЙ.** Тыдзень пажадана прысвяціць падвядзенню вынікаў, разбору палётаў і да суботы не пачынаць ніякіх новых спраў. Добра паддаюцца выпраўленню раней дапушчаныя прамашкі і недахопы. Вызначцеся з тымі кірункамі, якія дагэтуль заставаліся невыразнымі. Магчымы невялікі канфлікт з начальствам. Паспрабуйце захоўваць спакой, тады сітуацыя не зможа паўплываць на вашу далейшую кар'еру.

**РЫБЫ.** Поспех можа аказацца на вашым баку, але ён будзе пераменным. Варта рэалістычна паглядзець на некаторыя рэчы і прыняць не зусім прыемныя для вас, але патрэбныя, рашэнні. Некаторыя людзі з блізкага акружэння пакажуць свае сапраўдныя твары, што акажацца вельмі цікавым відовішчам. Акрамя таго, такая шчырасць дазволіць умацаваць адносіны з тымі людзьмі, якім вы сапраўды неабходныя і дарагія.

■ Беларуская народная песня

## ОЙ, ЗІМА, ЗІМА

*— Ой, зіма, зіма, ты марозная,*
*Нашто ж ты каня, эй, замарозіла?**

*Каня белага, сівагрывага,*
*Хлопца й молайца, эй, чарнабрывага.*

*А ў таго хлопца, кучары ўюцца,*
*За яго кудры, эй, дзяўчаты б'юцца.*

*— Вы ж не біцеся, не сварыцеся,*
*За мае кудры, эй, памірыцеся.*

*А мае кудры ўюцца не для вас,*
*Ёсць ў мяне дзяўчына — лепшая ад вас.*

*Яна мяне ў бой выправажала,*
*Яна мае кудры пазавівала.*

*** Другі радок кожнай страфы паўтараецца**



